Тысячагоддзе на злом крочыць.
Каб яго нам не сурочыць.

*Землякам*

**Георгій Валкавыцкі**

# Белая вязь

Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”
Беласток 1998

Рэдактар Яўген Мірановіч
Карэктура Віталь Луба
Вёрстка Аляксандр Вярбіцкі
Набор тэксту Міраслава Лукша

Publikacja sponsorowana przez Ministerstwo Kultury i Sztuki RP
Druk
Offset-Print, Białystok
Беласток 1998

© OCR: Камунікат.org, 2015
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2015
© PDF: Камунікат.org, 2015

## Цуд

„Ніва” напомніла: табе ўжо за семдзесят, канчай баяць пра гэпістаў, парпістаў і пра маё цудоўнае нараджэнне — пара складаць казку пра сваю Планіду.

А як мне вырвацца з „ніўскага” прыцягнення? Выпадкова запушчаны ў жыццёвую зону, вірую, як і ты, вакол той самай Сілы.

— Жыццё — самарух! — адбілася нейкае далёкае рэха. І раптам пачуўся Барысаў кліч:

— Прыязджай, Сярожка адкрыў Ноеў каўчэг!

Сяргей Тарасевіч неардынарная постаць сярод

белавежскага істэблішмента — доктар медыцыны і фанат іншавымярэнняў, адзін з герояў белавежскага цуду, што ў 1991 годзе скалануў насельнікаў Пушчы, паглыбленых у абсурдным свеце недаразвітага рынку, і напоўніў іх жыццё духоўнасцю.

Дык і пачнём з духу. Значыць, павінен з'явіцца агністабароды Пётр Байко, неразлучны сябар Сяргея і бадай ці не самы галоўны цудадзей. Аднойчы выйшаў ён з музея, у якім працуе, узняў факел-бараду ў неба, абняў біблейскімі вачыма дубы, што растуць на паркавым узгорку і ад здзіўлення ёкнуў: на гладкім зрэзе тоўстай галіны вяковага дуба — выява чалавечай галавы. Падышоў бліжэй — вобраз зацёрся, адступіў назад — зноў узнік. Адвячоркам пайшлі пад дуб з Сяргеем. Галава як жывая. Мужчына гадоў 30-35, густыя цёмныя валосы, на ілбе шрам, на вуснах кплівая ўсмешка.

Ноччу да Пятра ўрываецца Сяргей:

— Сенсацыя! Дуб даў энергію!

Аказалася, Сяргей праводзіў пад дубам акультны сеанс. Паддоследнымі былі экскурсанты. І ўсе адчулі энергетычны імпульс. У аднаго, найбольш уражлівага, выступілі нават на руках белыя плямы.

— Прыліў дзіўнай сілы ішоў ад ног да галавы! — узбуджана паведамляў сеансёр.

Сістэмазменны час прыносіў новыя азарэнні. Пятро прыкмеціў: усе дубапаклоннікі скардзіліся на ціск у скронях і няўстойлівую раўнавагу. У час чарговага свяшчэннадзейства пачуў:

— Ці тут не пахаваныя людзі?

Прыезджай пані здалося, што стаіць на могілках. І Вера Гвай з „Івы” ўзгадала далёкую сустрэчу. Перад вайною парадкавала з сяброўкамі парк. І падышоў да дзяўчат незнаёмец, і перадаў таемную вестку:

— У 1920 годзе пад гэтымі дубамі палякі расстралялі дваццаць чырвонаармейцаў і, сярод іх, камісара-жанчыну.

— То можа гэта ваны дабіваюцца свайго? — разважала спадарыня Вера. — Хочут хрысціянскага пахавання, або просят малітву? Пэўна ж, былі хрышчаны?

У кары дуба знайшліся і сляды па кулях. Людскія пахаванні пацвердзіў і мясцовы промнешукальнік. Выява на дубе ўсё больш хвалявала белавежцаў і прыцягвала ўвагу экскурсантаў. Раней госці пыталі пра дарогу да зуброў, а цяпер, калі дубам заняўся друк, перш за ўсё свае крокі кіравалі да дуба. Вобраз на зрэзе распальваў цікавасць людзей.

Кожны знаходзіў у ім новыя мазкі, але найбольш убачыў Пётр Дваракоўскі, тутэйшы псаломшчык і іканапісец. Ён звярнуў увагу на верхнюю частку выявы: нагадвала аблокі. Клубістая маса ператваралася ў літургічнае адзенне. Затым з'явіўся людскі тлум, а дакладней — мультум чалавечых галоў. Народ у паніцы, нечага баіцца.

— Гэта архангел Гаўрыіл, — зрабіў выснову псаломшчык. — А калі так, — рэзюмаваў, — то ці не хоча ён перадаць нам нейкую навіну?

Як правіла, архангел вяшчаў добрыя падзеі. Чаму ж тады тлум ахоплены жахам?

— Пабачыце, у Белавежы нешта здарыцца, — ставіў кропку над „і” псаломшчык.

І здарылася. У Віскулі (13 кіламетраў ад нашага дуба) з'ехалі скрытна белавежскія Каіны і ўгробілі вялікі, магутны і непарушны суседскі Эдэм. Ці пракляне іх гісторыя? Пакуль нараджаюць Ірадаў.

## Дарога ў Еўропу

А паломніцтва да Дуба не спынялася. Урэшце паркавае начальства загадала замаляваць выяву. Ці не з боязі, што цікавасць людзей пайшла ў шкодным напрамку? Замалёўвалі вобраз шэсць разоў, а святы Гаўрыла надалей гарэзнічае, прабіўся нават праз мнагаслойную гушчыню фарбы, усё з той жа кплівай усмешкай.

Пазалетась на Купалле прыехала залядская Мірка. Апоўначы, калі дырэктыўнае спадарства паехала ў Старую Белавеж шукаць папараць-кветку, Сяргей завёў Мірку пад Дуб, на начны сеанс.

Расказвае Сяргей:

— Падышлі, выцягнулі да Дуба рукі: па пальцах пабеглі казытлівыя мурашкі, і варожая суперзгушчаная матэрыя скавала рукі і ногі — ні ступіці, ні варухнуцца. Пякучы клубок з невядомых віткоў іншасвету выкаціўса з Дуба і, віруючы, вымотвае з мане ўсе

вантробы, і цягне да сябэ, хоча ўвапхнуці ў сярэдзіну Дуба. А ногі ўраслі ў зямлю, а галава рвэцца ў неба, гарацъ мазгі.

— Бывай, Мірка! — крычу ў адчаі, крычу душою, бо голасу ўжэ німа. І як з пояса абсалютнага вакууму даходзіт да мане Мірчын адказ:

— Малісаааа!..

Паслухаў. Варнуласа сіла. Напружыўса, рвануў назад. І адарваўса ад невымернай гравітацыі Дуба.

Пабялелая Мірка стаяла побач.

Расказвае Мірка:

— Пасля мурашоў, з'явіўся драпежны твар. У вачах крывважэрныя іскры. Навокал многа крыві. І на маіх вуснах кроў. А апантаны крывасмок з нечалавечай сілай цягне да сябе. Ён з іншых вымярэнняў! — здагадваюся. Што мне рабіць? Пачынаю маліцца. Але забыла ўсе малітвы. Паўтараю толькі два словы: „Божа, ратуй!"

З гэтай просьбай і вярнулася Мірка ў купальскую ноч.

Больш Сяргей ноччу не прыходзіў пад Дуб, а Мірка дык і наогул выкрасліла Белавеж з дзявочых вандровак.

Як бы там ні было, а Сяргей адкрыў магутны энергетычны комін. Пятро, які мае шырокія сувязі з аўтарамі „Патойбаковіі", прыцягнуў да апазнання паркавага ўзгорка вядомых промнезнаўцаў. Яны і высветлілі: наш дуб расце на „сляпой крыніцы" (скрыжаванне падводных плыняў, якое моцна праменіць) і ўпісваецца — ах ты, Сяргеева галава!

— у сістэму касмічнага праменявання. Мала таго, праз Дуб праходзіць пояс праменняў невядомага паходжання. Тут „патойбаковічы" падкінулі нам думку, што Белавеж ляжыць на торным шляху геамантычнага праменявання. А гэты шлях (хі-хі!) працінае ўсю Еўропу. Аж палегчала на душы. Быць нам у Еўропе! Падумаць толькі, якія рэзервуары духу ўзніклі на памянёным поясе: у Польшчы

— Гнезна, у гарах Гарц — легендарны культавы цэнтр Hexentanzplatz (танцавальная пляцоўка ведзьмаў), у Вестфаліі — Дрыгайтэ, славутае таямнічай капліцай гнастычнай секты катараў. А паколькі ўвесь паркавы ўзгорак аказаўся незвычайным геамантыкам, дык ці ж не напрошваецца выснова: старажытныя насельнікі Пушчы не маглі не прыкмеціць такой канцэнтрацыі загадкавай энергіі — значыць, быў тут святы гай. І ён павінен адрадзіцца.

Такую ролю ўсёй Пушчы вызначыў і гарачы яе паклоннік Мяфодзій Раманаў, аўтар Духоўных скарбаў Белавежскай пушчы (1925), які пісаў: „Духоўная энергія, як і фізічная, не гіне. На кожным месцы, асвячаным духоўнымі людскімі высілкамі, заўсёды застаецца след іх

сілы, якой, несумненна, на працягу доўгіх вякоў зараджана Пушча... Дух Пушчы жыве ў вяковых барах, у спрадвечных дубах ці ля цудадзейнай „Крыначкі”. Жыве і чакае, калі людзі паклічуць на дапамогу, дзеля духоўнага іх развіцця.

Назваў ён нашу пушчу „Вялікай і Цудоўнай Святыняй Прыроды” і ад імя Цара Духа заклікаў:

„Спячыя — прачніцеся!
Прачнуўшыеся — змагайцеся!
Пераможцы — падайце нам руку дапамогі!”

## Лясное брацтва

Відаць, пачулі мы Царадухаў кліч, бо заснавалі лясное брацтва і пачалі збіраць вітальныя галінкі пад ногі Духа Пушчы. Аб першых выніках братчыцкай дзейнасці я ўжо казаў. Зараз аб нашай сімволіцы, без якой не можа існаваць ніводная арганізацыя. Абралі мы белы колер. Зусім не таму, што ў нашых вушах адгукнулася рэха, адбітае ад белай сядзібы Піфагорава брацтва. І флюіды нашах прашчураў, што пакланяліся Белбогу, у гэтым выпадку маўчалі. Белы колер заўсёды азначаў Дабро і Праўду, быў сінонімам слоў Свяшчэнны, Некрануты, Вялікі. Ці не таму ён і ўпісаўся ў назву Пушчы?

Сяргей не аспрэчваў белай сімволікі, але, па натуры неспакойны, з мяцежнымі думкамі, шукаў рэчавых доказаў адваротнага боку медаля. Не бывае Дабра без Зла, яны заўсёды суседнічаюць — разважаў ён у доўгіх лясных вандроўках. Перш за ўсё, хадзіў уздоўж маўклівых берагоў напаўвысахлых рэчак, збіраў розныя дзівосы. Налез і на чортавыя сляды — так белавежцы называюць раскіданыя па лесе багністыя ўпадзіны, напоўненыя цёмнай, непрыветлівай вадой. Сяргей пайшоў гэтым следам: як добра было б прыдбаць у сваю калекцыю асмаленае чортава капыта — мроілася ў белабрысай галаве дзёрзкая ідэя. Ажыццёўленая, ценем лягла б на светлым узгорку нашага саюза. Але Сяргей дабрыў да Чортавага балота і не знайшоў нават касмыка чорнай поўсці. Затое, на краі ўрочышча, адкрыў загадкавыя валуны, раскіданыя наўкола, быццам нейкі волат забаўляўся імі. Што б гэта магло быць?

## Каменны круг

Наладзілі выязную сесію брацтва. Прышэльцы з Поўначы ўражвалі памерамі і ўсадкай. Акапаўшыся ў зямлі, займалі невялікі ўзгорак. Верхаводзіў найбольш адслоены, у цэнтры ўзгорка. Нагадваў

культавыя камяні старажытных людзей. Пачалі мы корпацца ў зямлі, шукалі нейкага ад іх пераказу. Пад верхнім слоем глебавага покрыва адкрылі брук. Як потым высветлілася, ён прыкрываў увесь узгорак. З глыбіні вякоў працягваліся да нас агрубелыя, вузлаватыя рукі, што варочалі гранітныя глыбы і высцілалі каменнем зацярушаную ў непраходным лесе пляцоўку.

Капанулі шырэй — і з зямлі выглянулі новыя, закаваныя ў камені, вартаўнікі-маўчуны. Укладваліся ў сістэму, абвалаквалі пляцоўку і працінаалі яе накрыж — з усходу на захад і з поўдня на поўнач. Астранамічная абсерваторыя? Часамерная станцыя?

Прыставілі компас. Усё дакладна па стрэлцы. Не было сумнення, загадкавы круг — твор рук чалавека. І варухнуўся ў галаве энцыклапедычны адбітак свяцілішча Перуна паблізу Ноўгарада, успомніўся і малюнак найстарэйшага (неаліт) культавага аб'екта ў Стоўнхэндж (Англія).

Разгледзеліся па наваколлі. Валуноў па-за грудком не знайшлі, але напароліся на вонкавую варту, што акружыла ўзгорак — дрэвавых мутантаў. Пакарабачаныя і раздзеленыя на тры-чатыры ствалы дрэвы наганялі жудасць. Мы зразумелі, што адкрылі новую геапатагенную зону. І, відаць, з моцным энергетычным комінам, калі так пачварна ўзбуйніў прыроду. Аднак на сабе дрэннага ўздзеяння псотніка не прыкмецілі. Наадварот, былі ва ўзнёслым настроі.

— Не ведаю, як вы, але я тут вэльмі добра чуюса, — прызнаўся Барыс. — Як ехалі сюды, балела галава, а тут як рукой зняло.

— А я ног пад сабою не чую, бы ў мане выраслі крылы! — захапляўся Сяргей.

Пятру „месца" ачысціла галаву. Значыць, каменны круг выконваў і лячэбную ролю. І назвалі мы ачышчальны грудок Кашпіроўшчынай: у гонар папулярнага экстрасэнса.

## Ноеў каўчэг

А тут новая падзея — Ноеў каўчэг?!

З вясновым ветрыкам пакінуў я беластоцкую зімоўку і даў ход на поўдзень, у Белавеж.

І вось трасёмся па каранях Сяргеевым „фіацікам" у запаветную прыстань. Барыс, адстаўны палкоўнік, па старой звычцы, праводзіць псіхалагічную падрыхтоўку:

— Дзівіцеся, як зганьбавалі Пушчу, — кіруе зрок на разварочаны сучаснай тэхнікай стары лес. — Свалата! — з горыччу лае лесапрадаўцоў і прарочыць: — Дабяруцца і да Каўчэга...

— Рыначная эканоміка! — робіць палітычныя высновы Сідар. — Цярэбім дарогу ў Еўропу!

Барыс сціснуў сківіцы і змоўк.

Сярожа за рулём, не ўключаецца ў гутарку, сочыць за трыбам, каб не ўстраміць шын у сукі. Толькі час ад часу адрывае ад руля рукі, распрамляе пальцы, казырыцца: глядзіце, які я спраўны, магу ехаць і без рук. Маўчуністы Пятро заглыбіўся ў сваё. Ім авалодалі панылыя думкі. Гадуе чатыры кошкі. Поўная хата кацянят. На whiskas аддае больш, чым на сябе. Стварыў сапраўдны кашэчы рай. І такая няўдзячнасць! Ноччу любімая Белка прынесла Пятру ў ложак пародзістую мыш. І палажыла, гадаўка, на падушку, пад сам нос.

— Дарма гневаешся на кошку, — суцяшаў Сідар кашэчага фермера. — Прынесла ж табе свой найлепшы прысмак: еш, гаспадарыку, ці ж можна не любіць мышаціны...

Але Пятра мучыла няўцешная крыўда, і ён гэтай сваёй “адчужанасцю” ствараў у машыне гнятлівы настрой.

Урэшце наш усюдыход спыніўся.

— Прыехалі! — упершыню за ўсю дарогу выгукнуў Сяргей. У ягоным залівістым голасе гучэла хлапечая радасць. — Пашлі!

І мы рушылі за ім, змахваючы з Валос кляшчы, што спрытна пікіравалі з кустоў на нашы непрыкрытыя галовы. Неўзабаве скончыўся гушчар і мы ўвайшлі ў пойму Леснай і Хвішчы. Першае, што прыйшло ў голаў, гэта даваенны хіт Polesia czar. Затым успомніўся Дзікі Нікар, недаступны ўсходні бок Белавежжа. Завітала ў думку і легенда, звязаная з загадкавым найменнем, якую ў 1978 годзе прывёз з саўгаса „Савецкі” Віктар Рудчык.

**Пераказ:**

Жыў у гэтым староннні селянін Нікар. Пакахаў ён вясковую красуню і яна згадзілася выйсці за яго. Але на замужжа патрэбны быў панскі дазвол. Пайшлі маладыя пакланіцца свайму пану. Той, як толькі ўбачыў каханую Нікара, вачэй ад яе адарваць не можа. Так яна яму спадабалася. Зачараваны пан доўга ўзіраўся ў дзяўчыну, у вар'яцкіх марах меў яе ўжо ў сваёй пасцелі. Урэшце загаварыў:

— Слухайце волю маю!

І зноў упёрся прагным позіркам у анямелую дзяўчыну.

— Ты такая прыгожая, такая стройная! — працягваў. — Шкада, каб твая краса ў хамскай хаце дымам і брудам пакрылася. Я злітуюся над табою, вазьму цябе ў служанкі... А ты, хаме, — ён звярнуўся да Нікара, — ты такі здаравенны, ты такі дужы, пойдзеш у салдаты.

Кінуліся маладыя да ног панскіх, боты пану цалуюць, просяць, галосяць, каб не губіў іх, каб дазволіў цешыцца ім мужыцкім шчасцем.

— Закаваць яго! — кіўнуў на Нікара раз'юшаны пан і дадаў: — Сто бізуноў яму!..

І тады Нікар азвярэў. Калі яго, закаванага, секлі арапнікам, ён выў, бы паранены дзікі звер. Не ад болю галасіў Нікар, а ад шалёнай злосці.

І з вуснаў у вусны, з вёскі ў вёску пайшла пагалоска пра беднага Нікара, пра яго гаротны лёс. І так да імя Нікара народ дадаў мянушку „Дзікі".

Прайшлі гады — і загарэўся панскі двор. Запалалі і іншыя маёнткі.

— Гэта лютуе Дзікі Нікар, — шапталі людзі. — Ён не толькі пускае з дымам панскія сялібы, але і адбірае ў паноў золата: хавае яго на недаступным балоце, недзе ля вытокаў Ясельды.

(Ніва, 10.12.1978)

Вялікае балота Дзікі Нікар прыгарнула і Шумарскага, даваенную разбойніцкую славу Белавежжа. Свой, тутэйшы, Аляксандр Байко, Шумарскі — клічка. У пачатку дваццатых гадоў забіў аленя. Выкрылася. Пачаў хавацца. Так і гойсаў сем год звярынымі сцежкамі, пакуль супольнік не выдаў паліцыі. Атрымаў пажыццёвы тэрмін, але ў 1939 годзе выйшаў з турмы. У 1941-м немцы вывезлі яго па-за Пушчу, у Бародзічы. Потым, калі ў Пушчы з'явіліся партызаны, усплыў з забыцця. Немцы, як ні стараліся, не маглі прачасаць нікарскага балота. Падводных дарог праз дрыгву не ведалі. Дык з'явіліся да Шумарскага.

— Вядзі! — загадалі і падштурхнулі: — Калі жыць хочаш...

Шумарскі хацеў жыць. Па знаёмых купінах павёў фаршутаў на недаступнае балота. На гэты раз Нікар захаваўся недружалюбна, выставіў на дрыгве заслон. Загінулі фаршуты і праваднік.

Вядома, Шумарскі не Сусанін, але, хто ведае, можа сваёй смерцю выратаваў іншых белавежцаў. Немцы цяпер нікога не расстралялі.

Нікар! Усяляк аблашчвалі цябе пасадныя князі, ганарыстыя каралі, самаўпэўненыя імператары і іншая знаць. Шанавалі цябе славаслоўнымі дарункамі вядомыя пісьменнікі і падарожнікі. Хадзілі да цябе на паклон паляўнічыя, ваяры і ўцекачы. А сканаў ты пад рогат беспардонных утаймавальнікаў прыроды.

У рамках непрадуманага загаспадарання Палесся пяць год ішло бяспрыкладнае наступленне на Дзікі Нікар. Нікарская аперацыя каштавала 13 мільёнаў рублёў. Многа, вельмі многа на той час.

Дакаралі старэчу, асушылі. На былой дрыгве ўзнік дзяржаўны маёнтак „Савецкі”. Знайшлі Наараў скарб. Ён, аказваецца, быў схаваны ў высакаякаснай глебе на тарфяной аснове. 330 цэнтнераў бульбы з кожнага гектара! 450 тон мяса ў год!

Пірава перамога. А лес скурчыўся, ледзь дыхае. А што сталася з рэчанькай Нараўкай, і так няпоўнай, з беражком няроўнай. Чарує ў песні. І то добра. Ды толькі памяць старажылаў вярэдзяць ліні, мянтузы, плоткі, смакавітыя вараныя ракі. Чым яшчэ адпомсціць нам за знявагу Нікар?

Я ніколі на Нікары не быў, але цяпер ведаю, дзе ягоны пасынак: жывы і чароўны — у сумежжы кварталаў 485 і 512, амаль пад Лазінамі.

За рэчкай, сярод топкага балота, і застраг Ноеў каўчэг — востраў, які сваімі абрысамі нагадвае патанаючае судна.

— На палубу! — камандуе Сяргей.

Па жэрдках прабіраемся на той бок. Кладка пад вадою, і яе трэба намацваць нагамі. Барыс з Пятром ужо галёкаюць з „палубы”, а я гайдаюся на слізкіх бярозавых бярвеннях пасярод цёмнай твані. Не магу зрабіць кроку, ні наперад, ні назад — страшна. Доўгі кій, які трымаю ў руках, амаль губляе дно. Што будзе, як звалюся? Праўда, Сяргей страхуе, але ці здужае выцягнуць з гадкай жыжы маю кубатуру?

— Смялей, смялей! (хі-хі), — таропіць страхаўшчык. Яму што, малады, спраўны. Добра і пахіхікаць з няўклюды, якому захацелася Ноевых скарбаў. Насміхаецца з мяне і Сідар, які нават не адважыўся ступіць на хісткую кладку і застаўся на сушы гадаваць кляшчоў.

І ўсё ж адолеў я страх і шчасліва дабрыў да вострава. Рушылі ўздоўж „палубы”. Здзіўляе раслінны мікрасвет. Навідавоку асноўныя пароды белавежскага лесу. Які Ной-збіральнік загаспадарыў іх? Цэлая лабараторыя прыроды. І жыць можна: бугор, вада не дастане. І зноў думка шыбуе на Нікар, у квартал 562, дзе, сярод балот, відаць, на такім жа востраве, шумеў запаведны ачаг вечназялёнай грабеньчатай піхты. У Нікарскім лясніцтве былі створаны і іншыя запаведнікі: сасновы, балотны, батанічны (для захавання ліннеі паўночнай — рэлікта ледавіковага перыяду). Усё гэта знікла па волі чалавечай драпежнасці.

Так, наш востраў — майстэрня прыроды, адзіны спосаб на пераўвасабленне Духа Нікара. А дзе той цудатворац?

Бачу, Барыс вычытаў у маіх вачах мала энтузіязму, звяртае ўвагу на кожнае напатканае дрэва: маўляў, захапляйся, як я, чаму змаркатнеў? А ў маіх думках не толькі лёс Ноевага каўчэга, але і шыпы

зваротнай дарогі. Не выбрацца мне з гэтага цуду. Ні за якія пернікі. Каб не баяўся сораму, сказаў бы, як гавораць уміраючыя героі:

— Хлопцы, вяртайцеся, а я застануся тут.

Ды гэтак дзеецца толькі ў ваенных раманах, мне не хапіла смеласці на апошні подзвіг, і я, у паўсне, у паўяве, адолеў злашчасную кладку, што злучыла востраў з мацерыком. І гэта быў сапраўдны цуд.

## Курганы

Летась Сяргей, ідучы берагам Лутоўні, „адкрыў" (для сябе) урочышча Шчэкатова, а ў ім старажытны некропаль: звыш сямідзесяці курганоў у адным месцы. Пачалі і мы з Барысам збіраць сваю курганную калекцыю. Турыстычныя даведнікі аднатоўваюць прысутнасць гэтых помнікаў даўніны мімаходам, нейк сарамліва, звяртаючы галоўную ўвагу на марэнны хрыбет уздоўж Гайнаўскай шашы. А па нашых разліках — уся Пушча ў курганах. Куды не сунешся — курган, а то і ў множным ліку. Выступаюць на ўзбочынах лясных узгоркаў і ва ўпадзінах. І цяжка разабрацца, чым кіраваліся далёкія лесуны, выбіраючы месца на вечны сон. Відаць, Пушча рыхтуе даследчыкам шмат нечаканасцей.

І мне, вершапісцу, падкінула сюрпрыз. Недзе ў шасцідзесятыя гады напісаў я верш „Ля вытокаў". Бушавалі ў ім яцвягі з полаўцамі, а за Лутоўняй узвышаўся самотны курган. Калі верш быў надрукаваны ў „Ніве", сябры спыталі:

— Адкуль у Белавежскай пушчы ўзяліся полаўцы?

І я, перадумаўшы, замяніў іх чорнымі русамі. Хацеў знішчыць і курган. Якога ліха тырчыць ён на расістых паплавах? Яму месца на вышыні. Бяда, такіх узгоркаў над Лутоўняй няма. Ліквідаваць і Лутоўню? Аднак курган я памілаваў, і ён, разам з чорнымі русамі, перакачаваў у зборнік. Цяпер Барыс цягне мяне за Цераміскі, у забалочаную пойму Лутоўні і кажа:

— Дзівіса, колькі тут курганоў!

А яны, шаломападобныя, як старажытныя воі, стаяць па ранжыру з захаду на ўсход (можа і наадварот). Утравелыя багатыры. Бачу, даў я маху. І з адзінокім курганом, і з чорнымі русамі. А полаўцы?

Быў у „Ніве" ўсюдыісны ваяр Максім Нурэцкі. Гнаны цягай датыкання гісторыі, аднойчы запёр ён аж пад Леніна, пад славуты, і ў той час праведны, мемарыял. Паспеў на важную рытуальную цырымонію, але прабрацца ў цэнтр падзеі не ўдалося. Хоць наш разведчык спасылаўся на кроўныя повязі, мемарыяльная стража аказалася на

вышыні: калі няма цябе ў нашым спіску, значыць, ты прыблуда і персона нон грата.

Прыпёрты да сценкі, Максім рэціраваўся. На дарогу пільныя стражнікі яшчэ агрэлі па спіне грэблівым словам:

— Что за птица?

— А, какой-то монгол...

І сапраўды, з твару ніўскі непаседа нагадваў залатаардынскага стэпавіка. Сам, унутрана сціплы падляшук, каларытна выказваўся аб сваіх не славянскіх вонкавых рысах. А мы суцяшалі аднагільдзейца, развівалі дзядзькаквасаву тыпалогію: усе мы — утоеныя яцвягі.

Гратэскавы эпізод з ваяжу сабрата, расказаны ім асабіста, спярша абрадаваў мяне (добра, што так сталася, бо Максім у кожнай акалічнасці любіў камандаваць парадам, мог і тут наперастаўляць па кутках саноўнае начальства), потым доўга не даваў спакою. Але мангалоідная стрэмка расплылася ў лянотнай дрымоце часу метамарфозаў. Максім ужо далёка, асвойвае патойбаковыя маршруты. І раптам загрукаў ён у мае дзверы з неспатыканай дагэтуль сілай.

Янка Саламевіч прыслаў вязку новых выданняў. Сяджу тады і чытаю. Ажно пачынаю сніць:

„У першай палове XIII ст. для аховы паўночных межаў Галіцка-Валынскага княства ад нападаў яцвягаў і літоўцаў у Брэсцкае Пабужжа была перaселена група полаўцаў. Іх пасяленні, размешчаныя ў вярхоўях рэк Пульва і Нурэц, на працягу некалькіх стагоддзяў былі цэнтрам Палавецкай воласці (Полаўцы, Вулька-Церахоўская, Хлевішча, Сухадол, Голя і інш.)”.

Не, не сон гэта, то дакладны абзац з калектыўнай кнігі Старонкі гісторыі Беларусі. Аўтар навуковай публікацыі Этнічны склад насельніцтва заходняга Палесся ў X-XIII ст. ст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў) А. В. Іоў спасылаецца на асобнае даследаванне М. И. Алексеюка Половецкие поселения на Брестчине // Этногенез белорусов.

Вынікае, памянёны цэнтр існаваў на нашай тэрыторыі. У азначанай паласе і родавае гняздоўе Максіма Нурэцкага. Вось вам і птушка! З якім багатым генафондам! Вернем тады гістарычную праўду:

**Ля вытокаў**

Зноў узмыленыя коні
Прыскакалі ў мае сны.
Палавецкія пагоні
І яцвяжыя кліны.

Міг-другі — і Белавежжа
Толькі свішча за спіной.
У якія рвешся межы
Летуценны коннік мой?
У курганы, што за Лутоўняй,
Дзе сівыя спяць вякі,
У дрымотнае сутонне,
На булатныя шляхі.
Гэта подых родных гоняў,
Страсці поўная рака!
Рэзвыя ўзмыліў коні
Тугі колкае накат.

## Сустрэча з князем

Курганы Белавежжа — маўклівая ананімнасць. Загнаныя ў змрок гісторыі, прыціснутыя стагоддзямі і стогадовымі дрэвамі, поўныя трывожнага чакання, узіраюцца ў нас.

Трагічным абломкам вякоў з'яўляецца прысадзісты курган у развілку дарог гайнаўскай і нараўскай, пад парадным уездам у зубрыны запаведнік. Тут мы і прыпыніліся, вяртаючыся з Ноевага каўчэга.

Праняло — вочы закрывай. Курган, які раней дыхаў гордай вечнасцю, стогне ад ганебнай знявагі. На ім яшчэ не астылі свежыя сляды секса-гарэлачнага ўбакавення.

— Кожнаму сваё, — выслоўем старажытных прабуе разрадзіць млосную атмасферу Сідар.

І раптам у зарасніках пачуўся няясны шолах. Кусты расступіліся і ў шызым праёме з'явіўся стары, аброслы белым мохам дзед. Міратворча хмыліўся:

— Прыйшлі на паклон?

— Выбачайце, а хто вы? — пытаю.

Прышэлец глянуў здзіўлена на мяне і, націскаючы на кожнае слова, сказаў:

— Я — князь белалескі, тутэйшы гаспадар.

— Дык што ж ваша міласць тут робіць!? — жахнуўся я. — І дзе ваш пасадцы двор?

Выцвілыя вочы зацягнуліся смуткам. Князь толькі моўчкі матлянуў белай барадою на курган.

„Успеша ничтоже...” — адгукнуліся вякі.

На іншыя мае „як” і „чаму” адбівалася ад бору тое ж рэха: „ничтоже..., ннчтоже...”

Урэшце князь ачуняў душой.

— Мабыць, новые пасаднікі? — заўсміхаўся.

— Не, мы вольныя птушкі, — адказваю.

— А коб цябэ! — узарваўся злосцю князь. — Рыцары новых павеваў?

— Барані нас, Божа, — узмаліўся я і, каб уціхамірыць старога, пачаў прадстаўляць таварышаў.

— Барыс Руско — наш гусляр і мройнік; ходзіць па касмічных гранях, любіць гул адвечнага прадоння.

— Прашу любіць і жалаваць, — кажа Барыс, кладучы руку на сэрца і нізка згінаючыся прад князем.

Лясны пасаднік, выразна задаволены з цырыманіялу, з асалодаю гладзіць кудлы нячэсанай барады, хоча рэкнуць нешта векапомнае, але, з прычыны прыступу амнезіі, спыняецца на дабрадушным мармытанні, з якога можна было зрабіць выснову, што дорыць Барысу тытул прыбочнага вешчуна і абавязвае славіць высокім словам княства.

А я працягваю:

— Ваша міласць, Сяргей Тарасевіч, тутэйшы чараўнік-экстрасэнс...

— Пазнаю, пазнаю, — спыняе маё дзвараванне князь. — Вэльмі ж ты ўжэ працівіўся маёй волі, яцвяг.

Прышаломлены Сяргей адкрывае ў амшэлым дзядулі рысы той учэпістай сілы, што ў купальскую ноч нейкім звышпрыцягненнем урошчвала яго і залядскую Мірку ў паркавы дуб. Наш доктар пабялеў, але паклаў руку на грудзі і дрыготкім голасам вымавіў знаёмую ўжо рытуальную фразу.

Зведаўшы смак улады, князь вярэдзіў слабую памяць, шукаў адпаведную кваліфікацыі яцвяга вакансію. Дарма Сяргей хваляваўся, гаспадар зла на яго не памятаў. Прыгадаўшы, што ходзіць ён уздоўж лясных рэчак, пляснуў сябе па ілбе:

— Гля, як мы хадзілі! Сынок, назначаю цябэ прыдворным скараходам. Будзеш адкрываў нашы сляды і вышукоўваці зёлкі ад старэчай немачы.

Князь увайшоў у сваю ролю.

— А гэты, з рыжай барадою, таксама яцвяг? — спытаў ён, тыцкаючы пальцам на Пятра.

— Свой, тутэйшы, як і ўсе мы, Пятрук Байко, — адступіў я ад афіцыёзу. — Толькі нораў у яго яцвяжы. Усё вынюхае і здабудзе, газетны гангстэр!

— Хвілінку, — перапыніў мяне князь. — Гэта не вон мане замузеіў?

— Тое замузеянне, як вы зрабілі ласку выказацца, было вынікам ідэйнай каламуці, якая агарнула нас, — спрабаваў я вывесці Пятра з-пад удару.

Пятро натапырыў вушы. А князя наведала светлая ідэя.

Будзеш у мане пісаці чалабітныя, — мовіў ён, і ўбачыўшы ў вачах Пятра перапалох, растлумачыў: — Суседы меч трымают голы, а засланіці гаспадарства німа каму. Міжусобіца запанавала валіся. То ты маіх князькоў яднай: паклонам, змовай, хрэсным цалаваннем. Усё рабі, коб адрадзілаcа наша сіла.

Урэшце князь упёрся доўгім позіркам у мяне.

— А ты сам — хто? — пытае.

— Аўтар, — сціпла адказваю.

— Шо ты кажаш, — заклапочана чухае патыліцу.

Князь быў у гуморы. Даручыў мне скласці кнігу пра Белую Вязь, а Сідара назначыў сваім блазнам.

Падняты на духу прыхільнасцю добразычліўца, схапіў я быка за рогі і навёў гаворку на Чортава балота. Па Князевым твары прайшоўся зіхатлівы прамень.

— Было там святое месца сонцавітаў, — як лязом паласнуў па нашых блытаных здагадках. — Жыватворнае прыстанішча! Жывэ ў ім касмічная сіла, валікая і добрая, бог усяго жывога. Значыт, вы натрапілі на след левабарэжнага племя.

Князь, убачыўшы ў нашых вачах узбуджанасць, ухвальна паківаў галавою і пашырыў тэму:

— Паклонны ўзгорак быў і на правым бэразе ракі, на Высокім стоку. Тут збіраліса паклоннікі Дуба — магутнага бога зямное моцы. Дубавіцкі храм я і старажую.

Сяргей з уражання аж прысеў. А князь дабіваў:

— Прабіраюса туды падземнымі рэчкамі. Часам упадабаю каго, як тую залядскую цыганку, то цягну за косы: будзь маёй князёўнай. Або ўчаплюса ў яцвяжы чуб: не сачы за мною!

Князь усміхнуўся сваім думкам і перанёс спагадлівы зрок на Пятра:

— А ты, барада, даром узвёў мане ў сан святога. Не паспеў я выглянуці з дубовага зрэза, як ты раструбіў на цэлы свет: „Святы Гаўрыіл з'явіўса!” А пры чым тут гэты ваш трубач нябесны? Ось узялі і запэцкалі, замузеілі...

Азадачаны бязрадаснай весткай, Пятро ўпёрся позіркам у курган і маўчаў. Князь, засвяціўшы белымі ўстаўнымі зубамі, паклаў Пятру на плячо валявую руку:

— Парадай спадарыні Ласкевіч і пану Сычэўскаму мой паклон, — рэкнуў. — Падзякуй ім за Купалле.

І, звятраючыся да ўсіх, працягваў:

— Малайцы, што не забываеце нас. Многа можаце ад нас навучыцца. Хоць бы веры. Раней вана больш памагала, бо мы яе ў сэрцы насілі. Цяпэр німа шчырасці, усё падман, крывадушна. Ходзіце ў свяцілішчы, коб паказацца, а паступкі вашы пярэчат навучанню жрацоў. А і ваны...

Князь запнуўся, махнуў рукою і гнуў сваё:

— Адышлі вы ад старых звычаяў і не знашлі лепшых. Ось і скачаце параз купальскі вагонь для забавы. А ў яго святая моц, вон ачышчае ад злых духаў.

У дымных вачах прамоўца забегалі палахлівыя іскаркі, а ў голасе пачуліся трывожныя ноткі.

— Толькі не пераймайце нашых язваў, — павучаў. — А то падзяліліса нявед за што, калоціт вас пыхлівая ліхаманка. „Сябры" парабіліса панамі, Дуні — Данкамі, Іваны — Янамі. Адкуль на вас нашло такое ачмурэнне? — распальваўся стары. Відаць, запяклі раны, аднесеныя ў патойбаковых бойках. Яго пачынала разбіраць злосць. Зачапіўшыся вокам за курган, ён здрыгануўся, твар зрабіўся зямлістым.

— А гэто шо, трызну па мне спраўлялі? — грэбліва кіўнуў на бутэлькі, бляшанкі, брудныя жаночыя майткі і прэзерватывы. — Гульні ў мой гонар?

— Не, княжа, — вінавата сказаў я. — Гэта ў гонар Фаласа. У нас шмат прыхільнікаў гэтага бога.

Высока паплылі белыя бровы гаспадара. Ён бліснуў злоснымі зрэнкамі, па-старэчы сагнуўся і, ахоплены гідлівасцю, растварыўся ў зарасніках.

Уражлівыя сябры адвярнуліся ад апаганенага кургана і ўтаропіліся ў мяне.

— Што з табою? — пыталі. — Табе дрэнна?

— Нічога, — адказаў я. — Проста закружылася ў галаве.

## Крыштапова

Белавежцы глядзяць на нас, як на звіхнутых.

— Вучоныя паехалі на „бадання" (хі-хі!), — падсмейваюцца, убачыўшы, як мы з Барысам круцім на роварах у лес. Тутэйшыя людзі

заражаны бацыламі абыякавасці да даўніны, да слядоў мінулага. Слухаць не хочуць пра нашы знаходкі. — Адколь вы знаеце, шо гэта курганы? Энергетычныя зоны? Выдумалі! — Нават на Купалле, традыцыю якога адраджае БГКТ, некаторыя крывяцца. — А нашо вано? А ні было тут ніколі такога свята.

З падобнымі адносінамі сустрэліся мы і варушачы памяць аб Крыштапове, амаль легендарным паселішчы на самым сонечным узгорку Белавежскай паляны. Загінула яно ад чорнай навалы, што на парозе XVIII ст. пустошыла наш край. Праўда, мёртвыя чапляюцца за жывых. І ў Белавежы бытуе дзіўная перадача:

Крыштаповец пайшоў у Галадоўскі выруб падправіць падмосткі вакол борцяў: там-сям мядзведзі пашкодзілі. Ідзе і напявае:

Ой, гула б, пчолка, гула б,
Па бору лётаючы,
Сасёнку шукаючы.
Ой, ляці, пчолка, ляці
Да мае сасёначкі.
У маёй сасёначкі
Медавок салодзенькі.

Зайшоў аж пад Гвозну, калі дагнаў яго незнаёмы чалавек на калёсах. Павітаўся, запытаў куды ідзе, запрасіў на воз. Разгаварыліся.

— Бачу, ты добры чалавек, — выведаўшы крыштапоўца ўхваліў незнаёмец. — То я табе адкрыю тайну. Калі вэрнешса дахаты, не пі вады з калодзежа. Я вазу ў машку заразу, крыху выпусціў яе і ў вас...

Крыштаповец атарапеў, саскочыў з падводы, схапіў кол.

— То ты такі! Хочаш, коб людзі ўміралі?! — узарваўся злосцю і пачаў дубасіць злыдня. Тут яму і канцы прыйшлі. Але перад сконам, развязаў мяшок і зараза распаўзлася па лесе.

І сталася! На крыштапоўаў напалі пархі. Галовы людзей пакрыліся струпамі. Залівалі іх расплаўленай смалою. Потым прыйшла чума. Пачала душыць крыштапоўцаў. Жывыя не паспявалі хаваць мёртвых. Клалі мерца на рагожу і вывозілі ў лес. Тыя, што выратаваліся ад смерці, спалілі сяло і перасяліліся ў іншае месца. Адны кажуць, над рэчку, што ў Шпаковічах, другія — ва ўрочышча Стачок, даючы пачатак і вёсцы з гэтай назвай.

Так мелася справа паводле дзевяностагадовай Надзеі Руско, маці Барыса, якая, яшчэ малою дзяўчынкай, пачула пераказ ад свайго дзеда Васіля Шпаковіча. У іншых пераказах сустракаем упамінанні аб царкоўцы, якая згарэла разам з сялом, і аб драўляным крыжы, які паставілі крыштапоўцы, пакідаючы наседжанае месца, і аб звоне, што забралі з сабою.

І крыж стаіць на Броўскай дарозе. І шмат хто ломіць голаў: навошта ён там, у шчырым полі, стаіць адзінокі? І трыстагадовы звон з Крыштапова праводзіць у апошнюю дарогу новабелавежцаў. Ён у могільнікавай капліцы, на месцы, дзе ў свой час стаяла новая святыня памілаваных чумою крыштапоўцаў.

А ці ж урочышча Крыштаповэ не чапляецца за нашы дні. Яно цяпер забудоўваецца, але яшчэ не так даўно выворвалі тут людзі гліняны посуд, кавалкі жорнавых камянёў. Здарылася, як у той песні, выаралі нават ярмо.

А людзі як людзі, адны прызнаюць ачумелых продкаў, іншыя адмахваюцца ад іх, як ад заразы. Ніякога Крыштапова тут ні было! Катэгарычна. З клічнікам сваёй праваты.

Бяда крыштапоўцаў не толькі ў чуме, але і ў тым, што не пакінулі па сабе нават пацёртых бортнічаннем фірмавых джынсаў, не трапілі ў ніякія спіскі. Відаць, колішнія пісарчукі неахвоча заглыбляліся ў Пушчу.

Вера Дронь, як і мы, крыштапоўская адраджэнка, завяла нас да крыніцы, з якой крыштапоўцы маглі чэрпаць ваду. Але ў застойнай гнілі чаканых знакаў мы не ўбачылі. Урэшце выйшлі на Уладзіміра Дацкевіча з Крыжоў. Чуў пра крыштапоўцаў у малалецтве, ад свайго дзеда. А той ад свайго. Ляжаць зачумленыя за Крыжамі, у супольнай яме. Перад вайной магіла была абгароджана, стаяў на ёй крыж. Хадзіў туды з дзедам. Завёў і нас. Па агароджы і крыжы ніякага следу. Але бугор выразны. Трэба вярнуць памяць. Тым больш, што магіла пры турыстычным шляху.

Пайшлі да войта. Згаджаецца паставіць крыж, абгародзіць магілу, зробіць адпаведную мемарыяльную дошку. І тут пачынаем гаварыць на розных мовах.

— Але дакажыце, што там ляжаць людзі, — наступае войт. — Дайце мне аўтарытэтны доказ. Найлепш, каб пасведчыў факт Манкевіч (беластоцкі пракурор, аўтар брашуры аб гітлераўскіх злачынствах у Белавежы). Абяцае асабіста звязацца з ім.

Пасуем. Якая розніца: карычневая ці чорная чума — у смерці многа колераў.

— А мо войт мае рацыю? — злараднічае Сідар. — Той чужак, што выпусціў з мяшка заразу, відаць, абярнуўся ў Гітлера.

Усё магло быць. Ішла ж зацяжная Паўночная вайна (1700-1721). Чорнымі крыламі лягла яна і на Пушчу. Пустошылі яе не толькі шведы, але і саюзнікі, і свае. Асабліва харугва j. w. imć pana wojewody brzeskiego. Хронікі перадаюць біблейскія сцэны. І як бы гвалту, здзеку і крыві было мала, прыйшла і чума. Ніводная з войнаў так цяжка не

дасведчыла насельнікаў Пушчы, як гэтая вайна, забытая, зацярушаная ў поступе часу. Яна, па спусташальнасці, можа раўняцца толькі з Гітлеравым нашэсцем. А яшчэ ж не высахлі крывавыя сляды другой паловы XVII стагоддзя.

## Пушча

Такім чынам Сідар увёў нас у лабірынт гістарычных падзей. Як ужо сведчыў князь Белалескі, прабелавежцы рухаліся ўздоўж лясных рэчак. Утапталі белы лес і, як шашалі дрэва, тачылі некранутыя нетры. Белавежжа займае выключнае месца — ляжыць на ўзвышшы, якое стварае водараздзел Нёмана, Буга і Прыпяці. Такая пазіцыя вызначае Пушчы жыццёвую ролю ў брыдкай гульні чалавека з прыродай. Гэты гегемон аблажыў нашу пушчу з усіх бакоў, аднак галоўны наступ ішоў з поўдня. Новыя прыхадны паглынуўшы Камянецкую пушчу, спыніліся на рацэ Белай. На захадзе надзейным валам аказалася зялёная сцяна, што трывае да сёння. Потым яна і размежавала Літву ад Кароны. На поўначы бараніла Белавеж Свіслацкая пушча, а на ўсходзе — Дзікі Нікар.

Які хрысціцель даў імя Белавежы, хронікі маўчаць. А вакол імя — рознагалоссе. То сярод нетраў вырастае нейкі замак з белай вежай, то рака Белая зліваецца са словам „весь”, то ў светлым адзенні з'яўляецца добры Белбог, то над лясным морам узвышаецца белая вежа. Спынімся ля яе падножжа. Іпацьеўскі летапіс паведамляе, што месца для закладкі новага рускага фарпоста выбіраў вопытны дойлід Алеська. У лясістым краі не мог выбраць лепшага. Тут зліваліся рэкі — Белая і Лесна. Абедзве праціналі Пушчу. Дык ці не ад зліцця „Белай” і „Лесны” ўзнікла імя „Белалеская”. Ад рэк створана многа найменняў. „Вежу” дабудавалі новыя гаспадары. Убачыўшы белую вышку, маглі і не разабрацца ў складанасці словазлучэння, пачутага ад тубыльцаў. „Вежа” ўносіла яснасць у „рускую” блытаніну.

## Рэпетыцыя і тэатр

Новыя гаспадары ўстанавілі Пушчы запаведны статус. А назву аднатавалі хронікі пасля слыннага палявання Ягайлы (1409 год). Раней у Бярэсці адбыўся з'езд, на якім перасвараныя браты Ягайла і Вітаўт пакляліся бараніць адзін другога. Там і нарадзіўся план супроцьтэўтонскага паходу. Ажыццяўляючы яго, збочылі ў Пушчу. Паляванне было важнай рэпетыцыяй перад генеральнай бітвай. Рыцар вока на вока сустракаўся са зверам, вучыўся ў грозных абста-

вінах валодаць дзідай і мечам, прывыкаў да нявыгад палявога жыцця. Апрача прымнажэння ваенных навыкаў, здабываліся і запасы харчавання. Длугаш і Бельскі пішуць, што 8 дзён ішло бяспрыкладнае пабоішча. Іншыя храністы ўсю разніцкую славу аддаюць каралю, зазначыўшы, што вялікі князь, пасля хрэснага цалавання, панёсся ў свае Трокі. А Ягайлу прыкавалі да Пушчы на ўсю зіму. Як бы там ні было, але ён мясанарыхтоўку выканаў датэрмінова. Забіўшы вялікую масу звяроў (вырэзваў пагалоўна, што траплялася пад рукі), засаліў мяса, утрамбаваў у бочкі і вясною сплавіў у Плоцк, у паходную базу.

Значыць, у грунвальдскай перамозе белавежская ахвяра сыграла стымулюючую ролю: добра накормлены ваяр працэнтаваў у бітве. А Ягайла так спадабаў Пушчу, што не ўпускаў нагоды, каб пашнырыць з дзідай па яе нетрах. Пакарыстаўся нават морам 1426 года. Калі страшная зараза пустошыла край, заядлы паляўнічы, захапіўшы з сабою жонку, ганяўся ў Пушчы за буйным зверам.

Тут каралеўскі храніст зрабіў грубую памылку: у цяжкую хвіліну кароль павінен стаяць на каленях, як пад Грунвальдам. А то — народ гіне, а ўладар забаўляецца. Відаць, за гэта Дух Пушчы і пакараў напаўпаганскага ліцвіна: у азартных гульках венцаносец зламаў нагу.

Ад Ягайлы і стала Пушча лічыцца каралеўскім паляўнічым угоддзем. Кожны з ягоных пераемнікаў па-свойму клапаціўся аб Белавежжа, ды толькі паляванні страцілі сур'ёзны характар, ператварыліся ў камедыйны прыдворны тэатр, у якім галоўныя ролі ігралі венцаносныя асобы. Толькі часам, не па сцэнарыю, уцешная забава абарочвалася ў драму, як гэта здарылася з Ягайлавым унукам Аляксандрам, каралём Кароны Польскай і яго жонкай каралевай Еленай, дачкой маскоўскага князя Івана III.

Сведчыць Мікола Гусоўскі, тагачасны беларускі паэт-лацініст:

Ярасць зуброў і ў шаленстве не роўная; часта
Вострага зроку і ранены нават не траціць,
Мабыць, у памяці многім нядаўні выпадак —
Зноў-такі ў нашых лясах — з каралём Аляксандрам.
Тое няшчасце, калі б не Ўсявышняга літасць,
Ў горкіх слязах утапіла б усё каралеўства.
Двор выязджаў на аблаву, і ў пушчы зараней
Рубшчыкі ўсё як належыць зрабілі: на палях —
Тоўстых апорах — памост збудавалі ў тры сажні.
Лесвіца збоку, чатыры падпоры, як трэба.
Так што пакорліва просім вас, ваша вялікасць,
Там і сядайце, глядзіце, як пойдзе аблава.
Першаю села ў кампаніі фрэйлін і знаці

Ў строях сваіх аксамітных сама каралева.
Побач з памостам, на доле, на сейміку шумным
Панства сышлося, а воддаль, як быццам на шпацыр
Моладзь сабралася. Пеўнікі тыя згаралі
Ад нецярплівасці спрыт праявіць і геройства
Тут на вачах у паненак, у бойцы са зверам.
Блазан-амур, неразумны бажок заляцання,
Віўся на крыльцах між дрэваў і з лука раз-пораз
Пырскаў стралой у дзявочыя сэрцы. Паслухай
Ты, матылёк бесклапотны: сваволь, забаўляйся
Дзе сабе хочаш, ды толькі не тут, дураслівец!
Пушча — не сад і альтанка. У ёй закаханы
Мілы юнак, што не ведае нораваў звера,
Толькі з жадання каханай прыйсціся пад нораў
Зробіць свой рыцарскі выбрык — і тут жа загіне,
Усё праз цябе ці праз тую абранніцу сэрца!
Чутна — звяры тупацяць. Прамільгнулі сабакі:
Гоняць зуброў. Анямела, прыўзняўшыся з месца,
Світа вяльможная. Ахнулі там, на памосце.
Сонечны дзень быў. Пярэстасць багатых убораў
Аж зіхацела ў праменні, барвовыя сукні
З вышыўкай срэбрам і золатам проста сляпілі.
Выскачыў першы важак. Натапырыўся. Раптам
Аж скалануўся, убачыўшы яркую чырвань.
Голаў панурыў, працяў спадылба ўзвышэнне —
Войкнуў памост і закрыўся рукамі ад жаху.
Я не сказаў бы, што сцэнай такой любавацца
Нам, хто не ўладны над злосцю жывёльнай, прыемна.
Крык заганятых усё набліжаўся, і гэта
Звера прымусіла бегчы, бо побач дубровай
Наўскач ляцелі чароды зубрыц і аблеткаў
Проста на лоўчых, але па такіх не стралялі.
З рыкам, нібы ашалелы, узбег на паляну
Зубр велізарны, скрываўлены. З раны на шыі
Пырскала кроў — у загрыўку трымаліся коп'і.
Ён іх страсаў і, закінуўшы голаў, угледзеў
Баль-маскарад на памосце. Суняўся і чмыхнуў,
Злосна ўтаропіўся, быццам ён там выпадкова
Убачыў знаёмыя твары і сіліўся ўспомніць,
Дзе сустракаў іх. Дзень добры, вяльможнае панства!
Смерцю маёй любавацца сышліся? Чакайце ж,

Я пакажу вам забойства — вякі не забудуць!
З храпам набраўшы паветра, разявіўшы пашчу,
Рыкам усіх аглушыў, скалануў наваколле.
(Рык важака для зубрынага статка — трывога.)
Значыць, сваіх папярэдзіў, цяпер — за расправу.
З месца сарваўся падскокам. З разгону рагамі
Грымнуў у палю памоста — і збіў з падваліны.
Зверху прарэзлівы лямант. Памост пахіснуўся,
Трэснуў і цудам не ўпаў без чацвёртай апоры.
Бог барані, калі б ён і другі раз ударыў.
Збіў бы памост, і якою б умыўся крывёю
Дол той пушчанскі і рогі крутыя забойцы —
Сэрца заходзіцца, дрыжыкі б'юць уяўленне.
Што гаварыць, замясіў бы пірог каралеўству
З княства й Кароны сваёю мясістаю мордай.

*(Песня пра зубра. Пер. Язэп Семяжон.)*

Аднак драма не перарасла ў трагедыю. Для венцаносных герояў, вядома. Бо зубр, пад міласэрным ударам малаецкай шаблі, тыцнуўся ў снег і развітаўся з шумнай дубровай: „Даруй, мая родная, усё мне”.

Так, у вотчыне роднай, і будуць кланяцца пад пагібельнымі ўдарамі лясныя волаты. Адсюль маскараднае аблічча гаспадаравага палявання пераходзіла ад караля да караля. Эстафету перанялі і рускія цары.

## Па старым запавеце

Хоць Ягайлавічы і вырадзіліся як паляўнічыя, аднак дбалі пра Пушчу. Дзеля аховы, пасялілі ў ёй стражу (277 сем'яў). Першы закон аб ахове лясоў і палявання выдаў Зыгмунт I Стары (27.02.1538); ён жа і назначыў камісію для размежавання каronнай маёмасці ад прыватнай, а таксама для разгляду правоў на ўезды ў пушчы. З-за гэтых „уездаў” вакол Белавежжа ўспыхнулі зацяжныя сваркі. Права карыстацца лесам і сенажацямі ў гаспадаравых угоддзях атрымалі ад караля паны розных калібраў. Межы ўстанаўліваліся прыблізна. Той-сёй прысабечыў чужую ўласнасць. Землеўладальнікі чэрпалі з Пушчы немалыя даходы. Было за што змагацца.

Першы артыкул ляснога статута тычыўся ўстанаўлення пасады ляснічых і іх абавязкаў. Другі артыкул забараняў рубку ў казённых лясах без дазволу караля. Загадвалася знішчаць лішнія дарогі і трапінкі. За борці трэба было цяпер плаціць. Рыбная лоўля таксама абмяжоўвалася. Сяляне вымушаны былі хадзіць у Пушчу на пакосы і

рыбную лоўлю толькі грамадою, папярэджваючы ляснічага, без зброі і сабак. Забойства буйнога звера каралася смерцю. Усе паляўнічыя ўгоддзі, пачынаючы ад Белавежжа да Коўна, разбіваліся на ўчасткі з вызначэннем колькасці звяроў, якія знаходзіліся ў кожным участку, як і ліку патрэбных у час палявання людзей. За працу ляснічым нарэзваўся абшырны зямельны ўчастак з правам на двух трэціх сяліць сялян. Ляснічы таксама быў і суддзёю.

Засяленне Пушчы аказалася няўдачным. Новыя пасяленцы былі першымі знішчальнікамі той дзічыны, якую мелі ахоўваць. Сем'і іх павялічваліся, пад стралецкія пасёлкі даводзілася карчаваць лес, а ў канцы XVII ст. заснаваліся ўжо цэлыя вёскі пераемных браканьераў.

Быццё вызначае свядомасць. Лесуны ўсім самі сябе забяспечвалі. Пушчу лічылі багатай і невычэрпнай крыніцай. І жылі, як прыкмеціў Мікола Гусоўскі, па старым запавеце: „Не ўкрадзеш у пушчы — Грэх не адпушчан”. Паэт кажа, што нават ганарыліся гэтым. Мо і сапраўды так было, але, пэўна, людзі не лічылі сябе зладзеямі. Проста — бралі ў сябе, сваё.

## Родавае гняздо

І замігаталі неадчэпныя зрэнкі братоў Валкавіцкіх. Гэта я, з-за адной літаркі, задворкавым рашэннем, пазбавіў (у „Вірах”) гэтаму прозвішчу правоў на тутэйшую заседжанасць. Пазбавіўся сваіх каранёў? Нядаўна, грабучыся ў сямейным архіве, знайшоў шлюбную метрыку (1876) дзеда, у якой чорным па белым напісана: Волковицкий. Значыць, род усімі каранямі ўрос у Пушчу. І таму не даюць спакою зрэнкі насельнікаў сярэднявечных з маёнтка Валковічы. Калі стаю над ціхай Лясніцай — бачу іхнія запруды. І калі хаджу па надрэчным лузе — бачу іхнія статкі. І калі сустрэну ў лесе камяні — бачу падмуроўкі дзіўных драўляных збудаванняў, не сённяшніх, а блізкіх. Тыя далёкія аднафамільцы мелі ў Пушчы найбольшыя „ўезды”, але ўвайшлі ў гісторыю не з-за свайго багацця, а з захаваўшайся перапіскі з каралём.

Выпраўляю памылку свайго невуцтва сведчаннем уважлівага даследчыка Ottona Hedemanna, аўтара Dziejów Puszczy Białowieskiej (1939). Выпіс цікавы і з увагі на этыкет, адносіны: гара — ніз.

Z Rewizji Wołowicza wiemy, że czterej bracia Wołkowiccy mieli z maj. Wołkowicz (k. Wysokiego Litewskiego) olbrzymi, bo „wzdłuż i wpoprzek 3 mile” liczący wchód do barci i sianożęci w puszczy Białowieskiej... Otóż za Batorego Puszcza była w dzierżeniu kniazia Konstantego Ostrogskiego, który zagarnął też i wchody Wołkowickich. Na skargę z r. 1583

poszkodowanych Batory zapewnił ich, że po powrocie Puszczy od Ostrogskiego do „rąk naszych hospodarskich”, przywrócone zostaną ich prawa do wchodów, „a jeśli zechcecie mieć” pisze „odmianę słuszną, to wam odmówione nie będzie”. We wrześniu roku następnego pisze Batory w tej sprawie z samej Białowieży i znowu upewnia Wołkowickich, że prawa ich w niczym uszczuplone nie będą, — „a gdybyście na innem miejscu za te wchody odmiany słusznej zażądali, my tego nie będziemy wam bronili”.

Z dalszej dość obfitej korespondencji widać, że sprawa się nieco przeciągnęła. W r. 1586 Batory pisząc do leśniczego o pretensji Wołkowickich, tak formułuje swe stanowisko: „co i my radzibyśmy widzieli, aby Puszcza nasza uspokojona była i aby nikt wstępów swych w Puszczy naszej nie miał, jednak nie wiedząc, gdziebyśmy im odmianę mieli dać, chcemy i rozkazujemy, aby wierność twa w Leś nictwie swym Białowieskim gdzie na ustroniu opodali puszczy naszej gruntu pustego im zręcznego, z jednego włok trzy ustąpił i im zawiódł, ... co my tym ziemianom naszym, gdy się oni też wchodów swych w puszczy naszej wyrzeką(!) listem naszym potwierdzimy”. Lecz transakcja wciąż nie mogła jakoś dojść do skutku. W r. 1591 już Zygmunt III odbiera od Wołkowickich skargę na leśniczego białowieskiego o czynione im w używaniu wchodów wstręty, wystosowuje więc do dwóch komisarzy i leśniczego listy, w których poleca zbadać te wchody, ustalić jakie mianowicie mieli z nich Wołkowiccy pożytki i dać im gdzieś dalej od Puszczy słuszną odmianę — bez krzywdy wszakże dla Puszczy. Okazało się przy tym z korespondencji, że Wołkowiccy uważają udzielenie im 3 włok „na syrom koreniu” za krzywdzące i nie równoważące ich korzyści z wchodów.

Parę miesięcy później znów w tej sprawie pisze podskarbi Wielkiego Księstwa Litewskiego do podskarbiego nadwornego, lecz ostatecznie żadnego rozwiązania w aktach nie znajdujemy. Natomiast prawie pół wieku później w Ordynacji naszej Puszczy Wołkowiccy figurująjako posiadacze wchodów koło Narewki. Widocznie więc transakcja dobrowolnej odmiany do skutku nie doszła.

Цікавінка. У той час ляснічыя, як і каралі, універсітэтаў не канчалі, часта былі непісьменнымі, як і ляснічы Махвіц, з якім тузаліся Валкавіцкія. Жыў у Ямне, пад Каменцам, чын высокі — адзіны на абедзве пушчы: Камянецкую і Белавежскую. Прыкладаў пячаць на важныя паперы ўсляпую. Потым тлумачыўся, што ён нэ чытаты нэ лысаты: „нэ вэдал, до чэго пэчат прыложыл”.

І прыкладаў „пэчат” пажыццёва, і нашчадку чын перадаў. Відаць, сын і вытурыў Валкавіцкіх з Пушчы.

Упартымі былі і Валкавіцкія, не хацелі добраахвотна траціць на „абмене”. Спадзяваліся на справядлівасць каралеўскую. Ды ласка

уладара наравістая. Спадарожнічае толькі да вызначанага парога. За ім стаіць глухая сцяна. А тут стаяў яшчэ і закон — Устава на валокі господара короля его милости у-во всем Великом Княстве Литовском. Лета Божьего Нарождения 1557, месяца апреля первого дня, першая ў Вялікім Княстве зямельная рэформа, мэтай якой было павышэнне рэнтабельнасці каралеўскай маёмасці. Сагнула яна не толькі Валкавіцкіх, але і такіх „уездзічаў", як князь Капуста і Радзівіл.

У выніку, відаць, пад Нараўкай узнікла новае родавае гняздо валковіцкіх братоў. У Забалотчыне, вёсцы пад самым мястэчкам, многа Валкавыцкіх. Праўдападобна, з гэтага родавага дрэва і белавежскія адгалінаванні. Не ведаю, ці застаўся род у Валковічах. На месцы колішняга маёнтка вырасла вялікая вёска. Яна пры шашы Полаўцы — Высокае. Будзеце ехаць, спытайце пра аднакарэннікаў аўтара і напішыце мне.

## Вяшчун

Прыехаў Барыс, кажа: у Пятра з'явіўся таямнічы геамант. Цікавіцца нашымі знаходкамі. Адмысловымі шукальнікамі даследаваў паркавы ўзгорак. Пад Дубам выявіў 8 чалавечых захаванняў. Асобна — чалавека з канём, які загінуў ад мядзведзя (X ст.). Сёння з незнаёмцам сустрэліся і мы. Гутарылі ў фае музея. Успомнілі косці нейкага волата, знойдзеныя ў час закладкі фундамента пад вежу царскага палаца. Незнаёмец выняў з футляра прыбор, наставіў.

— Гэты косці не з нашай эры, — кажа. — Пачаў лічыць. — 41 метраў адсюль, — і паказаў напрамак. Адлегласць і напрамак да неіснуючай ужо пабудовы дакладны.

Цікавы дзядзька. Яшчэ і вяшчун.

— Праз 23 гады будзе адбудаваны царскі палац, — запэўніў нас (11.09.1994).

Дамовіліся з'ездзіць у лес.

На другі дзень праверылі бела-вежавую версію паходжання найменне Пушчы. Ва ўрочышчы Старая Белавежа, дзе паводле легенды стаялі два замкі з белымі вежамі (Ягайлы і Зыгмунта I), промнепраходчыкі нашага эксперта шматзначна маўчалі. Дык можа на „Замчышчы" прамовяць? Белазамкавая загадка Баторыя не менш цікавая. На жаль, і тут спасцігла нас поўнае расчараванне. На прыкметным яшчэ абвалаванні, мудрагелістыя шукальнікі толькі выцадзілі праз зубы:

— Жыў тут бортнік.

Але мы не здаваліся, панесліся ў Шчэкатова. Барыс правадніком. Вёў нас кружным шляхам. То ішлі вузкакалейкай, то ўздоўж Лутоўні.

То на захад, то на ўсход. Каб збрыдзіць вандраванне? Урэшце трапілі на зямельны ўтравелы круг. Наш госць нават не вымаў сваіх чарадзейных штуковін. Было ясна — старая паташня, трывалы след рупнай дзейнасці Пятра Фальчэўскага. Клапоцячыся аб эканамічным развіцці краіны, гэты дзяржаўнік уводзіў „прагрэс” дзе толькі мог. Амаль адначасова з Валовічавым парадкаваннем, знявечыў Пушчу руднямі, паташнямі, смалакурнямі. Урочышча Шчэкатова было адным з участкаў, на якім ішло знішчальнае змаганне з Пушчай. Сцягнутыя з Маравіі, Мазовіі і Жэмайціі майстры сяліліся паблізу працы ў наспех збітых будах. Адсюль суседнія Буды і буднікі. Цераміскі і Пагарэльцы ў нас таксама называюць Будамі.

Ідзем далей левым берагам Лутоўні. Натыкаемся на адзінокі стаўбаваты камень метровай вышыні. Прыборы ажывіліся. Вычаравалі застылыя адбіткі звярынай крыві. Ахвярнік? І вось — рукой падаць — курганны кут. Высокія, вялікія насыпы размясціліся паўкругам. Як многа іх тут! Сярод урачыстых соснаў і апануранных ялін, стаім і мы з дваістым пачуццём — захаплення і смутку. Пасяродку растрыбушаны насып. Якая гнюсная пачвара пакінула тут сваю візітную картку? Прыборы злачынца не выявілі, але і не маўчалі. Ды больш падладкоўваліся пад нашы спадзяванні, вялікіх адкрыццяў не зрабілі.

**З дзённіка**

Як мала трэба, каб шчаслівым быць. З раніцы падае дождж, не вылажу з хаты. Ужо і паабедаў, не высунуўшы за парог носа. І я шчаслівы: не трэба ехаць у краму, гнацца на Станок па ваду, ісці ў гародчык па моркву, абіраць у топцы бульбу на абед — усё гэта зрабіў учора. Спакойна чытаю Legendy i pradzieje Kraju Środka Т. Жбікоўскага. Здзіўляе колькасць адкрыццяў. Спрыяў факт, што ў вераваннях кітайцаў зямля лічылася непарушнай святасцю. Нельга было зямлю раніць, капаючы ў ёй ямы і равы, перакідаючы з месца на месца. Дзякуючы гэтаму, большасць скрытых у зямлі скарбаў старажытнасці захавалася да нашых дзён.

## Як Тур забіў Ваўка

А зіхатлівыя вочы продкаў усё блукаюць па лабірынце майго ўяўлення. То аддаляюцца, то мкнуць насустрач. Праняў і патрабавальны позірк Радзівілавага адваката з судовай сцэнкі „Як Тур забіў Ваўка”, якую, у рамках мацавання польска-беларускіх сувязей, надрукаваў старарэжымны „Кур'ер падляскі”. Быў гэта пераказ разбору крымінальнай справы ў берасцейскім земскім судзе ў 1642 годзе. Разглядалася

скарга яснаасвечанага Януша Радзівіла, падкаморага Вялікага княства Літоўскага і камянецкага старасты на шляхціча Стэфана Тура, які, зрабіўшы засаду на дарозе, напаў і забіў Васіля Ваўка, гайдука скарбовага, жыхара вёскі Шалічы. Дык упаўнаважаным яго яснаасвечанасці, якая, вядома, не з'явілася на разбор, быў мой падвойны цёзка. Мабыць, нашчадак аднаго з тых валковіцкіх братоў.

„Кроў нявінна справядлівасці святой патрабуе і помсты Божай жадае!" — красамоўнічаў ён у адказ на выступленне калегі з процілеглага боку, які патрабаваў адхілення скаргі. Суд прызнаў віну Тура і пакараў 200 грыўнамі, чым і так разгневаў злачынца, і ён абскардзіў судовы вырак у вышэйшую інстанцыю, у Літоўскі трыбунал.

Танная была мужыцкая кроў. Бо такую цану ёй вызначыў і сам прыхільнік „святой справядлівасці".

## Вязучы цёзка

Яшчэ адзін дубальтовы цёзка варты ўвагі. Выглянуў ён з „Цусімы", шырокавядомай гістарычнай эпапеі Новікава-Прыбоя. Пад канец марской бітвы, калі рускаму флоту пагражае бясслаўны палон, групка патрыятычна настроеных маладых афіцэраў выбірае ганаровае рашэнне — ісці разам з караблём на дно. Сярод змоўнікаў быў і мічман Георгій Валкавіцкі.

Лёс аднак вызначыў яму доўгае жыццё. Судна не патапілі. Цёзка адбыў палон. У 1906 годзе вярнуўся ў Расію. Закончыў дзве марскія школы — артылерыйскую і інжынерную. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне. З 1918 года ў Польскай Арміі. Камандуе Пінскай флатыліяй, узначальвае штаб Літоўска-беларускай дывізіі, з'яўляецца генералам па спецыяльных заданнях ваеннага міністэрства. У верасьнёўскай кампаніі камандзір этапаў Арміі „Прусы", камендант Холма, камандзір пяхотнай дывізіі групы „Палессе". І Казельск. Польская армія ў Савецкім Саюзе, Блізкі Усход, Лондан. Тут і памёр (1983). Пражыў 100 год.

У даўгавечны генерала выключную ролю сыграў Цусімскі эпізод. Казельскі апякун, паклоннік Новікава-Прыбоя, высветліўшы, што недабіты польскі пан і малады цусімавец адно і тое ж — стварыў „герою" лагерны камфорт, які дазволіў цёзку, без асаблівых стрэсаў, дачакацца зорнай пары Андэрса.

Ці спалучала яго генеалагічная вязь з Валковічамі, не ведаю. Я ўжо раз абясславіў старога ваяра, даказваючы, што не „пахне" Пушчай. А мо ён працах ёю ад каранёў? Спынюся тады на верагодным.

## Нашчадак Княства

Гэтае імкненне — кожны факт пацвердзіць — расце ў маёй літаратурнай практыцы з поступам гадоў. Таму і пішацца цяжка. І рвецца белая вязь. Я зноў у тупіку лабірынта.

Раптам замігалі зялёныя агеньчыкі. Адначасова „Ніва” і нью-йоркскі „Беларус” друкуюць узрушальную вестку. Беларускае генеалагічнае таварыства прапануе практычна ўсім нашчадкам Вялікага княства Літоўскага генеалагічнае карэнне. А я і нашчадак Княства і мне гэты фокус да зарэзу патрэбны. Асабліва ўражвала слова „практычна”. Я нават захапіўся. Вось малайцы, беларусы, усіх велікакняскіх падданых увялі ў свае камп'ютэры! Націснуў гузік — і з чорнай адтуліны сігаюць твае продкі. Я ж наіў, ужо прызнаваўся ў гэтай слабасці, так думаў. Таму і склаў выклік на сваіх родзічаў, як і намаўлялі мяне да гэтага ўчынку абедзве рэдакцыі.

Праз нейкі час прыйшоў з Мінска адказ. Ананімны спадар хваліў мяне за хобі і адначасова выводзіў з ілюзіі. Ён пісаў:

„Вельмі прыемна было даведацца пра Вашу зацікаўленасць гісторыяй свайго роду. Здаецца, у Вашым выпадку ёсць добрыя шанцы на поспех. Хутчэй за ўсё, дакументы, якія б высветлілі гісторыю роду Ваўкавыцкіх, знаходзяцца ў Беларускім дзяржаўным гістарычным архіве ў Гродна — 230023, Беларусь, Гродна, пл. Леніна, 2, тэлефон: 0152-472-856. У прыватнасці, там ёсць рэвізскія сказкі (падворныя перапісы насельніцтва) Пружанскага павета за 1795-1858 гады. Там жа маецца адзіная метрычная кніга Белавежскай царквы за 1878-1886 гады (іншыя, напэўна, загінулі). Вядома таксама, што хтосьці з Ваўкавыцкіх даводзіў сваё шляхецтва і род быў уключаны ў дваранскую радавую кнігу Гродзенскай губерні. Матэрыялы аб доказе шляхецтва, напэўна, захаваліся калі не ў Гродна, то ў архіве дэпартамента геральдыкі ў Санкт-Пецярбургу (зараз — у Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу).

Каб выявіць усе дакументы, патрэбна сапраўднае навуковае даследаванне. Наша Таварыства з радасцю дапамагло б Вам, але толькі ў тым выпадку, калі знойдзецца спонсар, які б узяў на сябе ўсе выдаткі. Нам прыходзіцца ўлічваць, што кожнае даследаванне абыходзіцца не менш чым у 100-200 долараў, а калі яно звязана з замежнымі камандзіроўкамі — то яшчэ больш. Беларускае генеалагічнае таварыства — некамерцыйная арганізацыя, якая дзейнічае за кошт добрачынных ахвяраванняў”.

Тут валютны рахунак БГТ. Во якая практыка навадваран. А нашто мне здалося ваша шляхецтва? Я ж прасіў толькі выцягнуць з

мроку гісторыі прадзеда: адкуль прыйшоў, што рабіў, дзе жыў. Вось нядаўна Байко пусціў гараплённую здагадку: урочышча „Стахаўшчына” ад Стаховіча або Стахоўскага, якія, мабыць, жылі там. Не падмазвайся Пятрук пад паркавую гару. Калі хто і жыў на памянёным месцы, дык толькі Стах, мой продак: наш куст завецца „Стасюкі”. І дзед нарадзіўся на Крыжах, да якіх упрытык падыходзіць „Стахаўшчына”. А хто быў гэты Стах — вазьмі, дакажы — ніхто не ведае. А вы мне мусоліце мазгі дваранствам. Крыўдна. За саветаў гайнаўскага перыяду з-за „цкі” прычапіўся быў да мяне Юрка Панасюк: „польскі пан” і „польскі пан”. У яго, бачыце, класавае прозвішча. Дык я, каб адчапіцца ад новапавернутага актывіста, пачаў вывучаць родавую этымалогію. Памагла баба: успамінаючы мінулае, яна заўсёды вымаўляла: нябожчык Воўкавіцькі (паходзіла з-пад Свіслачы і дзед быў яе другім мужам. Першы — Арахоўскі, з Гайнаўкі). Тады мне не цяжка было даказаць Панасюку, што маё прозвішча не горшае за яго: я падзяліў далёкага продка на дзве часткі і выйшла, што трэба: жыў Віцька, і ў яго быў сын Воўка, як бачыш, зусім не паны. Ад сына і пайшоў род Воўкавіцькіх. Панасюк прызнаў мяне класава роўным. А вы мне даяце шанцы на панства. Я ўжо застары на гэты сіндром.

Успомніліся вярбоўшчыкі ў беларускую шляхту, аб якіх, пасля вяртання з першага з'езду беларусаў свету, расказваў Міхась Хмялеўскі. Прыехалі нашы (далёказамежныя) хлопцы ў недавартасцяваны Мінск. Яны Янавічы! Ніводнага Івана! Пародзістыя, усе на „скі”. Вядома, Польшча!

— Уступайце ў дваранскае саслоўе! — прапануюць мінчукі.

А чаму б і не. З'явіліся ўжо ў Беларусі собскія казакі, пара адрадзіць і шляхту. Калі ў Еўропу, дык у кунтушах і з казацкім свістам.

Не ўпускайце, хлопцы, шансаў.

А я спонсараў не маю,
Астануся ў лясным краю.
Мо за цяжкую пакуту
Лясун сыпне і валюту.

А там — продкаў поўны тэндэр
Мне даставіць Астап Бэндэр.

Насміхаўся Сідар.

## Блудная гара

Продкі, аднак, варушаць памяць, не пакідаюць маіх сноў. Іду Каралеўскай дарогай. Да дзеда, лесніка з Пацавага груда. Хадзіў няраз з мамай, па ягады. Дзеда ніколі не бачыў, нават на фатаграфіі. Гнятучы настрой. За паваротам мэта маёй вандроўкі. Што гэта? Уздоўж дарогі руіны старога замка. (Цяпер тут дзяржаўная граніца). У таямнічых развалінах, як у каменяломні, корпаюцца панылыя катаржане. Адкуль яны тут узяліся? Чаго ім трэба?.. І замак... Турма?

А сёння з'яўляецца Сяргей (ужо не сон).

— Едзем, сенсацыя!

І вязе ў лес, за Грудкі, да граніцы, амаль пад замчышча з учарашняга сну. У сумнай лагчыне земляны круг. Салідны насып з зазначаным уваходам. Новае капішча? Парыліся ў верхнім слоі зямлі, знайшлі драўляны вугаль. Відаць, выраблялі тут паташ.

А паблізу гара. Стройная, урачыстая, залатое звяно з пакатых узгоркаў Белавежскай грады. Падняліся наверх. Паміж соснаў каменныя глыбы. Аж дух займае ад свежага, светлага хараства. Прыселі ля валуноў, адчулі подых вечнасці. І ў сэрцы варухнулася прыемная цеплыня. Ці не таму, што шыбую думкай за сонцам, у дзедаў Пацаў груд. Кіламетраў 5 уздоўж дзяржаўнай граніцы. Ён па той бок калючага дроту. Ці застаўся там нейкі след па дзедавай леснічоўцы? Расказвала мама, як там было хораша: за акном бор, за парогам ягады, грыбы. Відаць, да нашай гары мама не даходзіла, далекавата, і не было патрэбы. А дзед тут бываў. І не раз. Абход свой ведаў добра. І любіў лес. Ці не на гэтай гары абуджалася ў дзеда святое пачуццё?

— Хлопцы, пара дахаты! — уварваўся ў мае абрыўчатыя летуценні непаседлівы Сяргей. Таропіцца да жонкі, у Лясны музей, які нядаўна, разам з Тамарынай галерэяй, гучна адкрывалі. Сяргей усё папаўняе экспанаты. Сабраў нямала гаспадарскіх прыладаў і лясных дзівосаў. Вось і сёння, у старой паташні, загарнуў у паперыну добра захаваныя вугалькі.

Размінаем плечы. Не хочацца адсюль нікуды ехаць. Углядаюся ў гарызонт. З Пацавага груда коўзаю думку ўлева, зачапляюся за слынныя Віскулі. Раней нічым асаблівым не вылучаліся — раптам, за адну ноч ускалыхнулі свет. Ах вы, ночы белавежскія! Яшчэ каўзок улева, пад Пружанскую шашу — урочышча Перароў з рэчкай Пераро́ўніцай. У маленстве ў гэтым зялёным закутку і праявілася ў мяне разведчыцкая жылка. Над рэчкай бацькі рабілі сена. Узялі і мяне з сабою. Бацькі працавалі, а я па-пластунску даследаваў суседнія кусты. І зацікавілася мною балотная змяя. Наўрад ці знаёмства закончылася б

для мяне шчаслiва, але ў крытычны момант надбег бацька i друком суцiшыў паласатую поскудзь.

Недзе там i брацкая магiла з лета 1941 года. Немцы расстралялi ў Перарове першую групу белавежцаў...

Пазмрачнелыя думкi спынiў парывiсты Барыс:

— Краты! Краты рыюць гару! — бязрадасна махаў рукамi на ўсходняй сцяне нашага новага храма. Кiнулiся i мы туды. Убачылi дзiкую карцiну. Падножжа схiлу раз'ядала жудасная жоўтая рана. Мы анямелi. Цуд прыроды бяздушныя самаеды прызначылi на жвiр.

З цяжкiмi думкамi спускалiся мы ўнiз i доўга блудзiлi па лесе, пакуль знайшлi свайго „фiацiка”. Потым назвалi гару Блуднай, бо нiколi не ўдавалася нам трапiць на яе адразу. Каб яна так зманьвала тых сляпых кратоў.

## Могiлкi

Белавежскiя могiлкi — старая i цiкавая кнiга. Два днi вынатоўваў я з яе мясцовыя прозвiшчы. Найбольш знайшоў Валкавыцкiх. А колькi на гэтым узгорку копчыкаў безыменных. Недзе, пад адным з iх, i мой прадзед. Аб iм нiчога не ведаю. Нават iмя толькi выпадкова выпала ў мiнулым годзе з дзедавай шлюбнай метрыкi. Называўся Фёдар. Вiдаць, у гонар яму, гэтае iмя атрымаў i мой бацька. Скрытны быў прадзед. А прадзед па лiнii мамы нават iмя не пакiнуў. Але Улезлы — патомныя леснiкi, пэўна, i ён iм быў, як i яго сын Рыгор, а мой другi дзед. Улезлы жылi на Усходняй сцяне Пушчы. Там i канчалi свае зямныя вандроўкi. Дзеду Рыгору лёс вызначыў кругавы маршрут. Белы лясок — Ясень — Пацаў груд — цвярскiя лясы (бежанства) — Белы лясок. Тут, ахоўваючы родны лес, i загiнуў. А жонка яго, а мая бабуля Тацццяна, спачывае вечным сном у Белавежы. Памерла ў 1915 годзе ў Пацавым грудзе, у час родаў. Побач i магiлка немаўляцi. Магiл дзеда Паўла i бабы Сонi я не знайшоў. Так гiне i родавая вязь. А ў прадзеда было чацвёра сыноў i, мабыць, сядзеў ён на паўучастку. Так выходзiць з падзелу зямлi мiж братамi. Адзiн вымушаны быў пайсцi ў прымы. Каму належаў участак — прапрадзеду? Адно пэўнае, ад яго адпачкаваўся новы куст Валкавыцкiх. I пачынальнiк куста — Станiслаў?

Ёсць яшчэ ў нас i iншыя кусты Валкавыцкiх: „Вiхры”, „Маразы”, „Адамаўскiя”. Толькi наймалодшыя ўшанаваны iмем наверсе капца. I колькi тут блiзкiх па найменню i зусiм мне невядомых людзей. Але над гэтай магiлай мурашкi забегалi па целе. Чытаю: „Волковыцкая Анна Алексеевна (1924-1945). Паг. в Германии”. I эпiтафiя: „Спи дитя род-

ное в стране чужой. Мать плачет за тобой”. Яе, якраз, добра ведаў, сустракаліся ў Кенігсбергу. І я там — у той самы час — вёў торгі са смерцю, і ставіў кастусе адзін варунак: згодны на ўсё, толькі не хачу паміраць на чужыне; і апантаная думка пераносіла гэты акт на Стахаўшчыну, на бацькоўскую палоску пад лесам. Чаму туды, хто яго ведае, мабыць цягнулі нейкія флюіды з хаты прадзеда. Я вытаргаваў адтэрміноўку, Ані не ўдалося. Пасля вайны ейны бацька ездзіў у Кенігсберг, шукаў дачччынага следу. Ды што можна было знайсці ў руінах горада-крэпасці. Пахавалі сімвалічна. Відаць, так рабілі і тутэйшыя лесавікі курганнай пары, бо і на іхніх могілках нямала такіх пахаванняў.

Белавежскія могілкі абнесены нетыповай вяззю. За ёй поўнае пагадненне, непадзельнае. Без тоўстых рысак. Без пераможцаў і альтэрнатыўных фрустратаў. Тут усе пераможаныя, злюстраваныя і паяднаныя незалежным прыгаворам. Беларусы, палякі, рускія, украінцы. Праваслаўныя, католікі, пратэстанты, атэісты. Сяляне, службоўцы, свяшчэннікі. Капитан 8-го Эстляндского полка Николай Михайлович Абрамов (бацька вядомага польскага пісьменніка Ігара Неверлі) і gen. Józef Bułak Bałachowicz (малодшы брат Станіслава, таксама ватажка). І без тытулаў, проста: „Марися и Гриша”.

Вось дзе белая вязь — адзінства ў разнароднасці, наш універсалізм.

## Чорныя дзятлы

З могільнікавага ўзгорка добра відаць абломкі мінулых вякоў. Дапытлівы зрок рассейвае па неабжытым лясным моры астраўкі абарыгенаў, пускае ў рух завілістыя ручайкі і халодныя рэчкі. На прагалінах мільгаюць вострагрудныя чаўны з разнамаснымі прыхаднямі. Заклубіліся вякі, стаўпіліся. У небывалым вэрхале бліскае то меч, то крыж. І нараджаецца новы сплаў. Ён і стаў нашым каменем спатыкнення. Знайшліся чорныя дзятлы, якія, здабываючы ежу, пачалі дзяўбці гэтую сумесь.

Вясна. Беласток. Стаю на вуліцы Кілінскага і разглядаю вітрыну „міжнароднай” кнігарні, шукаю беларускіх выданняў. Ідзе Сцяпан Копа, заслужаны беларускі дзеяч. Маркотны. Пытаюся, што здарылася. Чорныя дзятлы („міжбуганарваўскія”) пстрыкнулі па носе за Дабрываду. Выдаў зборнік песняў гэтай вёскі і зазначыў, што мова ў ёй мешаная. „Украінцы” абразіліся, тыцкаюць польскім *Атласам* — тут мова ўкраінская, і кропка. Копа перажывае:

— Трэба нам сустрэцца і высветліць адносіны.

Сустрэцца трэба, але не з пярэваратнямі. Іх не пераканаеш, яны ў неафіцкім наступе. Нашы аргументы патрэбны не ім, а людзям, якіх абалваньваюць. Няведанне айчыннай гісторыі — наша агульная бяда. На ёй і паразітуюць чорныя птахі.

Я параіў Копу пазнаёміцца з лінгвістычнымі доследамі брэсцкага універсітэта. Датычаць пасрэдна і Дабрывады. Выяўлена: самы лёгкі, не адчувальны для дзіцяці пераход з дыялектаў Заходняга Палесся — менавіта на беларускую літаратурную мову. Беларуская вобразная паэтычная сістэма — сімвалы, паралелізмы, метафары, паэтычныя параўнанні — уся эстэтычная канцэпцыя роднасная аднолькава жыхарам Палесся і жыхарам цэнтральнай Беларусі.

А што маюцца тут украінскія напластаванні, дык не менш падобных беларускіх адбіткаў на ўкраінскім этнічным абшары. Жылі ж продкі ў адной дзяржаве, кантачылі, перамешваліся, пакідалі адны другім нешта з сябе. Так і вырасла беларускае дрэва, замешанае на балцкім субстраце, выгадаванае на каранях, што ідуць у чатыры накірункі свету, з яцвяжскай, палавецкай і татарскай вяззю. Расло ж дрэва ў прахадным двары Еўропы. Ці зараз выносісты, каранасты ствол трэба дзяўбці, бо такі час, дзюбчасты?

Нават Віктар Швэд, і той пачаў шукаць свае карані за морам. Але ён прыкідваецца авечкай. Такая паэтычная вольнасць. Ён добра ведае, адкуль у Моры з'явіўся Швэд. Хоць і заморскія прыхадні ўнеслі ў наш генны субстрат сваю драбніцу, аднак вядома, што ў Швэдавай вёсцы „швэдамі" называюць слоўнікавых „шашалёў". Нічога ў гэтым жучку няма абразлівага — боская жывінка. І аб чалавеку сведчыць не імя, а яго носьбіт. І „швэд" (не „швед") гучыць не горш за „капусту". А так зваўся беларускі князь, якога, разам з валковіцкімі братамі нашы каралі выдварылі з Пушчы. А славуты дом Раманавых! Якім жа безнадзейным празаікам быў заснавальнік роду — называўся: Кабыла. Не дзіўна, паходзіў з Літвы (Беларусі).

Тут я хацеў дадаць: „швэд" па духу роднасны з „ічамі" і „цкімі", але спахапіўся: а што, калі Віктар не прыкідваецца, а на самай справе шукае ў сваіх венах скандынаўскай плыні? Нядаўна ж заявіў, што быў нават грамадзянінам III Рэйха. Ну і Віктар! Начытаўся неаніўскага Ярша: хоча далучыцца да „вайсрутэнскай" кампаніі Акінчыцаў і Казлоўскіх? Жах!

Трывожнай здагадкай падзяліўся з Сідарам.

— Будзь спакойны, — заўсміхаўся Макацёр. — Віктар асуджаны на няўдачу. Калі мы па сваёй геннай структуры рознімся ад шымпанзэ толькі на адзін працэнт, дык якія сляды можна знайсці ў нашых венах?

— А ўсё ж адпачкоўваемся...

— Такі наш нораў. Гомасапіст, адкрыўшы, што ён ад малпы, не назваў сябе малпай. Тут і загваздка.

І зноў усплыў з памяці стогадовы генерал-цёзка. Даведаўся: нарадзіўся ён у маёнтку Прошаў. Гэта па той бок Буга. Ці не там і мае дальнія карані? Тыя, валковіцкія браты, перабраліся на гэты бок ракі? А мо ўсё адбылося наадварот: адно адгалінаванне з Валковічаў пайшло пад Нараўку, а другое за Буг? Такое ўжо памежжа. У нашым генатыпе і Мендэль не разабраўся б.

### Першая споведзь

Загадкі развязваў я ад маленства. Ад першай споведзі, калі выклянчваў у бацюшкі Цехана высокую ацэнку з рэлігіі. Прыйшоў на гэты экзамен зусім непадрыхтаваны. Духоўны настаўнік толькі папярэдзіў:

— Хто не прыйдзе, той атрымае двойку.

А двойка з рэлігіі — развітанне са школай. Дык стаў я на калені перад бацюшкам без трывожнага прадчування. А тут, як удар абухам:

— Грешен?

Памутнела ў галаве ад страшнага слова і я пачаў маліць свяшчэнніка:

— Нет, бацюшка, нет...

Убачыўшы мой перапалох, бацюшка палагаднеў і пачаў наводзіць мае распаленыя думкі на правільны троп:

— Ну, как это нет?.. А мать всегда слушаешь?

— Всегда, бацюшка, — згодна з праўдай адказваю.

— А отца?

— И отца тоже.

— Хороший мальчик... А с ребятишками, небось, дерёшься?

Не такі я дурны. І з „ребятишками” я цаца, і з сабачкамі, і з коцікамі.

Але тут бацюшка не гладзіць па галоўцы, а рэзка мяняе тон:

— Говори, болван, „грешен”, а то двойку получишь!

Прашыпеў злавесна. Што ж атрымліваецца: не прыйдзі — двойка, і прыйшоў — двойка. І я здаўся, вымавіў злашчаснае слова, так і не зразумеўшы, У чым заключаецца маё грэхападзенне. Прыбітым вярнуўся дахаты.

— Як было? — пытае мама.

— Кепска, — гавару. — Бацюшка чапляўся: „грэшэн”, „грэшэн”.

— Нічога, так трэба, — супакоіла мама.

І сапраўды, нягледзячы на карыслівы падыход да пакаяння, бацюшка выставіў мне добрую ацэнку.

Загадкавы быў бацюшка. Прыйшлі саветы, скінуў расу і стаў ваяўнічым атэістам. А айцец Сасна, прачытаўшы „Віры", ламаў голаў, адкуль у мяне атэістычныя ноткі. Ад духоўнага настаўніка, дарагі ойча.

## Казкі

Загадкі ставілі і казкі. Яны сыгралі ў маім жыцці асаблівую ролю, увялі ва ўяўны свет, з якога дагэтуль не магу выбрацца. А ўсё пачалося ад коміна на хлебавай печы, за якім я, затаіўшы дух, лавіў дзівосныя аповеды старых дзядзькоў, што ў доўгія зімовыя вечары збіраліся ў нашай кухні. І гучэлі ў маіх вушах званы праваліўшайся пад зямлю царквы (урочышча „Падаркаў"), хадзіў я па лесе таямнічымі брукованкамі, адкрываў сляды старажытных селішч. Ляскалі і па маёй галаве шаблі пагромшчыкаў беларускай Грамады ў Стараберазове. Неверагоднае станавілася верагодным. А калі асвоіў польскі алфавіт, мама выцягнула з гарышча патрапаную часам рускую кніжку і пачала вучыць па ёй кірыліцы. Гэта былі казкі Льва Талстога. Незвычайная цеплыня і прывабнасць патыхала з пажоўклых старонак. Адкрыў новы, далёкі і як жа блізкі свет.

А потым быў Мор і ягоная выспа. Урэшце, казка — быль.

## Калыска

А мама? Была самым надзейным апірышчам нашай сям'і. І нарадзіла мяне пад шчаслівай зоркай, хоць і ў нядобры час, недзе на другі год пасля вяртання з бежанства. Вярнуліся бацькі з галоднага Паволжа на папялішча. Свёкрава хата згарэла ў вайну, памёр і свёкар. Свякруха з дачкой Насцяй гаруе ў прыстасаваным пад жыллё хляве. Пацесніліся. Тут і раздаўся мой першы пераможны ўскрык. Не буду расчульвацца, перамога была піравай, я ад пачатку хварэў, аднак вымушаны на хвілінку пахіліцца над сваёй калыскай. Цяпер ведаю, стаяла яна, як і ўвесь хлеў, на падземнай жыле. Вясною бацька зрываў падлогу і з-пад посцілу вядром вычэрпваў ваду. А яна ўсёроўна струменілася, і я, у прамежках аздараўленчага прасвятлення, пускаў з канапкі ў імклівы ручаёк трэскі-караблікі, і з цікавасцю сачыў за іх цягай вырвацца на двор. Наша хацінка была вельмі сырая, і ўрэшце доктар Уласаў выявіў маме сакрэт маёй цялеснай кволасці.

— Калі хочаце, каб сын жыў — змяніце жытло.

Быў аўтарытэтным лекарам, і мама пачала кіраваць бацьку на будаўніцкі зрух. Бацькі запазычыліся і пачалі ўзносіць свой дом. Рос ён марудна, і я няраз, з зялёнымі сліўкамі за пазухай, пралазіў пад высокімі (так здавалася) падрубамі ў надзейную схованку. Мама забараняла есці недаспелыя фрукты. Ласавацца першым яблыкам дазваляла толькі на Спаса.

Усё ж прыйшла пара перабірацца ў новае гняздоўе. Парадную частку заняў крамнік, які пазычаў грошы на пабудову. Цяпер будзе „аджываць". Мы ўсяліліся на зады. Старое памяшканне прызначылі на бульбяны пограб. Пасля змрочнага і халоднага катуха, здавалася, займелі палац. Быў ужо ў мяне неадступны спадарожнік па падрубных рэйдах, малодшы на два гады, брат Коля. Неўзабаве з'явілася на свет і сятра Галя. Яна нарадзілася ў камфортных варунках. Апрача новай хаты, была ўжо ў нас і свая кароўка. А ў вачах мамы доктар Уласаў вырас у прадказальніка: я выжыў і пазбавіўся хвароб.

Жыццё складвалася добра. Быў хлеб, было і да хлеба. Бацька стаў малярам. Калі не маляваў, падраднічаў на лесасплаве або ездзіў у лес на вывазку. Значыць, быў ужо і конь. Ну і была чацвяртуха зямлі (у тым і сенажаць), як на белавежскія ўмовы — тыповая гаспадарка.

Прыйшло і грамадскае прызнанне. Грамада выбрала бацьку солтысам. На новай хаце заблішчэла і адпаведная статусу шыльдачка. Бацькаў чын прыліп і да мяне. Быў Жоржыкам, або, як Коля клікаў, „Дзёдзікам", стаў „солтысавым сынам". З'яўляюся ім да сёння. Часам, едучы па Заставе роварам, лаўлю гамонку старых заплотных разявакаў:

— Які гэта барадач папёр?

— Валкавыцкі.

— Які Валкавыцкі?

— Жоржык.

— Не ведаю...

— Солтысаў сын!

— Ааа!..

Колькі солтысаў змянілася ад бацькавага салтысавання, а „солтысаў сын" усё той жа.

Цёмнае нашэсце

Бацька апраўдваў давер грамады, салтысаваў доўга. Цяжэй было справіцца з саннымі палазамі — „сучкай" і „карамі". Аднойчы кары не трапілі ў каляіну, сышлі з дарогі, з саней споўз цяжкі камель і прыдушыў бацьку. Вазакі прывезлі яго дахаты ледзь жывога. Мама пабегла па доктара, а нас, дзяцей, паралізавалі чорныя думкі. Хоць бацька нас не распешчваў і ў пачуццях быў стрыманы, але я не

ўяўляў, як можна застацца без яго. Прыехаў Уласаў, агледзеў напаўнябожчыка, паківаў галавою і наказаў ляжаць і чакаць. Відаць, не даваў і ён вялікай надзеі. Шпіталь ажно ў Бельску. Каму снілася ў той час карэта хуткай дапамогі. А санямі? У такую далеч? Здаровы акалее. Заставалася чакаць.

Якраз у школе развучвалі мы сумную песню пра Віслу, пра яе плынь смарагдовую. Чамусьці цяпер яе не чуваць. А харошая песня. Той смарагд дагэтуль гнездзіцца ў маім сэрцы: нагадвае разбітага бацьку. У тыя чорныя дні сумная Вісла не адступала ад мяне ні на крок.

Адна мама не апускала рук. Сваімі спосабамі выхадзіла бацьку. Але нашэсце калясмертніцтва не пакінула нас. Адужаў немач бацька, як нечакана на менінгіт (запаленне мазгавых абалонак) захварэў Коля. Хварэў цяжка. Мама не адступала ад ложка, абкладвала распаленую галаву дзіцяці лёдам. Так, па рэцэпту доктара, зганяла высокую тэмпературу. Калі падала ад бяссонніцы, ставіла на дзяжурства мяне. Круглыя суткі трымалі трывожную варту. Як прыходзіла мая чарга, я ўмольна глядзеў на брацікa і праз слёзы, што засцілалі вочы, прасіў:

— Не адыходзь, не адыходзь...

Ды ён нічога не чуў, быў непрытомны, толькі цяжка і спешна дыхаў. Урэшце расплюшчыў вочы, спала гарачка — і паяснела ў хаце, Коля ачуняў. Пад маміным крылом хутка стаў і на ногі.

Жыццё працягвалася. Мы ўжо пабагацелі на другую хату. Купілі на Падалянах, дзевятнаццацівечную, з нетыповымі для Заставы маленькімі вокнамі, нізенькую. Разабралі, перавезлі і паставілі на задворку, за Шалестуновай клуняй. Пашырыць жыллёвую плошчу прымусіў кватарант. Ён ажаніўся, прывёз гаспадыню з курортнага Буска, прывыклую да выгад — жыць у краме, за тымчасовай перагародкай, было цяпер цеснавата і непрэстыжна. Заняў ён усю хату, а мы перабраліся ў нованабытую на Падалянах.

Шчасця ў ёй было мала. У першую зіму, коўзаючыся на „дзеравяшках”, папсаваў я калена. Нагу пачало прыцягаць. Доктар прызнаў „прыцяжэнне жыл” і накіраваў у бельскі шпіталь да спецыяліста. Абкутала мяне мама вязанай хусткай і мы паехалі ў Бельск. Упершыню ехаў поездам і першы раз быў у горадзе. Запомнілася бясконцая, здавалася, дарога з белымі каменнымі слупкамі, на якіх я адпачываў. Бялеюць таксама ў вачах і сцены нібы палацыка, у якім месціўся шпіталь. Ледзь даклыпаў да спецыяліста. Ён параіў рабіць гарачыя ванны і абкладаць хворае калена распараным ільняным зернем.

Распарвала мяне мама ў вялікай бочцы. Да паловы напаўняла яе вадою, разагравала ў печы вялікі камень, укідала яго ў бочку, туды

ўпіхала і мяне, накрывала прасцінай, і я там даспяваў да кампрэснай працэдуры.

## Pan Droń

За зіму прыняў я сорак ваннаў. Хоць і прапусціў 235 школьных гадзін, але прарабіў увесь матэрыял, уключна з хатнімі заданнямі. Таму цешыўся: выздаравеў і не адстаў ад класа. Іншае меркаванне выказаў у канцы года pan Droń (не з мясцовых Дранёў), класны апякун і вяршыцель лёсу. На бацькоўскім сходзе, націскаючы на прапушчаныя гадзіны, ён сказаў:

— Nic złego, nic dobrego.

Пан Дронь любіў паўтараць: „На пяцёрку ведае толькі Бог, на чацвёрку — настаўнік". А вучні — лёгка здагадацца. Паводле гэтай тэорыі я меў права лічыць сябе выдатнікам. І то кругленькім: на паўгоддзе з усіх прадметаў атрымаў тройкі. Таму ў падсумаванні настаўніка не ўбачыў скрытага сэнсу. А на школьным пасведчанні за чацвёрты клас хіхікаюць двойкі — з чатырох асноўных прадметаў. І агульны вынік „хі-хі".

Nic złego, nic dobrego. Гумарыст пан Дронь. Ён і садыст. Калі возьме ахвяру на мушку, наздзекуецца, пакуль знішчыць. Па якой прычыне прызначыў мяне на адстрэл, не ведаю, але заўсёды бачыў у яго вачах непрыязь. Няўжо з-за Гундлаха, падпанкавага сынка, якому я ў калідорнай таўкатні выпадкова памацаў кулаком далікатны носік? Па беленькай фальбоністай кашулі пацякла шляхетная юшка. Падпаніч пабег са скаргай да пана Дроня. Той кіўнуў на мяне, перакуліў на калена і сканнуў па голых лытках раздвоенай трысцінай, з якой ніколі не расставаўся. Кроў за кроў! Яна выступіла і на маіх нагах. Ну і квіта. Гэта ж было ў пачатку года. Дакуль насіць злосць? І трэба ж было трапіць у чацвёрты „б", да гэтай дрэні! З паняй Шпэтульскай не канфліктаваў. Шкада, што ёй давяралі толькі пачатковыя класы.

Я зненавідзеў Дроня, і на канікулах спагнаў крыўду на ягоным госцю, спартсменістым лысуне, які на рэчцы ў Дроневай байдарцы загараў са сваёй паняй. Я стаяў на мосце і сачыў за гэтай парачкай. Плынь памалу несла панства пад мост. Калі байдарка параўналася з мостам, я выхіліўся за парэнчу і з асалодай плюнуў уніз. Плявок прылуніўся на лысіне Дроневага госця. Лысун выняў хустачку, выцер ліпкае пасланне, прычаліў да берага і пагнаўся за мною. Як я ўцякаў! У бок Заставы, вядома. Бег, не аглядаўся. Усе думкі ў пятках: хутчэй, хутчэй. А ногі млеюць, млеюць. А за спіною пераможны сап — не

ўцячэш, не ўцячэш. Паўжывы, паўмёртвы, дапаў я да Балоцечка. Выратаваўся, пан у дрыгву не палезе.

Пасучы коней на Муловіне, абмазгоўвалі мы з Лёнем Дубініным цалкам галавакружную аперацыю пад крыптанімам Droń, але ажыццявіць яе не змаглі — канікулы хутка праляцелі і я, хоць пякла горыч (ці ж лепшыя за мяне прайшлі вышэй), пагадзіўся з лёсам і пачаў паўтараць год у чацвёртым „а”, у пані Русіняковай.

## Pani Rusiniakowa

Настаўнікі гавораць, што запамінаюцца вучні найлепшыя і найгоршыя, сярэдзінных выцірае з памяці час. Тое самае можна сказаць і аб настаўніках. Злосць распаўзлася па косцях і я быў шчаслівы, што назаўсёды развітаўся з Дронем. Я з першага ўрока закахаўся ў новую выхавацельку. Цяпер яна, пэўна, настаўнічае ў Патойбаковіі, але сюдтуд загляне ў маю казку і грэе азяблую ў блуканні душу цяплом першай сустрэчы. Заўсёды з прыязнай усмешкай, як і ў тыя наступныя чатыры гады, праведзеныя ў белавежскай школе. А трапіў я ў клас неаднародны: беларусы, палякі, яўрэі, дзеці сялян, рабочых, рамеснікаў, чыноўнікаў, балахоўцаў. І не помню, каб наша разнамаснасць была калі прычынай нейкіх канфліктаў. Я, для прыкладу, пасябраваў нават з падпанічам, якому ў мінулым годзе расквасіў нос. У пані Русіняковай не было прадузятасці да вучняў: як добрая маці — грэла нас аднолькавай ласкай і дабрынёй. На другі год, каб падцягнуць клас па гісторыі, стварыла тэрытарыяльныя групы, назначыла групаводаў — і мы пазаўрочна ўзаемна „падцягваліся”. Дронь, пэўна, сканаў бы ад смеху, даведаўшыся, што я ўзначаліў застаўлянЦаў. На Войнічавых вышках прарабляў я з падапечнымі не толькі падручнікавыя веды, але і стварыў атрад касінераў: рыхтаваў хлопцаў да пераможнай бітвы з пераважаючымі сіламі Маскалёў. Былі ў нас і косы, праўда — фанерныя, але, па падручніку, пастаўленыя ўверх носам, і блішчэлі ад срэбнай фарбы лепш за сталь. Зрабіў таксама запас ордэнаў і медалёў, праўда — кардонных, але ярка размаляваных паводле вартаснай градацыі.

І злезлі мы з вышак, выйшлі ў пленэр, на прасторную Бандзюгу, і пайшлі на варожыя рэдуты, размешчаныя на Бздзюсе, тваністай пузатай выпучыне. Бздзюха нагадвала дапатопную пачвару, якая выставіла з Бандзюгі раздуты падземнымі газамі трыбух, загароджваючы доступ да Кнігінеўкі. Трыбух пульсаваў рыжымі вочкамі і вылучаў непрыемны пах. Ісці на зыбістую вышыню, усё роўна што прабірацца

праз міннае поле. Неразважны крок — і нырнеш у рыжую бездань. Бралі вышыню самыя адважныя.

Не за гарамі стаяў трыццаць дзевяты, і гэтае змаганне адгукнецца ў першых ваенных вестках: на Узбярэжжы ствараюцца касінерскія атрады. І я буду шкадаваць, што мяне там няма. А пакуль што, не шкадую каляровага кардону на выпучаныя грудзі „бздзюшыных" герояў.

Гэта было ў пятым класе. А ў сёмым пані Русінякова выявіла ў мяне літаратурныя здольнасці. І закружылася ў галаве ад нахлынуўшых мараў. Мроіліся далёкія падарожжы, незвычайныя прыгоды, ну, і, вядома, слава. Вось калі пасмяюся з Дроня: Nic złego, nic dobrego!

Ды аб'ектыўная рэчаіснасць пасмяялася з мяне: хоць і закончыў школу выдатнікам, сеў у лужыну — з „браку месцаў" не прынялі нават у гайнаўскую рамесную школу.

## Пачаткі свядомасці

Моцна перажыў няўдачу. Прагнуў вучыцца, а тут — стоп! У слесары — і то дарога закрыта. Не адпавядаю запатрабаванням? „Бракоўны" па паходжанню? Не інакш. Тутэйшых у мясцовы тартак не прымалі. Хіба што быў выдатным футбалістам, як Косця Пекач з Падалян. Ведаў і застаўлянца, які сваім канём цягаў у тартаку ваганеткі. Але той перш ачужыніўся, памяняў веру» і жонку прывёз з Мазовіі.

Мама ў каторы раз шкадавала вяртання з бежанства: — У Расіі вучыліся б, дзе б захацелі, — паўтарала. Цяпер ведаю, у Расіі таксама рознае здаралася. Асабліва з „заходнікамі". Наш сусед ніяк не мог сагрэць месца на бацькаўшчыне, хоць і спладзіў трое дзяцей. Кідаўся то туды, то сюды, урэшце развітаўся з жонкай і дзяцьмі (уладкуюся, забяру) і падаўся на Усход. Там і растварыўся бясследна.

Але тады маміны словы варушылі душу, і я пачаў на самаробным радыёпрыёмніку, які змайстраваў бацька, лавіць Маскву, каб хоць гэткім чынам наблізіцца да той зямлі, дзе маладым усе дарогі адкрыты.

А бацька? У яго быў ужо дыплом малярскага майстра, адкрыліся падрады, патрабаваў рабочых. Дык усунуў у мае рукі пэндзаль і загнаў на бляшаны дах у Дырэкцыйным парку: — Малюй, зарабляй на сябе.

А сонца пячэ, бляха смажыць голыя пяткі, а ўнізе, на корце, нядаўнія аднакласнікі, ужо гімназісты — пук-пук — гуляюць у тэніс. І ты ім не раўня, яны цябе не прыкмячаюць.

Дзе ж зорка твая, тая, пад якою, як кажаш, ты нарадзіўся? Недзе нада мною. Не без дапамогі Космасу злез я з дырэкцыйных дамоў. Рудальф Здажыль, наш строгі кіраўнік школы і прагматычны чалавек, які, у адрозненне ад рамантычнай пані Русаковай, трымаўся зямлі і раіў бацьку паслаць мяне вучыцца ў тэхнічную школу, нейкім чынам даведаўся пра мой правал. Як добры дух, нічога нікому не сказаўшы, з'ездзіў у Гайнаўку і выбіў мне „месца" — тое, якога не было.

Вядома, узрадаваўся, хоць душа ныла: вярнуся на дах — гайнаўская школа не давала ніякай надзеі на працу ў вывучанай прафесіі. Але гэта сказана між дужкамі, перамагае іншы настрой: паехаць у Кракаў, схадзіць на Вавель, пакланіцца астанкам магутных уладароў польскага народа, выказаць сваю ўдзячнасць і любоў ля курганоў Касцюшкі і Пілсудскага, наведаць гістарычныя „Алеандры", каб уласнымі вачыма ўбачыць тое месца, з якога ў памятны жнівеньскі дзень Камендант на чале легіёнаў вырушыў у бой за Польшчу.

Адкуль гэта? Хітрасць: хацеў купіць настаўніка, зарабіць добрую ацэнку? Дык тут лічыліся граматычныя памылкі. Хоць, хто ведае, ужо пахла крывёй — мог лічыцца і дзяржаўны патрыятызм. Дата 27.03.1939 г. Лекцыя 34. Заданне: „Маё падарожжа па Польшчы (мой намер)". У канцы справаздачы: Bardzo dobrze. Першая і апошняя пяцёрка ў новага настаўніка польскай мовы. Сшытак знайшоў нядаўна на старым гарышчы. Выявіў у ім шмат падобных фокусаў. Відаць, у маёй душы сумяшчаўся страх за сваю будучыню з апалагетыкай ладу, які і быў прычынай гэтага страху.

Свядомасць выплывае з быцця,
Быццё — з адкрыццяў.

Так кажа Сідар.

## Землятрус

Год прафарсіў у цёмна-сінім мундзірчыку з жоўтымі кантамі. Мама павесялела, роўна ў пяць будзіла мяне — снеданне ўжо стаяла на стале. Я праціраў халоднай вадою заспаныя вочы, глытаў падрыхтаваную ежу, хапаў дзве намасленыя лусты аржанога хлеба на абед — і на станцыю. Мы, белавежскія, акрамя Пеці Валкавыцкага („Петуха"), які кватараваўся ў Гайнаўцы, ездзілі ў школу поездам. Месячныя білеты каштавалі менш, чым прыватная кватэра ці бурса. Ну і мамін догляд непараўнальны. Хутка праляцела восень, зіма, вясна, лета.

А 1 верасня разбудзілі бомбы. Спрасонку думаў — землятрус, ложак дзіўна хадзіў. За акном гамана:

— Манеўры!

А тым часам у парку ўзрываюцца сапраўдныя бомбы. Вайна! Немцы бамбілі палац — раскалолі царкву. Ёсць і першыя ахвяры. Папаўзла чутка:

— У палацы хаваецца прэзідэнт.

На другі дзень чутка атрымала „пацвярджэнне". Калі мы капалі за клуняй бульбу, у ясным і ціхім небе затарахцеў цёмны разведвальны біплан без апазнавальных знакаў. Самалёт кружыў над Балоцечкам і Муловінай, выбіраў месца на пасадку. Урэшце нацэліўся на Бандзюгу. Першы ў жыцці самалёт, не на карцінцы, а над галавою! Папёр і я, за іншымі, на Бандзюгу. Выбеглі мы на прастор — сядзіць ля Выруба, рылам да Сяла. Пілот у машыне, дабягае да яе Крапіўніцкі хлопец, — яму было найбліжэй. Аб чымсьці гаворыць з лётчыкам. І нам цікава, нясемся ватагай. Бачым, з Сяла выскачылі жандары. Таксама бягуць да Выруба. Старыя, задыхаліся. А прышэлец зноў затарахцеў, адарваўся ад зямлі. Жандары ўскінулі вінтоўкі: піф-паф! А той як у насмешку, над іх галовамі паплыў на поўнач. Дык і напрошвалася выснова: прыляцеў праверыць вынікі ўчарашняга налёту. А Крапіўніцкі бягун вырас у нямецкага агента.

Тады і пачаліся мае клопаты з нямецкімі лётчыкамі. Перад самай вайной маляваў я на школьным даху вялікія, на цэлы верх, чырвоныя крыжы. Каб швабы не кідалі сюды бомбаў, каб бачылі: тут ваенны шпіталь. Не шкадаваў фарбы. На выпадак, калі б наляцелі ёлупы, што не ведаюць міжнародных знакаў, або слепавокія, санітары капалі на школьным панадворку акопы. Ці ўбачылі мае крыжы нямецкія лётчыкі, цяжка сказаць. Застаецца факт — на школу бомбы не ўпалі.

І шпіталь нікому не спатрэбіўся. Падзеі разгортваліся не па нашых планах. Толькі чулі пра вогненнае Узбярэжжа, а ўжо нашы салдаты спешна рыхтуюць абарону ў Пушчы. Заўтра, кажуць, на Заставе будзе бой. Раяць хавацца ў лес. Бацькі вырашылі: жанчыны (мама, Галя і баба) застаюцца ў хаце, а мужчыны (бацька, Коля і я) едуць у Разарват. Запрэглі Сіўка, укінулі ў воз цёплую вопратку, запас ежы, селі і пагрукаталі ўздоўж парку. На Надатках, калі скрунулі на загон, што вёў да лесу, нагнаў нас нямецкі ястраб. Выпусціў чаргу і пашыбаваў у напрамку нашых рэсак, куды і мы кіравалі. Хібіў, кулі прайшлі па разоры, і мы шчасліва дабраліся да зборнага пункту. Суседзі ўжо атабарыліся. Ля самых рэсак, непадалёку ад дуба Ягайлы. Месца выбралі добрае, крынічнае. І ніякі чужынец сюды не дабярэцца. Ноччу прыбілася да нас толькі згаладалая аўчарка. Відаць, з

паркавай гайні. Таму і назвалі мы яе Герынгам. Гэты паляўнічы быў частым палацавым госцем, і любіў сабак.

Наступіла раніца — цішыня. З усходам сонца з'явіліся нямецкія самалёты і ўзялі Пушчу пад нагляд. Мы выходзілі на ўскрай лесу, вывучалі іхнія рэйды, настаўлялі вушы ў бок Заставы — не чуваць водгукаў бою — і супакоеныя, вярталіся ў гурт з біклагамі крынічнай вады. У другую лясную ноч Ванька Кацапчык, які нейкім цудам здабыў вінтоўку, пайшоў у разведку. Прынёс добрую вестку: У Белавежы спакойна — няма ні немцаў, ні палякаў. Паехалі дахаты!

## Геаметрыя і падполле

У вольніцы пажыць доўга не давялося, Заставу запрудзіла польская конніца — толькі войска наш кут яшчэ не прымаў. Апусцелі застаўлянскія клуні, хлявы, куратнікі. Стайні пуставалі да гэтага нашэсця: напярэдадні вайны здатных да ваеннай службы коней рэквізавала дзяржава.

На нашым панадворку абсталявалася палявая кухня. Стаяць вартаўнікі. А вечарам грук у акно:

— Адчыніце...

У хату ўвайшлі Вольга Габец і Павел Валкавыцкі, якія днямі вярнуліся з Картуз-Бярозы. Павел з-за пазухі вымае чырвонае палотнішча:

— Федзя, выручай! Трэба сустракаць Чырвоную Армію. Вось палатно, малюй на ім прывітальны лозунг.

З кірыліцай, сярпом і молатам бацька справіўся, а на зорцы сеў. О-го-го, пяціканцовая зорка, трэба ўмець!

Я ўмею, выручаю. Школьным цыркулем выводжу акуратнае кола, а падпольшчыкі сапуць:

— Жоржык, не туды круціш...

Туды, я ўношу ў падпольную практыку асновы геаметрыі, здабытыя ў панскай школе: пяцікутнік нараджаецца ў коле. Цяпер сам здзіўляюся: савецкая зорка ўпісваецца ў свяшчэнны круг, у старажытны сімвал боскасці.

## Байцы

Назаўтра польскае войска выйшла з Белавежа. Як бач з'явіліся чырвонаармейцы. Не турбуючы гаспадароў, разбілі свае палаткі на пустэчы, там і бавілі час. На вітанні я не быў, і не чуў пра падзею, але на Стачку стаяла зялёная брама. Відаць, быў і мітынг, бо хадзіла

пагалоска пра гарачае выступленне нейкага Саланевіча. Ды перш за ўсё кідалася ў вочы шэрасць ваеннай экіпіроўкі і ўзроставая разнароднасць байцоў. Уражвала і самое слова „баец”: не было салдат. Войска, а без пагонаў. Армія, а без афіцэраў. На пятліцах нейкія трыкутнікі, кубікі ды ромбікі. І генералаў няма. Адкуль тады ў гэтага бясколернага войска такая дысцыпліна і стойкасць. У прыдарожных дыспутах „А ў нас, а ў вас”, заўсёды яны верхам. Нават у гандлі перавага на іхнім баку.

— Хлеб у вас есть?

— Во, по горло.

— А молоко?

— Сколько угодно.

— А колбаса?

— Полные полки.

Савецкія полкі завалены былі і мясам, і цукрам, і маслам. Смяяліся мы з гэтых „полак”, але і верылі, што там, у іх, лепш, чым тут: прыціскала ўжо нястача прадуктаў і грошай.

— Далучымся да БССР, будзе і ў нас усё, — пацяшалі агітатары.

## Рэйкавая вайна

Узнікла і школьнае пытанне. У Белавежы адкрывалася сярэдняя школа. Туды б і мне — збывайся даўняя мара. Прымуць, але ў пяты клас — такая вартасць польскай сямігодкі. Гайнаўка не лічыцца. Крыўдна, чатыры гады страчаны? Буду канчаць, што распачаў, а там пабачым. Дзякуй, рамесную школу не ліквідуюць. Болек Юркевіч, мой школьны сябар, такой жа думкі. Тады — у Гайнаўку! На роварах, туды і назад, круцім між танкавымі калонамі па разбітай ваеннай тэхнікай дарозе.

Ваенная тэхніка! Такога скачка не прадбачылі будаўнікі шашы. А будавалі ваенна-стратэгічны аб'ект, і быў ён вяршыняй тэхнічна-эстэтычнай думкі. Па сведчанні сучаснікаў, калі не лічыць Ваенна-Грузінскай дарогі, наўрад ці знайшлася б у Расіі другая шаша, якая ў тэхнічных адносінах магла б сапернічаць з белавежскай.

І прайшло толькі 39 год! Рускія пабудавалі, рускія і разбілі.

Паязды яшчэ не ходзяць. Калі і пайшлі, не палегчала: часовая ўлада не прызнае ільготнага тарыфу, плаці поўны білет, як і рэшта грамадзян, цяпер усе роўныя. Мы за прынцып, але як нам параўняцца са спекулянтамі, якія апанавалі паязды? Дык націскаем на педалі, пакуль не сатруцца пакрышкі.

Устаткавалася ўлада, сцерліся пакрышкі, новых няма, а тарыфны арэшак ні з месца. І перайшлі мы на заечы хлеб, аб'явілі вайну кандуктарам, даваенным службоўцам, якія добра ведалі нас і набытыя намі правы. Не можа быць, каб у паноў былі лепшыя законы! Ды што рабіць з тупымі выканаўцамі, яны не ўстанаўлівалі ні тых, ні гэтых законаў. Рэйкавая вайна схілялася не ў нашу карысць, кандуктары перацягнулі на свой бок міліцыю, і мы вымушаны былі мяняць тактыку барацьбы. Зашываліся ў кусты, чакалі, пакуль поезд не рушыць. Тады атакавалі, і не пасажырскія вагоны, а таварныя. На хаду і саскоквалі.

Абхітрылі чыгуначнікаў і міліцыю, добра ўсвоілі гульню — і прытупілі чуйнасць: займалі тамбуры не чакаючы паравознага гудка. Аднойчы занялі прасторны паўвагон. Толькі рушылі — на пероне працяглыя свісткі і загадны вокліч: *Остановить поезд!*

Відаць, нехта сачыў за намі з вышыні. Вядома, не чакаем, пакуль поезд вернецца на станцыю — у ногі! Добра, што парк побач. Аддыхаўшыся ў кустах, абмінаем парк і, быццам нічога не здарылася, спакойна выходзім на сцежку, што вядзе на станцыю: вырашылі чакаць новай „аказіі”. Ідзем, жартуем з нашага драпу — адна групка спераду, і я ў ёй, другая метраў трыццаць за намі. Насустрач тупае каржакаваты дзядзька ў мірнай бекешы (*руки в брюки*). Нічога дрэннага не прадчуваем. Ажно зрок зачапляецца за чырвоныя канты на дзядзькавых галіфэ. Уцякаць позна.

— *Ни с места, стрелять буду!* — папярэджвае пераапрануты міліцыянер. Урастаем у зямлю. Атарапелыя, узіраемся ў страшнае дула, якое пералічвае нас, і здаемся на ласку пераможцы. Другая група, убачыўшы што дзеецца, не зварочвае на сцежку, працягвае хаду ў папярэднім напрамку, і ёй удаецца выйсці з небяспекі. А мы пад канвоем ідзем на вакзальны ўчастак. Тут і наступае эпілог рэйкавай вайны.

Міліцыянер, рассеўшыся за рабочым сталом, сягнуў па цыгарку і сярнічкі (новыя словы — новыя асацыяцыі). Чырк сярнічкай, чырк — другой. Начыркаўся, пакуль прыкурыў папяроску: гэта не польскія запалкі, якія нашы бацькі дзялілі на чатыры часткі — і кожная загаралася. Урэшце чэкіст прагна зацягнуўся дымам, хукнуў горкім пахам у нашыя хлапечыя ноздры і, пранізваючы нас свідруючым позіркам, пачаў ставіць кардынальныя пытанні:

— Кто вы такие?

— Ученики.

— Кто ваши родители?

Тут пад нас не падкапаешся, класавая праслойка як трэба:

— Рабочие... крестьяне...

Ды і следчы не лыкам шыты:

— А какая у нас власть? — прыкідваецца дурненькім.

— Советская! — здзіўляючыся, тлумачым.

— А что это такое — Советская власть? — бярэ крэн на тэорыю і заганяе нас у тупік. Пачакаў, пакуль ачомаемся, і паясніў:

— Советская власть — это власть рабочих и крестьян.

І не даючы нам перадыху, ударыў наводмаш:

— Так почему же эта власть вам не нравится?

Мы запратэставалі. Мы — за Савецкую ўладу!

Развесяліўся інтрыган і чыніць нам новую каверзу:

— За Советскую власть — и не поддерживаете её! — смяецца.

— Как — не поддерживаем?! — абураемся: — Да мы готовы...

Не помню, на што мы былі гатовы (памерці?). Абвінаваўца абарваў дыспут:

— Если бы поддерживали свою власть, то бы покупали билеты.

І не дапускаючы нас да слова (дакажаце ў судзе), пачаў спісваць нашы каардынаты.

Запахла белымі мядзведзямі. За дробязныя прагулы адпраўлялі за Палярны круг, а тут, як падлічыць, колькі мы прысвоілі дзяржаўных горшай (па той жа чэкісцкай логіцы), заробім салідны тэрмін.

Разбітыя, выйшлі мы з міліцыйнага ўчастка і мазгуем, што рабіць. Вырашаем: трэба шукаць ратунку ў Беластоку. Хто паедзе? Сябры выбіраюць мяне. Складаемся на білет, заўтра ў дарогу.

Беласток незнаёмы, ніколі ў ім я не быў. На вакзале намерваю напрамак і іду разбуранай вуліцай у загадкавы аблвыканкам. Месціўся ён у палацы Браніцкіх. Неразбіты, белы, як сёння. У правым крыле знаходжу патрэбную мне чыноўную асобу і спавядаюся. Лысы чын у вясковай вышытай кашулі, падпярэзанай каляровай стужкай, дае выгаварыцца, не спыняе, толькі ківае галавою, нешта запісвае і, адчуваю, стаіць на маім баку. Так яно і было. Прыхільны дзядзька, выслухаўшы мяне, пакрыў нашых крыўдзіцеляў шмат'ярусным матам, пасукаў у акно кулаком (я им покажу!) і запэўніў, што ўладзіць справу ў нашу карысць.

Вяртаўся я ўскрылены: знайшоў справядлівасць, савецкая ўлада добрая, і мы не ворагі яе.

Ці абласны чын выканаў сваё абяцанне, ці, з увагі на наша малалецтва, змякла чэкісцкае сэрца, але нікуды нас не цягалі і мы, шчасліва закончыўшы вучылішча, знялі з павесткі дня і тарыфнае пытанне. А той палітычны фокуснік (то ў форме, то ў цывільным) усё

ходзіць за мною. Усё прапускае праз сваю прызму. І цікава, дзе б яго не сустрэў, незалежна ад часу, краіны і ладу, погляду не мяняе.

## З архіва

### Новаму Году

Я хваліць цябе буду у песьні,
пакланяцца ўсёй мудрасьцю слоў,
толькі будзь ты жаданай прадвесьняй
тых надыходзячых новых часоў.

Нашы душы засьмяглі ў чаканьні
новай праўды на нашай зямлі.
Прынясі ты нам промень сьвітаньня,
брацкай згоды — вялікай сям'і.

Ў нашым сьвеце цяпер невясёла,
поўна крыўды і бед нарасло;
прынясі нам Вялікае Слова,
што з пачатку у Бога было.

Мы шукаем ў муках дарогу,
зьнемагаем ў няроўным баю.
Прынясі ты над злом перамогу
і магутны спакой на зямлю.

М. Машара

(Беларускі Сялянскі Календар на 1939 год. Вільня, Выданне Беларускай Кнігарні „Пагоня")

**Прадказанні на 1939 год паводле астралёгіі й стогадовага календара**

Пануючай плянэтай у 1939 годзе ёсьць Марс — плянэта гарачая й гвалтоўная, людзям няспрыяльная. Гады Марса прыносяць няшчасьці й розныя забурэньні паміж людзей, асабліва ў тых краёх, каторымі плянэта Марс апякуецца.

*(Беларускі Сялянскі Календар)*

## Широка страна моя родная

З прыходам Чырвонай Арміі прыляцела ў наш край і „Кацюша”. Новая песня заваявала вялікую папулярнасць, асабліва ў паласе паміж Нарвай і Бугам, дзе дыслацыраваліся дзве арміі Заходняй Асобнай ваеннай акругі. Быццам песня напісаная для нас — ты лети за ясным солнцем вслед. Праўда, простая девушка з высокага берага, даўшы песні заходні кірунак, робіць круты паварот (пачула водгукі баёў на Халхін-Голе?) і прывітанне пасылае байцу на дальнем пограничье. Шалахвостка? Бывае. Наш „сцяпны арол” беражэ заходнюю граніцу. Так і спяваем. І самі пакрысе чуемся сапнымі арламі.

Тым часам Белавеж кішыць прыроднымі сцепнякамі. Мабілізаваных на вызваленчы паход ветэранаў замянілі кадравыя часці. Поўна нацменаў. *Мая-твая ніпанімая... Ни бельмеса!* Байцы мітусяцца на лугах, строяцца, з вінтоўкамі наперавес ідуць у лабавыя атакі; з крыкам „ура-а-а!”, доўгімі гранёнымі штыкамі поруць расстаўленыя ў ланцуг вучэбныя куклы.

І на нашым двары ваенныя. Занялі старую хату пад шавецкую майстэрню. Там і жывуць шаўцыбайцы. Мы перабраліся ў новую хату. Кватарант ліквідаваў краму і знайшоў іншую кватэру.

Ужо мы і ў БССР. Беларускі Народны сход, што сабраўся ў Беластоку, пастанавіў:

„Прасіць Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Савецкага Саюза і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, уз'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа”.

(Прынята аднагалосна на пасяджэнні 29 кастрычніка 1939 г.)

2 лістапада 1939 г. Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла Заходнюю Беларусь у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

12 лістапада 1939 г. Нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Панаехала „ўсходнікаў”. Займаюць кіраўнічыя пасты, папаўняюць парадзелыя тэхнічныя і настаўніцкія кадры. Наш войт, напрыклад, уцёк у Літву, кіраўнік школы падаўся за Буг, у „Губерніі” і загінуў. Пакінула Белавеж і пані Русінякова. Адзін Дронь застаўся.

З'явіліся і іншыя, зусім нечаканыя прышэльцы: у карычневай форме, з „гакэнкройцамі” на рукавах — сноваліся па Гайнаўцы,

запісвалі мясцовых немцаў на выезд у Германію. Недавучыўшыся рамяству, паехаў туды і наш аднакурснік Рыхард Сыкінгэр.

Але куды большыя эшалоны рушылі на Усход. 11 кастрычніка 1939 г., значыць, да Народнага сходу, яшчэ да ўсенароднага волевыяўлення, выйшаў з Масквы загад нумар 001223 аб дэпартацыі з вызваленай тэрыторыі антысавецкага элемента. У лютым 1940 г. гэтым „элементам" стала лясная служба, напаўпісьменныя гаёвыя, якія часта не разумелі нават прышытага ім кляйма. Так з нашага класа выбылі і лясунскія сыны. Апусцелі і белавежскія хаты. НКВД выконваў план са строгай паслядоўнасцю.

Ну, але гэта ўсвядомілі мы заднім розумам. У час вывазкі хтоніхто і ўцешыўся: павезлі гада, добра яму так, будзе ведаць як адбіраць у баб ягады. І беглі ў апушчаную лесніком хату. Хто столік, хто крэсла, а то і шафу — на плечы, і да сябе: пажывём па-панску.

І прыйшоў ліст з Паўночнага Казахстана. Пісала маміна шчарчэўская сястра Вольга Белазерская. Трапіла ў першы эшалон. Ніякая пані, ніякі „элемент", жонка гміннага пісара. Мужа забралі адразу, у верасні. Прапаў без следу. Цяпер у дзікі стэп вывезлі яе з дзяцьмі. Было над чым задумацца, наш бацька таксама „служыў".

Ён толькі вонкава не выяўляў сваіх пачуццяў. І раптам выбухнуў. У Белавежы адкрываліся лесаўпарадкавальныя курсы. Слесар з мяне атрымаўся марны. Вырашыў я паспрабаваць шчасця ў новай прафесіі. Папёр на Цэнтуру, дзе месціўся Заходнебеларускі падраён „Леспраекта" і склаў заяву. Праз нейкі час даведваюся: маю кандыдатуру адхіліў камітэт камсамола. Начальнік падраёна Чарнавусаў раіць схадзіць да старшыні сельсавета. Пайшлі ў сельсавет з бацькам. Загадваў ён базай сельпо і з мясцовым начальствам меў добрыя адносіны. Таму з парога і наступае:

— Чаму не дазваляеце сыну вучыцца?

Старшыня Пульянаў, як і Чарнавусаў, усходнік. Памяўшыся, б'е ў лоб:

— Солтысам быў?

— Быў.

— Ну, дык вось, сам бачыш...

Бацька мой ускалануўся:

— Дык карайце мяне! За што караеце сына?

Пульянаў не чакаў такога павароту справы. Здзіўлена паглядзеў на нас, затым перанёс зрок на столь, на ўзорыста размаляваныя сцены, нешта ўспомніў, усміхнуўся і... пагадзіўся:

— Ну так, у нас сын за бацьку не адказвае.

І паслаў мяне на заняткі. Пульянаў, у адрозненне ад нашых камсамольцаў, аказаўся на вышыні: чытаў Сталіна.

А бацька? Які волат!

І жах скрабянуў па сэрцы: каб толькі не выклікаў ваўка з лесу...

Будзе, што будзе. Сибирь ведь тоже русская земля. А пакуль-што Кацюша і Широка страна моя родная. Хоць і тут няўвязка: стаў гаспадаром неабдымнай радзімы, а за межы вобласці выйсці не мог. Ну, але гэта часовыя клопаты. Табе толькі васемнаццаць год, перад табой яшчэ многа лесов, полей и рек. Дык раней зведай абхопнае. У руках пашпарт і камандзіроўка да самай старой граніцы. З вясеннім ветрыкам, што над краінай вее, у дарогу!

Паверыў песні. С каждым днём всё радостнее жить. Прыліў высокіх пачуццяў выразна адчуў на лясістым беразе чарадзейнай Свіцязі, калі ўпершыню ўсплылі ў грудзях невыразныя гукі ўласнай дарожнай песні. Ды за спіною стаяла вайна. Яна і заглушыла маю ненароджаную песню.

## Звычайныя балахоўцы

А тым часам Белавеж праславіўся менавіта песняй. Захарчук, бадай пятлюраўскі палкоўнік (ну, хай падпалкоўнік) стварыў галава-кружны ансамбль. Нашы артысты сталі лаўрэатамі абласнога агляду ў Брэсце, затым пабывалі і ў Маскве, на ўсесаюзным аглядзе. Мне асабліва запомніўся саліст Смактуновіч, сын Івана (здаецца, і сам Іван) — тэнар, а таксама балетны дуэт: Тонька Смятаніна і Воленька Святлічная, мае аднакласніцы, цудоўная пара. Калі ўпершыню ўбачыў іх на сцэне, не мог паверыць, што гэта яны. Як матылькі пырхалі на пальчыках, здавалася, бязважкія, незямныя.

А і Захарчук праявіў свой сапраўдны талент. Да вайны быў звычайным балахоўцам. Недзе працаваў, у дзяржаўныя святы апранаў стальную форму і ішоў на парад. У эмігранцкіх тонкасцях ніхто ў нас не разбіраўся, усе рускамоўныя ненашы былі балахоўцамі. Ды і на парадах хадзілі яны ў адной (балахоўскай) роце. Засталіся адны палкоўнікі, радавых амністыя дваццатых гадоў вярнула на радзіму. Цяпер радзіма дабралася і да эліт. Дык служылі прекрасной як маглі. Напрыклад, Хведар Хведашчэня пайшоў у настаўнікі беларускай мовы і звіхнуўся: замест славіць Купалу і Коласа, усё даказваў, што Бога няма.

Магчыма, гэта была тактыка выжывання. Магчыма. Але стратэг з яго быў недальнабачны. Прыйшлі немцы, узначаліў беларускі камітэт: вярбуе членаў, а людзі пытаюць:

— А Бог будзе з намі?

Пытанне, пастаўленае ўпрытык да вярбоўшчыка, кранала і агульны боль. Пасля прыходу немцаў, уладу перанялі ў нас палякі. Магістрат польскі, у паліцыі палякі. Камендантам „Зубр", уласнік даваеннага рэстарана. Намарнавалі нашых, і ўсё пагражаюць: „Маўчы, робім новыя спіскі, хочаш трапіць туды!?" На абарончай ідэі і фармаваўся беларускі камітэт. Усё ж такі Хведашчэня быў смелы. І вязучы. „Зубр" спатыкнуўся на новых спісках: уключыў у іх і балахоўцаў. Яны і знішчылі яго. А з ім і польскае панаванне. Цяпер усю ўладу трымалі ў сваіх руках балахоўцы. І Хведашчэня ўздыхнуў. Пры данскім казаку Касіхіне можна было паказачыць і на камітэцкім палетку. Адкрыў кіёск з беларускімі выданнямі, узнавіў песенную традыцыю: прывёз беластоцкі хор з мілагучнай салісткай Мілёнушкінай, затым наладзіў канцэрт Забэйды-Суміцкага, адкрыў школу. Несумненна, здольны быў чалавек. І спрытны. Дагэтуль не магу ўцяміць, як яму ўдалося стаць палкоўнікам адроджанага Войска Польскага. Герой! А да вайны быў звычайным балахоўцам, гандляваў старымі гумавымі пакрышкамі, абуваў белавежцаў у вечныя лапці.

Злосная іронія лёсу: ваенную кар'еру спыніў недаспелы лапатнік (здагадваюся, хто), які на бліскучага камандзіра надзеў маску ворага.

Было лета. Варшава. Аформіўшы ў Міністэрстве вышэйшай адукацыі вяртанне з Масквы, іду Кракаўскім прадмесцем. Насупраць, у пацёртым форменным фрэнчы, крочыць масіўны дзядзька. Паходка вайскоўца, але пагоны без зорак, грудзі пустыя, галава долу. Хведашчэня! Прайшоў міма, не пазнаў. Вяртаўся з турмы?

У акупацыйную ноч, такім жа прыбітым, уварваўся ў нашу хату:

— Захарчук забіты!

За немцаў балахоўцы падзяліліся. Адасобілася ўкраінская група, якая стварыла нацыянальную арганізацыю. Быў у ёй і Захарчук. Падзяліліся фармальна. Засталіся ранейшыя сувязі і дружба. Асабліва, калі была нагода выпіць за кошт сябра. А Захарчук любіў заглядаць у кілішак. Аднойчы заблудзіў да нас. Бацька быў солтысам. Польская адміністрацыя, захапіўшы ўладу, вярнула і старых солтысаў. Так і засталося, хоць бацька два разы сядзеў У гестапаўскай гасцёўні. Першы раз пасадзілі палякі, а другі раз Хведашчэня. Летам сорак першага немцы спалілі Буды, буднікаў вывезлі ў Беласток. Бацька быў адказны за жніво ў будніцкіх Цераміскаx. А ў гэты час Сталін выдаў загад: нічога не пакідаць немцам на полі. Скошанае жыта згнаіў дождж. Выйшла, па загаду Сталіна і пад кіраўніцтвам застаўлянскага солтыса. А Хведашчэня абвінаваціў апальнага солтыса ў байкатаванні

нямецкай палітыкі: бацька не ўступаў у камітэт і іншым раіў кіравацца ўласным розумам.

У абодвух выпадках ратаваў Гэнчаль, мясцовы немец. Вядома, за сала. Сам ратавальнік загінуў ад партызанскай кулі. Працаваў на вузкакалейцы. Ехаў у мірным рабочым вагончыку, а тыя шалапуты ўзялі і абстралялі. А бацька надалей салтысаваў, немцы і на солтысах даказвалі трываласць улады. Дык па няпісаным законе абавязкам солтыса было гасцяванне немцаў. А паколькі балахоўцы лічылі сябе апорай нямецкай улады, логіка падказвала не абмінаць і іх.

Кульнуўшы чарку, Захарчук адчуў прыліў рускага патрыятызму: зняў са сцяны Колеву гітару, ударыў па струнах і пачаў спяваць:

Много песен про Волгу пропето,
Но еще не сложили такой,
Чтобы солнцем...

Тут устрапянуўся: слова з песні не выкінеш, а там грэе сонца „советское”! Не прайшло яно праз горла ўчарашняга паклонніка, наступіў на песню і кульгануў наспех скалочаным радком:

... русским согрета
Зазвенела над Волгой-рекой.

І з уздымам:

Красавица народная,
Как море полноводная,
Как родина свободная,
Широка, глубока, сильна!

Тут чамусьці ні на хвіліну не замяўся. Правяраў нашу рэакцыю? Мы здзіўлена маўчалі.

І ўжо ён мёртвы. Сёння гарэлачны нюх завёў яго да Косці Габца, суседа Хведашчэні. У Габца быў госць, лоўчы, у якога Косця працаваў конюхам. Гэты лоўчы і за Польшчы ведаў белавежскімі паляваннямі. У час высокасаноўнай пальбы апякаў Герынга. У 1939 г. знік. Цяпер аб'явіўся ў нямецкай форме.

Ці і ў Габца Захарчук выступіў з нейкай каверзай? Хроніка маўчыць. Вядома толькі, што лоўчы хапіў за пісталет і скочыў да Захарчука. Захарчук у ногі, і да Хведашчэні. Украінскі лідэр шукаў ратунку ў беларускага старшыні. Немец дагнаў Захарчука і палажыў трупам

на парозе Хведашчэневай хаты. Трагічна абарвалася песня нашага чарадзея. Кажуць, Захарчук прадчуваў смерць: у гэты дзень па забыўчывасці пакінуў дома нагрудны крыжык, які, выпраўляючы на вайну (тую, першую) падарыла маці.

Лоўчага адправілі на Усходні фронт. Косцю Габца з сям'ёй вывезлі ў Беласток.

## Краты, пацукі, тхары

Сідар працаваў па натхненню. Прыходзіла яно нечакана. Ляжыць Макацёр на сонейку з задзёртай уверх барадою, у лятучых хмарах выцікоўвае дзівосы, ажно нешта зашамацела ў нагах. Крот! Сляпак, уцёршыся мызкай у голыя пяткі Сідара, павярнуўся назад і, туп-туп, рэціруецца ў бок шопкі, адкуль і прытэпаў. Паляўнічай страсцю загарэліся Сідаравы вочы. Краты ачапілі рыхлымі капцамі ўсю хату, і колькі Сідар не намагаўся, не мог вытурыць звяркоў з аблогі. А тут сам захопнік выпаўз з нары. Не нацешыўся як след белым светам. Дагнала крата Сідарава нага і надзейна прыціснула да зямлі. Ляжыць млекакормячы сваяк уверх лапкамі і не дыхае. А лапкі такія далікатныя, а брушка такое пушыстае, а мызка такая сімпатычная, і абыякавасць да лёсу дзіўная. Жаль варухнуўся ў Сідаравым сэрцы, і спрацавала думка, і ўзніклі памінальныя радкі:

Крот-Кратовіч не астыне,
Ён ахвотаю гарыць —
Пакуль ногі не адкіне,
Пад табою будзе рыць.

— У кратоў, як у людзей, той жа нораў, — кажа Сідар. — Дарма Дарвін даказваў, што мы зышлі з дрэў. А па-мойму, адзін зышоў з дрэва, другі выпаўз з нары, трэці спусціўся з неба.

Тут Сідар зрабіў шматзначную паўзу, агарнуў позіркам купчасты двор і, занава ўвайшоўшы ў тэму, працягваў:

— У кожнага звера людское падабенства. А хутчэй наадварот. Жыве сусед — ненасытны воўк, вораг азлоблены. А выцягне ногі — чалавек. Як той крот. Кажу табе, узірайся ў людзей, і ў кожнага цывілізаванага прымата адкрыеш звярыныя рысы.

У чаканні апладысментаў Сідар бездапаможна развёў рукамі і, уздыхнуўшы, дадаў:

— Карысны занятак...

І я ўзгадаў Кенігсберг. У фабрыцы нада мною стаяў стары прусак Рудзі, выліты пацук. Не толькі з вонкавага выгляду. Як еў свой Frühstück, дык не спускаў з мяне злога пацучынага позірку. Давіўся намасленым дротам, але ніколі скібачкі не даў. Я і не чакаў ад яго гасціны, толькі ўцяміць не мог, чаму ён у час яды асабліва цікуе за мною. Бачыў у маіх вачах воўчую аскому? Баяўся за свой харч?

Гомасапісты пацук паслядоўна разбураў ува мне чалавечую годнасць. Патрэбны яму свердзел — komm mit! — цягне з сабою праз усю фабрыку ў інструментальную кладоўку — ён наперадзе, я за ім. Вяртаемся ў тым жа пастраенні, толькі ён крочыць з заложанымі за спіну рукамі, як пан, а я іду з апушчанымі вачыма, як прысаромлены паяц, у руцэ маёй „кляймо" — інструмент: можна б улажыць у нагрудную кішэнь, дык не, нясі ў руцэ, каб усе бачылі тваю ролю. Падкрэслена грукаю катаржнымі Holzschuhe. А грукай уволю. Таксама мне пратэст...

Вялікую насалоду атрымліваў Пацук з майго ўпадку. Ад ягонага здзеку і я абяртаўся ў нелюдзя — вынайшаў дзікую расправу, вызначыў тэрмін і месца пакарання, і чакаў, чакаў, чакаў...

Падзеі разгортваліся ў належным накірунку, перш за ўсё на Усходзе. Чырвонасцяжная наганяла непрыстойны страх на звышчалавекаў. Клічнае Heil Hitler! злілося ў нечленараздзельнае „Гайлітля" і, замест узнімаць нямецкі дух, азадачвала. Мы, сіўсляндэры, з непрыхаванай радасцю сачылі за метамарфозай і, з адчуваннем сваёй перавагі, мацней націскалі на наш пароль: Hitler kaputt!

Цівуны прыкінуліся глухімі і быццам падабрэлі. Адзін Пацук касавурыўся і трымаўся ранейшага курсу. І я не вытрываў. Паўздзейнічаю на твае, спыненыя ў развіцці, мазгавыя звіліны. І загнаў Пацука ў кут, а дакладней — прывёў (komm mit!) да пад'ёмнага крана, з дапамогай якога абрабляў я кавальскія матрыцы, і выявіў свой сакрэт:

— Слухай, Рудзі, хутка сюды прыйдуць рускія. Калі не станеш чалавекам, надзену цябе на гэты кран — круком пад бараду — і сканаеш уверсе пад рогат аўсляндэраў.

Ганебную смерць прыдумаў свайму ганіцелю. Пацук аж рохкнуў (чамусьці па-свінячы). Ад празмернай дозы допінгу? Зразумеўшы, што я не зрар'яцеў, Рудзі абмяк. Уцёршыся ў мяне жывёльнымі вачыма, кажа:

— Я не баюся рускіх...

Ах, вось як! Дык ты можа і чакаеш іх?

— Warte mal! — не даю яму аддыхацца. — А сын твой дзе? На ўсходнім фронце. І што ён там робіць, як думаеш?

Павесіў Пацук мызу і маўчыць. Урэшце адзываецца, зусім як чалавек:

— Ну добра, ідзі — гуляй...

Такім чынам, хаваючыся ад шуцпаліцаяў, а перш за ўсё, уцякаючы ад іх пякучых дубінак, я і прагуляў ладны адрэзак прымусу. У склаўшыхся абставінах мой метад уздзеяння на пацучыную наравістасць наглядчыка здаваў экзамен, але папахваў дыскрэдытацыяй (хаця і несвядомай) савецкай законнасці, таму карыстаўся ім з аглядкай (кланяўся гайнаўскі чэкіст), і толькі ў крайнім выпадку, калі Пацукова памяць пачынала даваць збой. Я вяртаў яе лагодным канфідэнцыяльным шэптам:

— Bald Krieg zu Ende.

Пацук, калі выходзіў з ролі цівуна і ўглыбляўся ў сваю працу, быў нармальнай чалавекападобнай асобінай; весялеў, і авалодвала ім цяга да песні. Звычайна, спяваў пад нос папулярны куплет:

Geht alles vorüber.

Geht alles vorbei...

Практычна, гэтымі двума радкамі і вычэрпвалася ягонае песеннае майстэрства, бо канчаў песню неўразумелым:

Na na-na na na-na.

Na na-na na-na...

І так гнаў час, круг за кругам, аж да знямогі. Сярод немцаў Рудзі слыў нават веселуном. Прыходзіў на працу напаўсонны, у апошнюю хвіліну. Матляў камэрадам рытуальнае, на наўзмах рукі, „Гайлітля” і, набраўшы ў ноздры цэхавага паветра, пачынаў круціць сваю катрынку.

Толькі аднойчы спазніўся. Увайшоў у цэх непераапрануты, увесь у чорным, з выцягнутым ад болю тварам. Перагаварыў з майстрам і пайшоў у раздзявалку.

— Што здарылася? — пытаю ў набліжанага да майстра падмятайлы-француза.

— Sohn kaputt! — адказвае.

Загінуў недзе пад Курскам. Вярнуўся Рудзі, ужо ў рабочай вопратцы, разлажыў інструмент, узяўся за працу. Настаўляю вушы. І што чую?

Geht alles vorüber...

І абрываецца песня. Вярнулася памяць.

Больш я не страшыў Пацука адплатай. Балазе, у ягоных чалавечых пачатках адкрыў абнадзейлівую слабінку. Рудзі — заядлы курэц, а картак на тытунь не хапае. А ў мяне бацькаў самасад чакае карыснага рэйтынгу. Што, калі падсілкую ім Пацука? І я, у чарговы

прыступ Пацуковай амнезіі, сыпнуў яму пад вочы дробку прагнага ласунку. Пацук набіў самасадам трубку і, зацягнуўшыся белавежскім дымком, ухваліў:

— Gut Tabak!

А я ўспрымаю:

— Scheisse Arbeit! Гуляй!

У час „шайсавых" прагулак — і пераліў я сваю нянавісць з Пацука на карычневых тхароў. Буравата-жоўтую форму насіла фабрычная стража. На гэту погань не было сродка. Найлепшы — зашыцца ў непралазную нару. І мы з Міхасём Харкевічам, маім сябруком, знайшлі, як нам здавалася, такое месца — на даху фабрыкі. Прабіраліся ў схованку праз цёмную вертыкальную бездань, па нейкіх дзівосных выступах, уладкоўваліся пад комінам і давалі храпака. Ды карычневыя тхары і там нас вынюхалі. Шчасце, наша чуццё падказала трымацца коміна: калі па сонных целах загулялі паліцэйскія палкі, мы не паспадалі з даху і праз апраметную вертыкаль цэлымі эвакуіраваліся ўніз.

Прыдатным сховішчам з'яўлялася аўсляндэрская прыбіральня, ды ў ёй занадта „пахла" — тут вытрымлівалі самыя вынослівыя. Іншая справа — нямецкі Klosett: беленькія адзіночкі з унутранымі зашчапкамі, чысціня, камфорт! Аднойчы Міхась, куды спрытнейшы за мяне, апанаваў мару, пранік у запаветную кабіну, зашчапіўся, асядлаў ракавіну... і заснуў. Прачнуўся сярод ночы і не адважыўся выйсці. Так і кляваў у пастцы да дзённай змены.

Вясной сорак чацвёртага спынілася ўсялякая сувязь з домам, набліжаўся фронт. Пацук, не атрымаўшы належнай нікацінавай дозы, пачаў раздражняцца. Урэшце прадаў мяне ў фабрычнае пекла — ліцейны цэх. Відаць, баяўся трымаць „вешацеля" паблізу. А ў пекле, як у пекле — толькі чэрці і грэшнікі. Ну і пакута. Тут і Рудзі выдаўся анёлам.

Калі Чырвоная Армія брала штурмам горад-крэпасць Кенігсберг, не шукаў я ні чарцей, ні тхароў, і тым больш — Пацука. Стараўся, як мага хутчэй, выбрацца з калапсуючага пруcкага логава. За горадам, на першым развілку, уразіў труп у цывільным, а перш за ўсё — пляскатая, утаптаная жалезнымі гусеніцамі ў зямлю, галава. Вастракутны профіль, знаёмы абрыс пацукападобнага твару. Ці гэта быў Рудзі — не ведаю, глянуў на труп мімалётна, брыў у патоку, такіх жа як і сам, вызваленых рабоў III Рэйха, але расплешчаная танкам галава засталася ў памяці назаўсёды — дыхала дзіўным спакоем. Той жа спакой застыў і на тварах палоненых вермахтаўцаў, якія, пастроеныя

ў калону, са сваімі афіцэрамі наперадзе, спешным маршам міналі нас. У кожнага, замест зброі, тырчэла пад пахай буханка хлеба.

Толькі духмянага дабра панеслі! — чапляюся незамацаванай думкай за пагоджаных з лёсам ваякаў. Я, колькі дзён не нюхаўшы хлебнага паху, убачыў фантастыку. І не чуў да немцаў ні крыўды, ні злосці. Павалены вораг займеў чалавечыя рысы.

Як Сідараў крот.

## Стебень, гребень, рукоятка

Фантасмагарычна загрукаў па ковенскай упадзіне маршрутны поезд. І я вырваўся з учэпістых абдымкаў аб'ектыўнай рэчаіснасці. Сяджу ў таварняку на верхніх нарах, адзіны чупрыністы салдат сярод стрыжанай братвы. Захаваная чупрына — адзнака кенігсбергскай вольніцы, успамін зімоўкі здалёк ад пільнага каманднага вока.

Уяўленне выклікае памкамузвода, старшага сяржанта Каваля. Здзіўлена глядзіць на мяне. Вясною сорак пятага, на гумбіненскім палігоне, да сёмага поту выганяў з нас, нядаўніх нямецкіх арбайтараў, рэптыльную псіхіку, укараняў у адубелыя ад палачнага парадку галовы свядомую дысцыпліну. Меў вялікую ўладу. Але не злоўжываў службовым становішчам.

— Товарищ старший сержант, разрешите выступить со строя.

— Па какому?

— По тяжелому.

— Ступайте.

А мог і не дазволіць.

— Товарищ старший сержант, разрешите выступить со строя?

— По какому?

— По легкому.

І тут памкамузвода, хвіліну павагаўшыся, дазваляў збегаць у кусты. Важна — рапартаваць четко і па правілах, ні слова ўпоперак. Някемліваму лодзінцу Пуцьку, пэўна, дагэтуль сняцца стебень, гребень, рукоятка — дэталі замка, якія чамусьці трэба было запомніць у такім парадку да канца жыцця. Я, як бачыце, запомніў. А з Пуцькам атрымалася няўвязка. Ніяк не патрапіў вывучыць трохчленнай формулы. Замест рукоятка, вымаўляў — рукавіца. Хоць ты яго забі. Клаліся ад смеху. Але пры іншай Пуцькавай вадзе, да „смеху" далучылася і „гора". Пуцька махаў рукамі не па правілах: разам з левай нагой выкідаў і левую руку, з правай — правую. Усе намаганні выкараніць дурную звычку не далі выніку, і старшы сяржант пакараў Пуцькам увесь узвод — налажыў дадатковую муштру. Пасля заняткаў

полк адпачываў, а мы, на казарменнай плошчы, да знямогі адпарвалі пяткі.

— Левай, левай...

А Пуцька сваё: бокам, бокам... Во рукавіца! І як ён, лодзінец, трапіў у Чырвоную Армію? Бралі ж толькі з былых усходніх ваяводстваў, што пасля трыццаць дзевятага апынуліся ў межах СССР. На фільтрацыі не пашанцавала? Усходняя Прусія выслана магіламі чырвонаармейцаў. Фронт рашэціўся. Папаўненне далёка. Можа бралі і з Лодзі. Ніколі з Пуцькам аб гэтым не гаварыў. Дый выбіць з яго нешта талковае было цяжка. Толькі выпучыць лунацічныя вочы і недзе блукае па-за табою. Ні да чаго цікавасці не меў.

Старшы сяржант Коваль — беларус, партызаніў, і да мяне, заходніка, ставіўся па-зямляцку.

— Пацярпі, хутка пойдзем у беларускае войска, — суцяшаў. Хадзіла такая чутка. Ды, відаць, беларуская армія палегла пад зялёным сукном ваенных планавікоў. А мо аб'яднаныя нацыі і без узброенай сілы вырашылі прыняць Беларусь у свой гурт? Так яно было ці не, а мой сяржант, як і раней, недзе пад Гумбіненам вырошчвае цукровыя буракі, а мы з Пуцькам перасякаем Нёман, імчым у базавую часць Беларускай ваенай акругі, на невядомую станцыю Прыбар. Адтуль раз'едземся па сваіх хатах. І я, як у казку, узіраюся ў зялёную ковенскую чашу — і бачу Белавеж.

### Давай, давай!

І прачынаюся на сумежжы явы і сну. На нарах стрыжаныя бавяць час казкамі. Усе казачнікі, і ў кожнага ў запасе свая казка. Які народ!

Успомніўся бялявы, мізэрнага росту (відаць, комі) яфрэйтар, камандзір аддзялення. Як кожны камандзір, глядзеў на падначаленага праз прызму свайго рангу. Прызма паказвала рослых у крывым святле. Настаўлена па волі лёсу знізу, замест адданасці, фіксавала грэблівасць. І яфрэйтар умеў аддзячыць. Мне, правафланговаму, які, хацеў я гэтага ці не, зыркаў на свайго камандзіра звысоку, даставалася найбольш. Асабліва, калі, замест на Японію, загналі нас пад польскую мяжу, недзе насупраць Вэнгажэва, палоць цукровыя буракі. Тут то я і спазнаў смак вызваленай працы. Спалі ў суткі гадзін чатыры. За цямна ішлі ў поле і ў поцемках вярталіся ў размяшчэнне. Увесь час у дугу сагнуты. Адазваліся ранейшыя болькі ў крыжы, адгукнулася і зіма, праведзеная ў разбітых снарадамі бараках — на маіх худых грудзях атабарыліся скулы: гімнасцёрка сноўдалася па іх і

яны неміласэрна пяклі. Санінструктар бездапаможна раскладае рукі, нічога не мае на мой клопат, шпіталь далёка. А над спіною зацюканы яфрэйтар:

— Давай, давай!

Я, цярэбячы радок, безнадзейна адставаў ад шэрагу. На мне і канцэнтравалася ўвага цівуна. І раптам, як гэта бывае ў казках, зышло азарэнне. Яфрэйтар не толькі цікуе за маім радком, але і цікавіцца небам. Знудзіўшыся цівунствам, задзірае ўверх кірпаты нос, быццам нешта вынюхвае ў аблоках. Дык я яму прачытаў лекцыю пра масу згусцелай вадзяной пары. Яфрэйтар пакасіўся на мяне іранічна і заняўся выраўноўваннем строю. На другі дзень, пагаўкаўшы ў каторы раз, прысеў у разоры: як бы разлічваў на працяг учарашняй гутаркі.

І я, як умеў, пачаў раскрываць неба. Я ж ад школьных год нябесны вандроўнік, рабіў для свайго ўжытку адмысловыя астранамічныя карты, лізнуў і Фламарыёна. Расказваю і здзіўляюся: мой яфрэйтар не ведае нябеснае азбукі. Я яму талкую пра наш зямны караблік і нашы круізы вакол сонца, а ён толькі выгуквае:

— Ну ты даёшь!

Урэшце, прыкмеціўшы, што я страшэнна адстаў ад аддзялення, да таго — адлажыў матыку і, як роўны з роўным, сеў побач, яфрэйтар вяртаўся ў рэчаіснасць і, з наступальным вокрыкам „Давай, давай!", у ранейшым стылю вяршыў службовы абавязак. З адной розніцай — адпачываць прыходзіў да мяне.

— Ну, давай новую казку, — прымірэнча ні то патрабаваў, ні то прасіў.

Во як! Мая касмалогія — казка. Я не аспрэчваў высновы яфрэйтара (приказ командира — закон солдату), баяў пра Месяц, Сонца, сонечную сістэму, Млечны шлях і памежныя галактыкі. Сам уваходзіў у азарт, і гімнасцёрка не муляла, і толькі чуў:

— Ну ты даёшь!

Здавалася, з багатага рускага слоўніка, яфрэйтар выбраў для карыстання толькі адно слова — „даваць", скланяючы яго на розны лад, у залежнасці ад абставін. Як бы там ні было, але я атрымліваў добры перадых: не смыліў крыж, не пяклі грудзі. Ды ганяцца за далёкімі галактыкамі не хапіла ведаў, скончыліся казкі і я, хвілінны небажыхар, прачнуўся на абсурднай зямлі.

— Давай, давай!

## Прыдурак

Магчыма і ў абсурдзе ёсць нейкая логіка, казачны пачатак і канец. А мо само жыцце — казка? Калі яфрэйтар і скулы прыцiснулі мяне ўпрытык да прускай зямлі і ў маёй галаве пасяліліся чэрці, тут як тут з'явіўся ухарь-купец, у выглядзе камсорга роты з трыма лычкамі на пагонах. Шукаў мастака. І я ў адчаі кінуўся ў яго абдымкі. Стаў ротным прыдуркам.

Першае баявое заданне, якое даў мне камсорг, было мастацкае афармленне насценгазеты. Ці трэба гаварыць, з якім энтузіязмам ішоў я на гэты подзвіг! Роўны салдацкі шэраг; бадзёрыя твары, на правым плячы матыкі, наперадзе стройны камандны састаў, радкі пародзістага бурачніку, а паміж імі — натхняючае слова.

— Нарэшце маем сапраўднага мастака! — камсорг з задавальненнем пацірае рукі. Выявіў, у майго папярэдніка не атрымліваліся людзі. А людзі вырашаюць усё. Таму і пагналі пэцкаля.

Бачу, і ротны ўхваляе мяне, і салдаты пазнаюць сябе ў пастэльнай шарэнзе. Назіраю, слухаю, а на душы шкрабуць кошкі. Калі камсорг вёў мяне на камандны пункт роты, па дарозе бачыў я шмат розных, распісаных папярэднікам, арыенціраў. Мне не па сіле такое ўмельства, хоць і навучыўся пры бацьку карыстацца алейнай фарбай. Ці мой раптоўны ўзлёт не абернецца ў ганебнае прызямленне? Замаячыла на даляглядзе бурачнае поле. Якую вышыню давядзецца браць заўтра? На казарменнай плошчы ў Гумбінене вісела тройца: Рузвельт, Сталін і Чэрчыль. Тут, відаць, абмяжуюцца галоўнакамандуючым. Гэта паўбяды. Ёсць нейкі вопыт. За саветаў, пры дапамозе сеткі і цыркуля, нарысаваў я партрэт Варашылава. Веди нас в бой, товарищ Ворошилов, луганский слесарь, боевой нарком. Вісеў у хаце на ганаровай сцяне. Спраўлюся і са Сталіным. А што будзе, як атрымаю заказ на партрэт камандзіра роты? Фатаграфіі, пэўна, не мае. Давядзецца пісаць з натуры.

Дарэмна сушыў мазгі. Насценгазета прыцягнула ўвагу батальённага старшага пісара. Спадабаўся яму мой почырк, і на другі дзень, загадам камбата, трафейнай двухколкай даставілі мяне ў штаб батальёна. І я стаў пісарам. Ці ж не казка?

Лёгкая служба, добрае жытло, камандзірскі харч зрабілі сваё: счэзлі скулы, перастаў дакучаць крыж, і я выпрастаўся — і целам, і духам. Нават паходная жонка смершаўца, адзіная залётная птушка ў абясптушанай зоне, дарыла мне залётныя позіркі. Ды ад іх было страшнавата. Сюд-туд асабіст вылузваў з маскіровачнага шкарлупіння планавыя арэшкі. З'явіцца пануры эскорт, ні адазвецца, ні гляне ў

вочы, за каўнер — і ў дальнюю даль. І не ганяецца за ахвярай. Сама прыйдзе. Па выкліку, ведаючы, куды ідзе. Нават Стральцова ўзялі, гордасць усяго батальёна, кавалера ордэна Славы, ударнага байца бурачнага фронту. Без пагонаў і ордэна, абмяклы, пабялелы, з падкошанымі нагамі, як ты мне ўрэзаўся ў памяць, дабравольна здаючыся хапунам. За што ўзялі чалавека?

Ажно прыехалі купцы з паветраных сіл. Разлажыў я перад імі персанальны спісак і цікую, каго возьмуць. Ах, каб мяне! У сорак першым, калі я з азартам перавыконваў нормы, даследуючы наваградскія лясы, начальства абяцала паслаць мяне на курсы аэрафотаздымкі. Вось тады размахнешся! Я — за размах. Вернецца мроя?

А купцы бягуць зрокам па спіску, кожны па сваёй дарожцы. Той, што сочыць за адукацыяй, асабліва стараецца. Здагадваюся, графа найважная. І калі сярод „овых” паказаўся „цкий”, чарую: „Спыніцеся!” І спыняюцца на маім прозвішчы. Абменьваюцца позіркамі. Двое ківаюць галовамі ў знак згоды, а трэці тыцкае пальцам у „сваю” графу: „Быў у акупацыі”. І я абліваюся потам. Я — трэфны! Купцы далей робяць сваё, а мне ўжо не да справы. Хоць і прыгожы ў памкненнях, ды Масква слязам не верыць. Супакоіўся, калі купцы ад'ехалі, так і нікога не выбраўшы. Увесь батальён быў трэфны?

Усвядоміўшы тупіковую рэчаіснасць, пачаў я шукаць разумнае выйсце. Пачуцці кіравалі ў Белавеж. А адтуль ні слыху, ні дыху. Ці хоць усе жывыя? Бацька ж быў солтысам, больш трэфны чым я.

Розніца выбару была малая, і я, абы хутчэй выбрацца з прывіднай зоны, стаў палякам і падаў заяву на рэпатрыяцыю.

## Восень, зіма, вясна

Казка абрываецца. Прафілактычна полячков знімаюць з братняга памежжа і адпраўляюць далей ад граніцы, у горад Тапяу. Тут, у артылерыйскім складзе, і сустрэў свой зорны час наш Пуцька. Ноччу, стоячы на варце, палажыў у гразь камандзіра часці, які вяртаўся з афіцэрскай папойкі. Выцверазеўшы, камандзір вынес Пуцьку падзяку. Вартаўнік трымаўся правіл вартаўнічай службы. І Пуцька стаў узорным салдатам.

Пра ягоны ўзлёт даведаўся я з другіх вуснаў, сам у той час разам з малодшым сяржантам Паўлам Тумашам сцярог боепрыпасы ў Кёнігсбергу, за сорак кіламетраў ад падзеі. Восень, зіму і вясну правёў на партовай ветцы галоўнага вакзала, на левым беразе Прэголі. Па той бок ракі мая Wagon-Fabrik. Яе не відаць, засланяе партовая інфраструктура. А ісці праз узарваны мост далёка. І на патруль

можна напароцца. Але не вытрываў, пайшоў. Дзеля фасону, замест свайго бушлата, апрануў сяржантаў шынель з двума блішчастымі лычкамі, выкраенымі з кансервавай бляшанкі. Шынель, хоць закароткі, але надзейна прыкрываў датла працёртыя на седаўцы нагавіцы. І сяржантава шапка з чорным аколышам, замест вылінялай байцоўскай пілоткі, надавала адпаведнага значэння. Кірзачы і да гэтага ў мяне былі, здабыў у час пісарскай службы.

Падышоў пад фабрыку — цэлая. Уваход з эстакады, што пралегла над пуцямі станцыі Ratshoff. Іду верхам — мёртвая цішыня. Вось і знаёмыя лесвіцы ўніз. І казка! З усходаў выходзіць асістэнтка нашага майстра (начальніка цэха). Якая сустрэча! За два гады працы не замяніў з ёй ніводнага слова, глядзела на „аўсляндэраў”, як на смуроднае паветра. А тут уліпла, вачэй адарваць ад мяне не можа. Убачыла з'яву. Пабялела. Вітаюся. Падае руку. Рука як рука, нічога звышчалавечага. Упершыню пацiснуў нямецкую руку. Не бойся, кажу. Дзе майстар? Не ведае. І пра іншых знаёмых немцаў нічога не ведае. Дык будзь здарова! Не дрыжы. Не спытаў нават, чаго заходзіла ў фабрыку. І сам не ступіў на глухую фабрычную лесвіцу. Пайшоў у пусты горад. Вуліца да нашага лагера забітая дошкамі. Побач нямецкая цырульня. Зайшоў. Расшпіляючы шынель, успомніў працёртыя нагавіцы. Рэціравацца было позна, як на плаху сеў у крэсла і прыкінуўся, што не чую сцішанага нямецкага хіхікання. Падстрыгала немка. Таксама дзіва.

Значыць, казка не абарвалася. Разам са мною трасецца ў таварняку, хоць і на Усход, але бліжэй да хаты.

У Прыбары агромністая лясная зямлянка. Камарыны рай! Бараніліся ад насякомых дымам. Нары з бярозавых круглякоў муляюць бокі. Ледзь сагрэў на бярвенні месца, як камандзір акружнога артсклада, перад адпраўкай у Польшчу, вырашыў паказаць мне Матушку-Расею. Разам з напарнікам, прымацаваны да малодшага лейтэнанта Куліка, працягваў я спыненую казку на Усход. Везлі мы ў Сызрань, у цэнтральную артылерыйскую базу, нейкія дакументы. Дарога далёкая. Мы, радавыя, на верхніх полках, пад самай столлю, афіцэр пад намі, заўсёды навідавоку. У яго дакументы, у нас вінтоўкі. Акружэнне мірнае, дык наслухаўся казак. Які народ, усе казачнікі!

Прыпынак у Маскве. Першы раз у жыцці пракаціўся ў метро. Але гэта было пасля. Найперш камандзір пакінуў нас на Кіеўскім вакзале, а сам паехаў да девушки. Я, тым часам, прамяняў на рублі сапсуты гадзіннік і ледзь не трапіў на губу. Забыў, дзе знаходжуся. У Кёнігсбергу прыняў пастанову не аддаваць чэсці рангам ніжэй палкоўніка. Там была вольніца. Пастанова ўвайшла ў кроў. Тут, на

тлумным вакзале, не прыйшло нават у голаў сачыць за афіцэрскай драбязой. Дык высачыў мяне маскоўскі падпалкоўнік:

— Салдат, чаму не аддаяце чэсці?.. Чаму каўнер расшпілены?.. Чаму валасы не па норме? Чаму швэндаецеся па вакзале?..

І павёў мяне на прывакзальную камендатуру. Найбольш балела: састрыгуць валасы. Ля дзвярэй ваеннага каменданта падпалкоўнік загадаў мне чакаць, а сам увайшоў усярэдзіну. Буду я цябе чакаць, гарнізонная дубіна.

Вярнуўся да напарніка, улез у бушлат, нацягнуў на вушы пілотку: знойдзе — прыкінуся прыбалтам:

— No supranto!

Але службіст не знайшоў расхлябанца. Затое знайшла мяне девушка малодшага лейтэнанта. Відаць, па няформенных валасах. Даведаўшыся, што камандзір пакінуў на вакзале салдат, перадала кавалера пад апеку браціхі, а сама з сяброўкай прыехала да нас. І мы, з сімпатычнымі масквічкамі, прыемна бавілі час, пакуль не прыехаў надуты камандзір і не сапсуў нам добрага настрою.

Ці ведаў я, што праз чатыры гады гэты вакзал стане маім сталым перасадачным пунктам у штодзённых маршрутах Перадзелкіна-Масква, і тут, на вакзальных лавах, спазніўшыся на апошнюю электрычку, правяду не адну ноч?

У Сызрані доўга не затрымаліся, і крутнулі на поўдзень, у Данбас, на радзіму малодшага лейтэнанта. Па дарозе бачыў дапатопную карціну: казакі аралі зямлю жанчынамі. І пачуў ад калгаснікаў ашаламляльнае прызнанне: хвалілі акупантаў. Немцы падзялілі калгас на самастойныя брыгады — і людзі ўздыхнулі, палегчала.

Вяртаючыся з камандзіроўкі, на гомельскім вакзале прыстала цыганка:

Ой, салдацік, маю для цябе важную вестку! Дай руку!

Спакусіла. Найперш адгадала склад сям'і, затым запэўніла: у канцы месяца буду дома, і жыцьму (ха-ха!) дзевяноста год.

Чаго салдату больш трэба? Узняла настрой. І прадказанні збываюцца.

На другі дзень, у Прыбары сабралі палякаў, выдалі сухі паёк, знялі з нашых гімнасцёрак пагоны, адшпілілі з нашых пілотак зоркі, забралі ў нас ваенныя кніжкі, выдалі нам эвакуацыйныя пасведчанні і сказалі чакаць далейшых распараджэнняў. Праз нейкі час з'явіўся высланы малодшы лейтэнант Кулік, пастроіў нас, завёў на станцыю, пасадзіў у вагон і праз Палессе павёз у Брэст. На маім эвакуацыйным пасведчанні № ДЭ 29996, выстаўленым у сакавіку, пячатка Выезд з датай 21 мая 1946 г. Выезд аформіў малодшы лейтэнант. А поезда ў

Польшчу няма. І ніхто не ведае, калі будзе. Дык праважаты назначыў мяне старшым, а сам адправіўся ў Прыбар. І добра зрабіў, даўшы нам волю, бо мы пасажырскага поезда не дачакаліся і я вырашыў пакарыстацца „гайнаўскім" вопытам: выкрыўшы на станцыйных пуцях транспарт бярвення, што ішоў у Польшчу, размясціў свой атрад паміж калодамі, і мы, неўпрыкметку, перасяклі дзяржаўную мяжу. Пры пячатцы Wjazd дата 26 мая 1946 г. У гэты ж дзень дабраўся я і да роднай хаты. Усе жывы і здаровы. Цыганка трапіла і з тэрмінам вяртання. Што будзе з жыццём?

Пакуль жывы, працягнем казку.

## Генерал і „фаршут"

Пасяліўся ў Белавежы генерал. Людзі кажуць, прыехаў з Познані. Купіў катэдж-пустастой, і наводзіць у ім свой парадак.

— Сенсацыя! — адгукнуўся на вестку Сяргей.

І сапраўды, дагэтуль у нас толькі нараджаліся будучыя палкаводцы. Канстанцін Ганчарук (1890), намеснік начальніка ўпраўлення і намеснік старшыні стралкова-тактычнага камітэта Чырвонай Арміі. Аляксандр Вашкевіч (1901), Герой Савецкага Саюза, заснавальнік і камандзір 5 пяхотнай дывізіі 2 Арміі Войска Польскага.

Белавежцы ў войску II Рэчы Паспалітай, як і большасць беларусаў, былі заложнікамі нацыянальнай палітыкі, служылі ў асноўным на захадзе краіны („Крэсы" цывілізавалі велікапаляне), вышэй трох лычак не ўзнімаліся; як правіла, вярталіся дамоў радавымі. Толькі Ванька Масэйчык, адзін на ўвесь Белавеж, стаў плютановым.

Ды ці ж лесунам вярэдзілі голаў лычкі, воінская павіннасць? З гэтым наогул не было клопатаў. Сон зганяў з вачэй страх перад дарогай. Дзёмка Грыпінін, які хват, у кулачных схватках не было яму роўных, а тут здаўся без бою. Прыйшоў пад Войнічаў бар і прылюдна выказаў сваю трывогу:

— Служыць, то служыць („уваткнуў" рытуальны чэляс у павінную седаўку), але як даехаць?!.

Во было пытанне! А ехаць жа, па цяперашніх рэйдах, смешная дыстанцыя — у Грудзёндз. Ды не да смеху было Дзёмку. Вандроўкі белавежцам яшчэ не сніліся, не вылазілі з Пушчы, павятовы Бельск за сямю гарамі. І раптам перад табою Варшава — чыстае пекла: вакзалы, трамваі, перасадкі. А сталічныя жулікі! Толькі чакаюць цябе, неабчэсанага, напаўкіламетра бачнага. Церпла душа навабранцу.

Бядуй, не бядуй, а ехаць трэба. Рэшту даспявала гарэлка:

Последний нынешний денёчек
Гуляю с вами я, друзья,
А завтра рано чуть светочек
Заплачет вся моя семья.

І ехаў — з музыкай і плачам. Так многія развіталіся назаўсёды. Хто галаву злажыў над Вартай, хто над Бзурай, хто над Санам.

У вайну шмат белавежцаў трапіла ў дывізію генерала Вашкевіча. Іншыя фарсіравалі Віслу і здабывалі Паморскі вал. Яшчэ іншыя пракладалі дарогу дахаты праз лівійскую пустыню і гарыстую Італію. Белавежскі след застаўся на сопках Маньчжурыі (Коля Каковіч), над Ла-Маншам і Нідэрландамі (Косця Цынкер). Рэдкія вярнуліся ў сваё гняздоўе.

Прыехаў Коля з унучкамі. Вось і вядзем малечаў на рэчку, на Жоўты пясочак. Пастаўнік зарос, зарасла і рэчка, чорным мулам занесла Жоўты пясочак. Не пазнаем месца, дзе прайшло наша дзяцінства. Нічога не выйшла з запланаванага купання.

На голым беразе, крыху далей — пад Крапіўнік, сядзіць нейкі дзядок. І мне гэтае месца памятнае. Збівалі там глені. І я, бегаючы па іх, пакаўзнуўся і, падаючы ў рэчку, зачапіўся пяткай за тоўсты, абрэзаны востра дрот, якім скручвалі камлі. Павіс пяткамі над вадою, галавою ў вадзе. Сябрукі знялі з крука, але я да вечара прасядзеў на беразе: сушыўся і баяўся з акрываўленай пяткай вяртацца дахаты. Ясная плямка на пятцы дагэтуль нагадвае гарэзныя гады на гленях.

А дзе вязь між тваёй прыгодай і лёсам белавежцаў, што не вярнуліся з вайны? Сядзіць на беразе. Дзядок таксама ўспамінае глені і праклінае лёс: астаўся жывы, але толькі на старасць адважыўся заглянуць у родны кут. Быў „фаршутам”.

Адновім тады „фаршуцкі” адрэзак белавежскай гісторыі. Forstschutzkommando Bialowies (Feldpost L 49053) пачаткова складалася з самых немцаў. Затым камісаравы падручныя вылучылі і мясцовых кандыдатаў у фаршуты. Сабралі разнародную гопкампанію і прапанавалі дабравольна ўступіць у атрад. Вылучэнцы не апраўдалі спадзяванняў, выкручваліся ад гонару служыць немцам. Аднак усіх апранулі ў стальную форму.

Больш не пыталі пра згоду, прысылалі павестку: такога і такога ставіцца на прызыўную камісію. Не ставішся — наракай на сябе.

7 жніўня 1943 года ў будынку кіно прызыўная камісія абследавала кантынгент народжаны ў 1924 г. Прызывалі не толькі белавежцаў, але і хлопцаў з суседніх вёсак, без выключэння: праваслаўны ці католік, беларус ці паляк. Дарма „Ніва” ўключыла белавежскіх

фаршутаў у беларускую самаахову. Нацыянальнасць не іграла тут ніякай ролі. Хто быў здаровы, увагналі ў фаршуцкую форму, дахаты не пусцілі. Ля пабітых на Нікары фаршутаў, якіх толькі што прывезлі ў Белавеж, уручылі вінтоўкі і павезлі ў Белы Лясок на вучэнне.

Пагулялі тры месяцы ў вайну — і ў Пушчу, на „штыцпункты”. Укамплектоўваліся яны прапарцыянальна: 20 немцаў і 10 нашых. Такая расстаноўка сіл гарантавала немцам бяспеку і сведчыла аб дозе даверу да нашых. Але норма харчавання была адна для ўсіх — нямецкая.

— Мяне прызначылі ў Чола, — успамінае наш герой. — Пераважна неслі мы каравульную службу. Ахоўвалі леснікоў, дружынамі ў дваццаць чалавек хадзілі квартальнымі прасекамі, сачылі за партызанамі. Часам чуем, што яны побач, але ідзем далей. Яны не чапаюць нас — і мы не трывожым іх. Паходзім чатыры гадзіны — і ў размяшчэнне. А ўначы каравулілі па дзве гадзіны: мы і немцы — разам. Хадзілі толькі па трыбах і дарогах, аблаваў не рабілі.

— Нікар навучыў асцярожнасці?

— Хто яго ведае? — задумоўваецца Дзядок. — Але як Каўпак падышоў да Белае, кінулі на поўдзень усё Kommando. У Пушчу Каўпака не ўпусцілі.

— Мабыць, ён у яе і не лез?

— Магчыма, было і так, — пагаджаецца мой размоўца. — Факт, партызан мы не бачылі. Раз толькі, каля Косавага Мосту сутыкнуліся. Загінуў тады немец і быў паранены адзін партызан.

— А што скажаш пра Дудзіча?

Дудзіч — мой равеснік, замест у Прусію, трапіў у фаршуты.

— Нарабіў усім бяды, — асуджае калегу Дзядок.

— Стаяў у Старыне. Пабіў сваіх немцаў і пайшоў у партызаны. Немцы адпомсцілі сям'і: расстралялі бацьку, маці і сястру. І нас, усіх белавежскіх фаршутаў, паставілі пад сценку. Трымалі пад туламі некалькі гадзін. Але маёр Фрыверт загадаў, каб з-за аднаго не расстрэльвалі ўсіх. Тады мы і даведаліся, што мелі нас расстраляць.

— А калі наблізілася да Пушчы Чырвоная Армія
— што вы рабілі?

— Перад адступленнем сабралі нас у зверынецкім штыцпункце. Частку паслалі на фронт, а рэшту, у тым ліку і мяне, пасадзілі на падводы і пад канвоем павезлі ў Гайнаўку. Адтуль адправілі на Прусы. А тыя, што пайшлі на фронт, паўцякалі. Фронт быў ужо ў Пушчы і немцы не маглі ўпільнаваць нашых. Нас жа, чалавек 75, загналі ў Румніцкую пушчу. Працавалі ў лесе. Затым накіравалі ў Інстэрбург, у часць. Тры месяцы вучэння — і цэлая зіма ў складзе боепрыпасаў.

Потым далі новыя мундзіры і ўключылі ў парашутную дывізію Германа Герынга. Адступалі на Пілаў. Там — на караблі. І ў Свінэмюндэ. І ў прапагандысцкую роту. Нічога не рабілі, толькі хадзілі па вуліцах і спявалі. Узнімалі настрой. Калі здзерлі глоткі, пачалася этапная катавасія. Берлін — іншае злучэнне — Дрэздэн — Гэрліц — армія Шэрнэра — паветрана-бранявая дывізія — паход на выручку Берліна — дапаможная служба. Разгром. Амерыканцы.

— Быў у няволі?

— Яшчэ чаго! Пераапрануўся ў цывільнае — і Good bye!

Застаўся аднак нявольнікам лёсу. Пабаяўся вярнуцца дахаты, асвойваў Заходнія землі. Прыкмета часу. На захадзе пасляваеннай Польшчы зацерушыўся не адзін белавежскі след.

Сяджу побач Дзядка і думаю: „А ў чым яго віна? Нарадзіўся ў трэфны год?”

Бы згадваючы мае думкі, „фаршут” усміхнуўся:

— Барыс цяпер пан.

Барыс Валкавыцкі — мой сябар ад маленства. Разам ехалі на прымусовыя работы: кантынгент народжаны ў 1923 годзе. У Кёнігсбергу нас разлучылі. Мяне пакінулі ў сталіцы Усходняй Прусіі, а яго завезлі пад французскую граніцу. Адтуль ён і ўцёк да Андэрса. Яму, значыць, пашанцавала, трапіў у праведную фармацыю.

— Не гаруй, дружа, — суцяшаю „фаршута”. — Я цяпер больш трэфны, чым ты. Не ўцякаў у Свінэмюндэ, стаў „акупантам”. А якія трафеі прывёз? Пусты рэчмяшок: сухі паёк з'еў у дарозе. Дурное пісулькі нават не выдалі, колькі служыў Савецкаму Саюзу. А і тыя дакументы, якія меў — польскія, савецкія, нямецкія — знішчылі.

— Я б не аддаў! — з дакорам кажа „фаршут”.

— І я б не аддаў, калі б ведаў, што забяруць.

А было так. Пасля завяршэння Усходнепрускай аперацыі, III Беларускі фронт перакідалі на Японію. І наш полк быў напагатове. Таму і каманду Вязать вещмешки и построиться ўспрыняў я нармальна. А тут на казарменнай плошчы загадваюць развязаць рэчмяшкі і вывернуць кішэні. Уся твая маёмасць апынулася пад нагамі. Рэвізія? Якую крамолу шукаюць?

Крамольнымі аказаліся ўсе асабістыя дакументы. Пайшлі на стос.

— Не можа быць?! — з недаверам упёрся вачыма ў мяне „фаршут”.

— Здзіўляла адно: чаму „рэвізор” узіраецца ў кожную паперыну, якая і так прызначана на касцёр. Добра, што хоць фатаграфіі вярнуў.

— Чаго баяліся?

— Хто іх ведае? Відаць, уцёкаў.

Найбольш шкадаваў я савецкага пашпарта, з якім не расставаўся ўсю вайну і нямецкага скіравання на „службу працы”, дзякуючы якому на фільтрацыі не трапіў у катух уласаўцаў. Даслоўна, трымалі гэтых ваякаў у куратніку. (Дакументацыю „скіравання”, якую змяшчаю далей, узяў у андэрсаўца, з якім ехаў на „службу працы”, і які вярнуўся як чалавек, з усімі дакументамі).

Тады не ведаў, што трацію. А сёння кожная канцылярская казяўка глядзіць на цябе, як на жуліка: „дакажы”, „дакажы”. На тваё „як было” толькі грэбліва паківае галавою.

Мне армія назаўсёды адбіла цягу да мундзіра. А сніліся ж бліскучыя эпалеты. Пасля вайны, калі мог паступіць у любую вучэльню, і падумкі не меў, каб выбраць вайсковую. Такую магчымасць не праваронілі дапрызыўнікі, лавінай хлынулі ў афіцэрскія школы. Парознаму ўзбіраліся па зоркавай лесвіцы, сёй-той пахіснуўся, зрабіў неразважлівы крок і прызямліўся, але адных палкоўнікаў у нас, як у бати Балаховіча. А па роду войск, дык б'ём ватажку. Нават марскімі і ракетнымі сіламі камандаваць можам.

Стой, летуценнік! Зноў прысніліся табе бліскучыя эпалеты? Тады раскажам казку пра пастушка Мішку.

Нарадзіўся ў Кузьмах, што за Бандарамі. Пасля вайны, разам з іншымі дзяцьмі, пас на прынарваўскіх лугах каровак. Нічым ад іншых не вылучаўся. Па -за смуглявасцю. Мішка быў як цыганок. Толькі вочы бліпічэлі з-пад казырка бацькавай кепкі. Асабліва загараліся, калі ў небе з'яўляўся ўсюдыісны У-2.

— Эх, узабрацца б на яго і паглядзець уніз! — марыў уголас Мішка. — Адтуль, мабыць, нашы кароўкі — малюсенькія, як мурашкі.

— То як жа ж ты гэтыя мурашкі разгледзеў бы ў траве з такой вышыні? — смяяліся сябрукі.

Мішка ўступаў у спрэчку. Але ніхто з хлапчукоў не ведаў, як выглядае зямля з самалёта, таму спаборніцтва канчалася ўнічыю. Закончыўшы пачатковую школу ў Рыбаках, трапіў Мішка ў Дэмблін, у слынную Школу арлянят. Выйшаў з яе выдатнікам і стаў лятаць.

Выкрылі мы яго на ваенным аэрадроме ў 1963 годзе, ужо ў чыне падпалкоўніка. На развітанне паветраны ас уручыў нашаму разведчыку мадэль рэактыўнай птушкі і наказаў:

— Перадай у „Ніву” і скажы, што гэта ад Мішкі-пастушка, мары якога збыліся.

Так нарадзіўся рэпартаж „З Кузьмоў пад неба”. Хутка і сам герой завітаў у рэдакцыю. Мажны, трыццацігадовы падпалкоўнік Міхал Полех.

Праз 33 гады ён, ужо генерал у адстаўцы, і пасяліўся ў Белавежы.

## На шлюзе

Падкаціла пад нашу хату іншаземная машына. Выйшаў з яе лысы дзядзька ў ненашых акулярах з блішчастым ланцужком, зачэпленым на карку.

— Тут выдаюць абеды? — пытае.

— Памылка, — адказваю. — Вам хіба трэба ў ”Іву”?

Прышэлец натапырыўся:

— Ты што, не пазнаў?

— Не.

— Лявон.

Яшчэ не пазнаю.

— Майсеюк!

Гадоў дваццаць не бачыліся. З 1979 года ў Швецыі. Ды і раней колькі год працаваў у Варшаве. Чуў я, адпачывае ў Белавежы, але сустрэцца дагэтуль не давялося. Ён спыняецца ў брата, на Заставе, а я ў Барку, далекавата. Урэшце сустрэліся. Быў аўтарам „Нівы”. Я і рэкамендаваў яго на працу ў Беластоцкае радыё, на беларускую праграму. Яе стварыў у 1958 годзе Мацей Канапацкі, татарын з беларускімі повязямі, таксама нівец і мой пратэжэ. Але наш Мацейка вымушаны быў вярнуцца ў Сопат, да маці. На яго месца і прыйшоў Лявон. Потым Майсеюк рабіў кар'еру ў Мазавецкім радыё. І нечакана махнуў „за бугор”, адкрыў у Швецыі букіністычную краму. Рызыкант і, відаць, вопытны мяняла: жыве ўжо з трэцяй жонкай — на трыццаць год малодшай!

Атрымаў у Белавежы пляц.

— Будавацца будзеш?

— Відаць, буду. Мо дзецям спатрэбіцца.

А ўсё ж у Белавеж цягне. Хоць на лета.

— Паехалі на шлюз, паўспамінаем!

Застаўлянскі шлюз — адмысловае месца для такой падзеі. Асабліва, калі зняць верхнія застаўкі. Тады ўтвараецца магутны вадаспад і Нараўка гудзе, як Ніягара. Малышамі выпручвалі мы свае кволыя грудзі і таранілі імі стыхію. Добра было таксама, прыціснуўшыся да ніжніх заставак, адгарадзіцца ад вонкавага свету і ўзірацца ў ашаламляючую прыродную энергію. Цяпер глядзім на ўздыблены паток зверху, і ён нагадвае нам, што ўсё цячэ, усё мяняецца.

Калісь у шум ракі ўліваўся і людскі гоман. Шлюз быў ачагам адпачынку многіх пакаленняў. Прыходзілі сюды малыя і старыя. Адны загаралі, купаліся, голымі рукамі цягалі з ракавых пячораў панцырнае смакоцце; іншыя, закасаўшы нагавіцы, усаджваліся на беразе ракі і мачылі ў халоднай рацэ ногі. Цяпер тут не ўбачыш жывой душы, усе пакінулі старэчу. Аброс цвіллю і іржою. А ўсё жывы, яшчэ падужаецца з наступам стыхіі, хоць новы мост — апошні крык жалезабетоннай тэхнікі — намагаецца ўвагнаць рачнога старажыла ў комплекс непаўнацэннасці.

**Займаемся этымалогіяй**

Прыехаў Барыс. Як па сігналу з'явіўся Пятро, а за ім і Сяргей. Селі мы пад старой вольхай і пачалі нечарговую сесію. Карыстаючыся наглядным прыкладам, выклаў я сваю думку адносна паходжання назвы Застава. Газетныя аўтары часта выводзяць гэтае найменне ад шлюза — заставы. А ці шлюз мелі на ўвазе хросныя? І чаму менавіта шчалкапёры ўзіраюцца ў шлюз? Мог жа, напрыклад, нейкі ўласнік, прадуўшы ў карты грошы, „заставіць” левабярэжны ўчастак. Не было такога пана? Згода. Давайце тады зробім рэтраспектыўны агляд. Станем на месца вандроўніка, які адкрывае свету наш родны кут. Вось ён вынырнуў з лесу. Што ўбачыў?

Przy brzegu Narewki wężykiem płynącej w cieniu wierzb i olszyny wznosi się pagórek ponad wsią i jej gruntami. August III kazał w tym miejscu wystawić dom myśliwski, a następca jego Stanisław August dodał dwa pawiliony... W około tego wzgórka po obu brzegach Narewki ciągnie się wieś Białowieża, w której jest jeden kościół, 56 chat wieśniaczych i jedna karczma. Część licznych domostw u stóp tego wzgórza tworzą porządną ulicę, a inne tu i ówdzie bez ładu rozsiane składają mniejszą część wioski...

(O Puszczy Białowieskiej przez Juliusza Barona Brinken. Z Dziennika Warszawskiego Nr 11 roku 1826).

Pan Brinken Naczelny Nadleśny w Królestwie Polskim, jadąc przez pół dnia ciemnym i gęstym lasem, відаць, змарыўся і без затрымкі podążył па wzgórze, таму і не аднатаваў назвы сяла. А мо яно было яшчэ безыменнае?

Пройдуць гады і новы вандроўнік аднатуе:

Село Беловеж находится в центре Пущи и приютилось на большой поляне. Оно состоит из старинной деревянной церкви с жильями духовенства, царского охотничьего дома, помещения заведующего

охотой и — отделенных от этих построек речкой Наревкой — школы, волостного правления и фельдшерского дома. Примыкающаяся-же к этим постройкам крестьянская слобода уже носит название Застава и потому-то вероятно Беловеж именовался прежде фольварком. Кроме того, на этой поляне, в версте от Беловежа, находится деревня Сточек; а немного дальше виднеется еще какгія-то деревушка. Население деревень состоит из бывших государственных крестьян, большая часть которых православная, а меньшая — католики. Затем известный процент составляют евреи. До-нельзя грязные, оборванные, они выглядят среди местного, довольно зажиточного, населения какими-то париями рода человеческого и производят крайне неприятное, тяжелое впечатление. Так-же меня поразило обилие ребятишек. Идя, например, по Заставе, против каждого двора видишь чуть не толпу этих будущих Лукашей и Василей. Кажется чем-то невероятным, что из трех, сравнительно очень небольших деревушек, в школе обучается 80 мальчиков!

(Байков. В Беловежской пуще. „Природа и Охота”, июнь 1885).

Вёска разрасталася. Domostwa tu i ówdzie bez ładu rozsiane злучаліся з porządną ulicą.

Праміне яшчэ адрэзак хуткаплыннага часу і на белавежскім левабярэжжы спыніцца этымолаг, нашчадак пана Брынкена, напаўнемец-напаўпаляк. Услужлівы Wasyl падкажа назву сяла. Больш нічога талковага ад інфарматара не даб'ецца, bo wieśniak mówił po rusku.

— Zastaw, Zastaw, — напружвае памяць этымолаг. Шматзначнае слова. Што б яно значыла? Чуў ужо падобную назву... Так, у вёсцы Haynowszczyzna, у колішнім Мытным доме..

Ускрай Пушчы праходзіла мяжа паміж Літвой і Польшчай. Пасля першага падзелу, калі частка Літвы разам з Пушчай адышла да Расіі, да старой мяжы падсунулася Прусія. А паколькі мяжа была няшчыльная — Пушчу наваднілі браканьеры, прускія падляшукі. Давялося наладжваць новыя „заставы”... Значыць —strażnice. Ды навошта ставіць іх усярэдзіне Пушчы?

Падарожнік забрыў у тупік. Але як на Русі ўсе дарогі вядуць у Кіеў, так у Белавежы — на апеты летапісцамі ўзгорак. Накіраваў туды свае крокі і наш даследчык. Падышоў да ракі — і ўсё стала ясна: раку перагароджвае шлюз, інакш застава. Адсюль і назва вёскі.

Этымолаг, схавай нататнік. Не спяшайся з запісам. Выснова памылковая. Дзе там! Узрадаваны адкрыццём, папёр на ўзгорак падыхаць каралеўскімі флюідамі, выпусціў з-пад увагі падножжа. А яно выставіла даследчыку дулю.

Даследчык быў аматарам. Прафесіянал ведаў бы, што загадку развязваць трэба на пануючай над палянай правабярэжнай вышыні, дзе загадка і нарадзілася. Калі б ён, узабраўшыся наверх, перш чым прыкавацца да слядоў Аўгустаў, зірнуў уніз, убачыў бы ля падножжа стаў, а за ім сяло. І рэк бы з палёгкай:

— Вось і За-стаў!

Заставам і называлі старыя людзі вёску, ніколі шлюз. Маладшыя карысталіся ўжо „Заставай". Але для ўсіх Застава была Заставай, а шлюз — шлюзам. Урэшце, аб'яднаўшыся з „Шашой", „Гулачкамі" і „Будкамі" porządna ulica стала Сялом, аддала афіцыйную шыльду ўсёй левабярэжнай агламерацыі. На чало высунулася „Шаша". Яна і прыняла найбольш хрышчэнняў: — 17 сентября — Schloss Strasse — Olgi Gabiec. Пасля вайны Zastawa вярнулася да сваіх каранёў, на старую надрэчную вуліцу. І цяпер, калі я называю сябе застаўлянцам і бацькоўскі дом умяшчаю на Заставе, маладыя белавежцы толькі ківаюць галовамі:

— Гэта ж на Olgi Gabi ее.

Дык цяпер хто я — olgagabiec?

## Якога князя ўшанавалі?

А пануючая гара далей нараджае загадкі — для нашых нашчадкаў. Вось за застаўлянскім выганам было ўрочышча Кнігінеўка. Ад веку так звалася. Гнездзяцца ў ім кнігаўкі (па-мясцоваму кнігі) — ад іх і найменне. Але прыйшлі на гару чарговыя аднаўленчы, брынкнулі вядзьмарскімі разцамі — і счэзла з тапаграфіі Кнігінеўка, яе месца заняла Kniaziewka. Якое зло ўбачылі яны ў старой назве, хто іх ведае. Няўжо рускую княгіню? А мо хацелі ўшанаваць балахоўца Князева, які жыў на Крыжах і пэўна хадзіў у Кнігінеўку па арэхі, апенькі і шчаўе? Хутчэй за ўсё нягеглым аднаўленцам замроіліся rówiemiki litewskich wielkich kniaziów. Адна бяда, ніводзін вяльможа не ўстраг у Кнігінеўцы. Урочышча балоцістае, абміналі яго mości і сиятельства. Ліха з імі, хай папануюць на багне.

Нядаўна здабылі мы карту савецкага галоўнага штаба з грыфам „Секретно". Ужо і на яе перакачавала Князевка. Калісь завітае ў Белавеж нашчадак Брынкен-Брынкевіча, хай і ён пашукае флюідаў дзяржаўных мужоў адышоўшага свету. Не кожнага тут ушанавалі, хоць многія пакінулі ў Пушчы свае сляды. А некаторых увекавечылі з дуру.

Ехаў у Польшчу Ціта — вялікі паляўнічы. Хто-хто, а ён памаліцца святому Губерту. Лоўчыя кінуліся выбіраць адметнае месца: абавяз-

кова сярод старых дубоў, каб нагадвалі высокаму госцю боскую і зямную магутнасць; незагустое і несырое, паблізу асфальту. Звяроў падкінем. Цесляры мігам пабудавалі раскошную страху з вялікім дубовым сталом і застольнымі лавамі, каб Паломнік паміж мальбой (пальбой) мог прысесці і глытнуць настоенай на каранях „Зуброўкі".

Пушча замерла ў чаканні гістарычнай падзеі, а балканскі багатыр так і не з'явіўся. Відаць, сам выбіраў паломніцкія шляхі. Страха засталася. Дзякуй будаўнікам — добра адпачыць пад ёй пасля курганных рэйдаў. Толькі смешыць прысвоеная месцу назва ўрочышча — Titówka. Ніякага Ціта яно не бачыла, хіба толькі таго — з вялікай лыжкай.

— Тит, иди молотить.

— Спина болит.

— Тит, иди кашу есть.

— А где моя большая ложка?

Зніклі з Белавежа Ціты, Васілі, Сяргеі, Пеці, Мікалаі, Барысы і Жоржыкі. Калі і захаваліся, то даваенныя. Цяпер родзяцца адны Даркі і Яркі. А што сталася з Федзямі — толькі іх тут было!

Сядзім на абтаптаным мостабудаўнікамі беразе ракі, перад намі старое Сяло, цяпер сапраўды porządna ulica Zastawa. Як прыкмеціў у мінулым прышэлец Байкоў, жывуць тут даволі заможныя людзі, толькі ўжо без обилия ребятишек. Буслы працуюць яўна не на карысць белавежцаў. Ад кітайскіх клекатуноў пераймаюць вопыт ці што?

— Перасталі верыць у буслоў, вось што! — сказаў, падаспеўшы на разбор шапак, Сідар, і дадаў:

— Выградзіліся не толькі юрлівыя Васілі, але і пладавітыя Тэклі. Цяпер адны дурыкі ў галаве.

І апавёў павучальную гісторыю:

— Суседская гамана данесла стачкаўлянскай Элітцы: — Твой здраджвае табе...

Няцяжка было здагадацца з кім. Абражаная ў высокіх пачуццях Элітка, па старавечным звычаі ўстанавіла сачэнне за мужам. Вызначыла: шмуляе лярву на Каменным багне. І ўвесь свяшчэнны гнеў скіравала на незаконную саперніцу. Папомніш мане! І секанула па гордзіевым вузле. Але перш падбіла на пачын сяброўку, увасабленне ідэі патрабавала вонкавай падмогі. Даследаваўшы маршруты палюбоўнікаў, змоўніцы заселі ў прыбагнавых кустах і застылі ў чаканні.

Зашухкала асака на вытаптанай сцежцы.

Зьгаладнелая сексуальна малодка падбаўляла кроку, спяшалася на ўмоўленае месца, і амаль не баранілася, калі з кустоў выскачылі мсцівіцы і павалілі яе ў траву. З дзікунскай апантанасцю накінулася

Злітка на сваю ахвяру, задрала ёй спадніцу і ў прагную адтуліну ўвагнала яловую шышку. Нарыпаешса! Шышку прыдбала пародзістую, хірург вымаў!..

— Ну і ну! — захапіўся навінкай Лявон. — Не абяззброіла мужа, вывела са строю дыверсантку. Хітрая баба!

## З чаго смяяліся застаўлянцы

— Адставім сучасную тэму, — сказаў я. — Раскажы, Лявон, хлопцам, як бавілі вольны час старыя застаўлянцы.

Лявон глянуў на мяне з прыжмурам і гмыкнуў:

— Расказаць — не расказаць, — пачухаў лысіну, — паспрабаваць можна.

І павярнуўся тварам да Сяла, абняў настальгічным позіркам застаўлянскія агароды, за якімі грувасцілася шчыльная сцяна драўлянай забудовы, і пачаў:

— Цэнтральнай фігурай у нас быў дзядзька Фёдар. Той, што парасячы булён з'еў. Вунь там, у белай хатцы жыў. Багатая была фігура, у звыклыя рамкі не змесціш. Галава, што вялікая цыбуліна, нос — спелы памідор, вочы — макаўкі. Уся гэта верхняя надбудова асаджана на доўгай шыі, уваткнутай у кароткае базавае тулава, якое дастойна хісталася на бусліных нагах.

Насіў дзядзька Фёдар — і ўзімку, і ўлетку — агромністую цёплую шапку і зашмуляную векам душагрэйку, падпярэзаную вузкай дзяжкай, ну і нагавіцы самаробныя, з кішэнямі, у якіх змясціцца мог пячнік Кандрат. Хадзіў заўсёды ў „самаходных” лапцях.

Асаблівасць дзядзькі Фёдара крылася не толькі ў незвычайным вонкавым выглядзе. Меў ён і асаблівую канцэпцыю жыцця. Нездарма мужыкі, якіх у суседскіх дыспутах клаў на лапаткі, ахрысцілі яго філосафам. А філосаф, вядома — хто! Многа думае, ды мала робіць. І таму, хоць скрыта, падсмейваліся вяскоўцы над дзядзькам Фёдарам. Дык што ж рабіць зімою, як не смяяцца?!

Дзядзька Фёдар не звяртаў на жартаўнікоў ніякай увагі. Ён, перш за ўсё, шанаваў спакой. Аднойчы на кудзельніцах жонка ўсчала сварку з суседкай. Дык наш філосаф выгнаў сварлівак з хаты і, калі тыя тапталіся на марозе, пашчапаў калаўроты і насмажыў на іх сабе яешні.

І да хлеба надзённага дзядзька Фёдар ставіўся абыякава. Так было і ў час няшчаснага абеду, калі ён, вярнуўшыся з поля, замест нарыхтаванай жонкай таўканіцы, з'еў чыгун парасячага булёну. Былі

гэта далёка не тыя гады, калі ён адчуваў сябе гаспадаром уласнай хаты. Цяжка адпакутаваў памылку.

— Можа, яшчэ чаго хочаш, стары дурню?! — крычала за віляючым мужыком Хвядося. — А, можа, чаю з цукрам, каб цябе зямля накарміла!.. Парасяткі, мае ж вы бедненькія! — галасіла. — І што ж я вам дам на палудзень?!

Людзі казалі, пасля гэтага выпадку, дзядзька Фёдар да таго разгубіўся, што едучы з выгана на сваім кані, спыніў глухога Міколу і пытаў непрытомна, ці той не бачыў ягонага каня.

Дзядзька Фёдар асаблівую ўвагу кіраваў на дзве справы: Біблію і магніт. Біблію тлумачыў ён на ўсе бакі, а магнітам раскрываў амаль кожную з'яву Божага свету. І хоць з-за Бібліі перасварыўся з печнікам Кандратам, які дзядзькафёдаравы толкі тлумачыў якраз наадварот, то ў магнітнай дзялянцы не было яму роўных. І пусціцца ж ён у гэтае самае прыцягненне, аж вочы слухачам на лоб каробкамі вылазяць!

Не менш здольнымі былі і сыны. Найстарэйшы, калі яму было толькі шаснаццаць год, зрабіў скрыпку. Сярэдні, у трынаццацігадовым узросце, змайстраваў двухколавы ровар. Толькі наймалодшы ніяк не мог заняцца сур'ёзным. Як не гуляў у войска, то маляваў дзівосныя партрэты бацькі. Творца дакладна капіраваў постаць, і дзядзька Фёдар не любіў гэтых карцін, як чорт свянцонай вады.

Творчае гарэнне маладога таленту і было прычынай, з-за якой сеніёр два дні адседзеў у гмінным арышце. А справа мелася так.

Быў прыгожы вясенні поўдзень. Пацяплеўшае сонца ляніва прыгравала карослівыя бакі Фёдаравых авечак, ціха іржаў галодны конь. Хвядося даіла ў хляве карову, а гаспадар раскошна драмаў на прызбе. Толькі юніёр нецярпліва ёрзаўся на процілеглым плоце.

— Тату! — раптам загаласіў ён. — Гляньце на дзверы!

Бацька неахвотна пакасіўся ў напрамку дзвярэй і анямеў: на лёгкім ветры калыхаўся прычэплены да дзвярэй партрэт. Памылку выключаў выразны надпіс: „Бацька — Залатая Дзюба”.

Дзядзька Фёдар, хоць і стары, але ў злосці куды лаўкач. Міг — і стаяў ля драбіны ў хляве, па якой карабкаўся на вышкі наймалодшы.

— Ну, вырадку! — прашыпеў стары і скочыў да сына. Драма мела разыгрыцца пры зачыненых дзвярах. Так і сталася б, каб не адна, можна сказаць, дробязь.

На вышках ляжаў тонкі слой мінулагодняй саломы. Старому трэба было задумацца. Вядома, вышкі зроблены з рэдка паложаных круглых друкоў, да таго нічым не ўмацаваных. Гнеў асляпіў старога, ягоныя грудзі забухалі, быццам дзіравы мех каваля Хухаля, у прадчуванні салодкай помсты рукі працягнуліся да сына...

Кажуць людзі, каго Бог пакарае, таму розум адбярэ. У гэтым выпадку, усе згодны, так яно і было. Рассунуліся друкі і мсцівец праваліўся скрозь круглякоў.

Далей падзеі разыграліся хутчэй, чым можна было чакаць. З раскінутымі рукамі, шлёпнуўся вышкавы парашутыст на карову, якую даіла жонка. Пад рогат сына і крык перакуленай у гной Хвядосі, наезнік стралою вылецеў з хлява. Рукамі ахапіўшы шыю жывёліны, ён бязвольна боўтаў нагамі на жываце карміліцы, несвядома паскараючы бег. Крутнуў па двары і праз адчыненыя вароты выскачыў на вуліцу.

Эх, слаўна выехаў дзядзька Фёдар з варот, слаўна! Людзі дагэтуль не могуць забыць уцёкаў падаткавага інспектара, які падвярнуўся пад нашага каўбоя. Драпаў службовец, аж пыл за ім клубіўся.

І так дзядзька Фёдар трапіў у крамолу, бо хоць і даказваў, што інспектар уцякаў ад каровы, бо наезнік у той час ляжаў ужо на зямлі, не выкруціўся ад кары. Падаткі таксама мусіў заплаціць. А што дасталася ад раз'яранай бабы, аб гэтым можна скласці і другое, не меншае апавяданне.

## Ну, пачакай, Жоржык!

Лявон, па звычцы застаўлянцаў, прыкідваўся: маўляў, язык у яго няспраўны, куды яму да іншых расказчыкаў. Расказваць умее. І хлопцам спадабаўся „Дзядзька Фёдар", як і мне ў 1958 годзе, калі я пускаў апавяданне ў друк. Была гэта першая літаратурная прыгода С. Заставіна. Стартаваў новы аўтар на парозе „белавежскага" руху. Я, разгадаўшы намёк пачаткоўца, прапанаваў яму стварыць галерэю белавежскіх партрэтаў. І яны з'явіліся.

Хітры Лявон схаваўся за псеўданімам і — хоцькі-няхоцькі — выставіў пад удар мяне. Бо выстаўка не спадабалася героям. Яны, як і дзядзька Фёдар у сынавых малюнках, убачылі скажэнне рэчаіснасці, карыкатуру на род чалавечы, і пачалі шукаць скрыўшагася „мазілу". „Olgi Gabiec" яшчэ не было, пад адной страхою месціліся ўсе застаўлянскія вуліцы і вулачкі. Пошукавыя групы доўга не бавіліся ў Шэрлакаў Холмсаў. Заставін? Маскіроўшчык мне! Гэта, соль яму ў вочы — солтысаў сын... Ну, пачакай, Жоржык!..

Першая запаведзь белавежца — не абражай.

Найбольш дасталася мне ад царкоўнага старасты, за другое апавяданне С. Заставіна, у якім быў ён галоўным героем. За „абразу рэлігійных пачуццяў" стараста накіраваў справу ў ЦК ПАРП. Прабеглы скаржнік ведаў, што на парпісцкай гары „Ніва" не начуе. Разлічваў на сябелюбства гары: царкоўны служка яе выбраў у заступнікі. І трапіў у

дзесятку. Набраўшы палітычнага значэння і дырэктыўнай моцы, „справа” спусцілася ўніз, у выканаўчую інстанцыю. І я тлумачыўся перад ваяводскім экзекутарам, як дзядзька Фёдар перад белавежскім войтам.

За якім мазком схавалася „правакацыя”, за якою чэрню — „дыскрэдытацыя дзяржаўнай палітыкі”? Карціна, як і нашы дні, пагодная.

Экзекутар, як і гара, Заставіна не чытаў, і не выказваў такога жадання, ён выконваў высокія ўказанні, а што ўважлівы да сваёй асобы індывід забыў пра дзевятую запаведзь (не сведчы ілжыва на бліжняга свайго), гэта твой клопат. І хоць Заставін спартрэтаваў хлуса не ў царкве, дзе ён матам крыў гарэзлівых жэўжыкаў, выганяючы з храма Божага чортава насенне, а ў брычцы, якой вазіў турыстаў, экзекутара я не пераканаў. Але дайшлі мы да кансенсуса: рэдакцыя адбрэша скрытую атаку: маўляў, апавяданне — не партрэт белавежскага старасты (з-за чаго і разгарэўся сыр-бор), а абстрактны малюнак.

Усё яшчэ ваявала новае са старым, і логіка барацьбы дыктавала спосабы і прыёмы вядзення бою. Але заўсёды ішоў бой. Скрытыкуеш крамніка — а ён парпіст — атака на Парпію. Пасмяешся з мастацкага кіраўніка, які аблюбаваў гарэлачныя п'есы — атака на БГКТ. Увесь час мы атакавалі.

Фёдаравічы, згодна традыцыі, вяршылі справу сваім судом. Паблізу чыгуначнай станцыі наладзілі засаду. Відаць, ад расправы выратавала мяне ўзрастаючая заможнасць выдавецтва: пашырылася наша аўтамабільная база і рэдакцыя з паяздоў перасела ў легкавушкі. Карыстаўся і я новым відам транспарту. Пры нагодзе наведваў і бацькоў. Таму і самасудная ідэя Фёдаравічаў дайшла да мяне кружным шляхам.

Цікавыя былі хлопцы — дапытлівыя, вынаходлівыя, асабліва сярэдні. Ён не толькі сканструяваў спраўны ровар, але і дзеючы фотаапарат з чорным рукавом і адмысловым штатывам.

А які быў паклоннік магніту!

Хадзіла чутка: калі стары Фёдар паміраў, наведала сыноў ідэя выявіць вагу ягонай душы. І Фёдаравічы быццам здзейснілі ідэю простым спосабам: узважылі бацьку да — і пасля смерці.

Чутка дакацілася аж да Кракава. Праняўся ёю Ежы Лёвель, пісьменнік, рэдактар і нарысіст — з беларускім ухілам. Шмат добрага напісаў пра нас. Пачуўшы неверагоднае, кінуў бягучыя справы і рушыў у дарогу правяраць чутку. Вяртаючыся з Белавежа, зайшоў у „Ніву”. Цалкам прыбіты. Такім яго яшчэ я не бачыў.

— Што здарылася?

Расказвае пра чутку.

— Ну і што?

— Не пацвердзілася.

Вось гэта рэдактар! Праехаў праз усю Польшчу, каб пацвердзіць чутку. Але ж чутка была якая! У духу Фёдаравічаў.

Лявон не мусіў правяраць фактаў. Ён быў заўсёды ў гушчы падзей: назіраў, слухаў, запісваў і падліваў масла ў агонь. Так і не выкрылі застаўлянцы свайго сапраўднага мастака.

Згарэлі страсці. Мастак сігануў за мора. Героі паўміралі. Засталіся жывыя карціны. І сум.

**Шапка Манамаха**

Былая грэбля паміж ставамі, сёння шыкоўная алея, запрашае ў сваю засень. Грэбляй цяпер яе не назавеш. На ўтравянелым насыпе з многагадовымі ліпамі, ад старога насцілу не засталося нічога. Прыселі мы насупраць абеліска, якім Аўгуст III увекавечыў паляванне 1752 года. Адна Jeymość каралева павалiла 20 зуброў. Такога пабоішча Пушча яшчэ не бачыла. Але мы гутарым аб ставах. Засланыя зялёнай цвіллю. На тым, што за абеліскам, у зімовае даваенне пануючая эліта ладзіла каток. Тубыльцаў на яго не пускалі. І наогул мы не мелі ў парк доступу. Летам на абочыне насыпу рэзервісты спраўлялі свае юбілеі.

Паркавая засень — традыцыйнае месца гульняў. Два астраўкі, што на ставах, у сваю маладосць спалучаліся з сушшу драўлянымі масткамі. Гулялі на астраўках рускія і польскія чыны. Побач месцілася казіно. Цяпер астраўкі зараслі густым кустоўем і дрэвамі. Прырода асабліва багата прыбрала заходняга прыгажуна. Гляджу на яго — і бачу шапку Манамаха. Цар прысутны ў Белавежы. Жыве ён і ў нашай сям'і. Дзед Рыгор даглядаў царскую звярыну, дзед Павел служыў у царскай лейб-гвардыі, а потым быў царскім аб'ездчыкам. Бацька ахоўваў цара. У 1917 годзе, пасля дэтранізацыі, штодзённа „кантачыў” з памазаннікам.

— Здравствуй, молодец!

— Здравия желаю, господин полковник!

Цар ішоў у агарод, варушыў лапатай градкі. Ва ўспамінах бацькі здзіўляла: нізкі ваенны ранг галоўнакамандуючага, прывязанасць цара да лапаты і ягоная ветлівасць: першы вітаў радавога.

На застаўлянскім беразе, дзе ў нашы дні адбываецца беларускае Купалле, здаўна гуляў народ. Вось як апісвае прыезд у Белавеж Аляксандра II Георгій Карцаў:

По возвращении из леса, у Его Величества был обеденный стол. Во время обеда играла военная музыка Великолуцкого пехотного

полка, прибывшая из Белостока. По окончании обеденного стола, из окон Государева домика представилась самая живописная картина: толпы ликующего народа, тысячами собравшегося в Беловеж, расположились густыми группами на противоположном берегу речки, протекающей подле холма, на котором находилось занятое Его Величеством строение. Для народа приготовлено было угощение: водка, пиво и пироги. Песни и пляски оживляли эту картину, которая внезапно осветилась разноцветными огнями. Этот народный пир продолжался до глубокой ночи.

*(Беловежская Пуща, 1903)*

— Як у прыезд на Купалле Алеся Барскага! — зрабіў выснову Сідар.

— Толькі наш уладар не такі шчодры, — унёс папраўку Пятро.

Бераг апіты і абтупаны. Уздоўж чыгуначнага палатна, на пляцоўцы, з якой выступаюць на Купаллі беларускія песняры, стаяла царская платформа. Да яе прычальвалі ўладары і высокія госці. З часам даступіўся да яе і народ. Да вайны адбываліся на ёй славутыя белавежскія танцы. Рампа — так пачала яна звацца — была драўляная, з прамежкамі паміж насцілачнымі дошкамі, і мы, застаўлянскія жэўжыкі, калі сціхаў аркестр і разамлеўшыя танцоркі адпачывалі ля бар'ераў, забіраліся пад рампу і праз шчыліны вывучалі засакрэчаны ўчастак дзявочага цела. Рэдка якая цнотка насіла майткі, і доследны аб'ект быў цалкам адкрыты. Знаходлівы Лёнька Дубінін праводзіў нават эксперымент на выпрабаванне знешніх раздражненняў: лазінай казытаў белыя ляжкі абранніцы. Тая толькі пацірала нагамі: думала, мураш дабіраецца да булачкі.

Знікла рампа, на незнаёмай вышыні зарылі Лёньку, адыходзяць у Патойбаковію чуйныя танцоркі, а традыцыя застаецца.

З адкрытымі бутэлькамі піва ў руках выйшлі з завароту маладыя тубыльцы. Параўняліся з намі — паздароўкаліся. І раптам, адышоўшы на бяспечную адлегласць, адварочваюцца і абзываюць нас:

— Дэцыдэнты! Дэцыдэнты!

Што ім адказваць? Якія мы дэцыдэнты?

Убачыўшы нашу разгубленасць, крычаць мацней:

— Гэта вы ўсё вырашаеце! Бачым вас! Бачым!

Вось яно што. Мае сябры актыўна ўключыліся ў экалагічную акцыю, якая разгарнулася ў мас-медыях вакол Белавежжа. Выступалі і ў тэлебачанні. Акцыя прынесла вынікі: значна пашырыўся Нацыянальны парк. Але знайшліся рупліўцы, якія аб'явілі нас здраднікамі Белавежа.

Прыкмета часу: дражніць. Дражняць усе, знізу ўверх, асабліва друк.

## Баршчына

**З дзённіка. 9 ліпеня**

Учарашняе Купалле сапсаваў Барскі. Дачакаўшыся сваёй трыбуннай чаргі, наш вучоны пачаў плесці чортведама што. У ранейшыя гады клаў націск на паганскі радавод свята і камяні, якімі быццам шпурлялі ў яго белавежцы ў час першага зыходу да дзікуноў. Пасля чарговай купальскай візітацыі, калі п'яны Віця, зблытаўшы дарогу, трапіў на эстраду і прылюдна абцалаваў велікамучаніка, Барскі змяніў курс. Дараваў паганства і каменаванне — і захапіўся цыцкамі белавежанак.

— Так многа тут цыцатых жанчын, а няма свайго хору, —дакараў. — Жанчыны з вялікімі цыцкамі могуць набраць многа паветра, — павучаў цёмны народ.

Не ведаю, чым ён напоўніў свае галасавыя органы перад выхадам на эстраду, але было сорамна: за нашу эліту, за нашу культуру. Адно цешыць, даследчыцкія назіранні (ах ты, Лёнька Дубінін!) перабазіраваліся з ніжніх структур жаночага цела на грудны сектар. Узняліся.

**10 ліпеня**

Усё не дае спакою сапсутае баршчынай Купалле. Чаму ў нас пануе Яго Вялікасць Прымітыў? І пануе трывала, упарта. Успомніліся літаратурныя семінары, калі ў рытуал увайшло спаборніцтва грубасці, мата, фалацэнтрызму. Традыцыю творча працягвае Лёнік. Фалас не прымітыў, да яго трэба дарасці — даказвае. Чаму ж тады не прапануеш басовісцкія плакаты тыднёвіку Nie, навошта бударажыш імі гарадоцкіх працячкоў? Або гродзенская знаходка беластоцкага радыёвяшчання. Прымітывізм у карэнным выглядзе: пітэкахрап, пітэкароў. Вяртанне да выкапня? Ваяўнічае невуцтва, дэфіцыт густу. „Даўціпны” Цім Паводзін з „Пад знаку Пагоні”, набраўшы ў рот гарачых клёпак, раіць:

— Не падабаецца — выключы!

— Нам падабаецца, — падтаквае Гі-гі.

Вось дзе незалежнікі, робяць праграму для сябе.

Пстрык! Сапраўды, палегчала. А што рабіць з Барскім? Яго не пстрыкнеш. І я прыйшоў не на аўтарскі вечар, аб якім ён далдоніў з

прывакзальнай трыбуны („Чаму не запрашаеце?”). Давядзецца выключыцца і з Купалля.

А ўсё-такі цікава, чым адпомсціць Барскі, калі лесуны не запросяць яго на сустрэчу? Бо сказаў ясна, чаму ў песню, якою адкрывалася Купалле, не ўключыў Белавеж. Помсціў за каменаванне. Значыць, слава Сямяцічам, Гайнаўцы, Бельску, Саколцы, Дуброве! А нам дуля? А ў час маладога ўздыму матываваў: А калі цалаваць, дык белавежскую! І непраходнымі сцежкамі вёў дурненькую — сінявокую, шэравокую, цёмнавокую, нізкарослую ці высокую, чарнабровую або русую (якая папала) на паляну кахання, пад каліну. Дзіўнае ўпадабанне, месца для гулькаў на ўсю волечку выбраў мокрае. А чым жа правініўся Беласток, здавалася б, самы блізкі бандарскаму сэрцу цэнтр? Яго таксама ў песні няма.

Барская ласка.

**11 ліпеня**

Уключыў Мінск. Фермерскі хіт беларускіх нэапітэкаў: „Як пайду я ў новую канюшню”.

Здурэць можна.

## Цераспалосіца

**З дзённіка. 12 ліпеня**

Канапацкі піша аб міжусобіцы і сварках у асяроддзі гданьскіх беларусаў. Нацыянальная рыса? Няма чаго дзяліць, а ўдзельных князёў многа.

**22 ліпеня**

Даўно не сніўся Інстытут. А сёння — у каторы раз! — быў на адкрыцці навучальнага года. Усе чужыя і, не па гадах, старыя. Ніводнага аднакурсніка. Многа ганарыстых паэтаў (кіраўнікоў семінараў?). Бы партапаратчыкі, насцярожаныя, цікуюць за студэнтамі. Трэба пагаварыць з Валкавыцкім, кажа важны чын. А я побач, усё чую. А ён не ведае, што я, гэта — я. І іншыя таксама не ведаюць. Атмасфера напружаная. Раптам натоўп скалыхнуўся, строіцца ў шарэнгі. Фармуюцца семінары? А я стаю, як стаяў. Падыходзіць да мяне дзядзька са знаёмым тварам. Адкуль я яго ведаю? Кажа, вярнуўся са сцэнарнага факультэта ВГІКа. Аказваецца, былі мы з ім на першым курсе. Ён зноў прыняты ў наш інстытут. А я не ведаю, што будзе са мною. Урэшце апазнаю „вгікаўца”. Гэта ж Гайдук, гаспадарнік ГП БГКТ з першага ўздыму! Сярод прынятых і Федарук,

Марысін муж. З'яўляецца Сашка Гевелінг. Пытаю, што з нашым курсам? Ідуць заняткі, кажа. Дык чаму я на дварэ?

Даўно такое не снілася. І, дзіўна, заўсёды сніцца пачатак заняткаў. І ён заўсёды трывожны. Хоць У сапраўднасці ўсё было наадварот.

Часам трывогу выклікаюць не здадзеныя экзамены. А гэтага ніколі са мною не здаралася. Хіба што застаўся галоўны экзамен — з жыцця.

**3 жніўня**

Раніцай кашу за хатай. Чую, суседка павучае ката:

— Nie wolno!..

Старая жанчына, якая нават са сваімі ўнучкамі гаворыць на роднай мове, да ката звяртаецца па-польску.

Гэтак кату больш зразумела?

**5 жніўня**

Прыехала з Казахстана. Шпакавічанка з дзядоў-прадзедаў. Ад вайны не была на бацькаўшчыне. Недзе там, на ўзаранай цаліне, у польскай школе вучыць дзяцей „роднай” мове. І сама польская патрыётка, піша ўзнёслыя вершы. Прывезла цэлы сшытак. Чытае іх здзіўленым землякам і шукае выдаўца.

А мне госця нагадала блудную маладосць.

**6 жніўня**

Жыву ў звар'яцелым свеце. Цемра і цвіль. Як у духоўнай праграме радыё Астанкіна. Павернутыя ельцыноіды кінуліся з адной крайнасці ў другую, кормяць народ міфалогіяй. Рускі чалавек любіць казкі. І беларусы не адстаюць ад старэйшага брата. Які крэн зрабілі камсамольскія паэты, чытаць моташна! Розум у іх памуціўся? А што прарочыць сумленне нацыі? Уся надзея ў дыяспары (Васіль Быкаў). Такую ж ролю адводзіў нам у свой зорны час і Пятро Краўчанка (палітык). Вы сур'ёзна, спадары?

І мне нездаровіцца. І я песіміст, але зусім не безнадзейны. Каб яшчэ жонка дазваляла брацца за пяро, калі толькі захочацца, мог бы стаць і памяркоўным аптымістам. А вы апалі духам. Выстаўляеце напаказ свае балячкі раўнадушным чужакам. Нягожа. Прыязджайце ў наш аазіс, да гаючых крыніц беларушчыны. Падсілкуем не толькі надзеяй. Вось праграма белавежскага кіно „Зубр” на жнівень:

1. Дух і змрок (ЗША)

2. Палюбіць і ажаніцца (ЗША)

7, 8. Любоў і вайна (ЗША)

9, 11. Паліцай з метраполіі (ЗША)
14, 15. Ахопленыя роспаччу (ЗША)
16, 17. Забойства на снеданне (ЗША)
21, 22. Рэлікт (франц.)
22, 24. Пінокіо (ЗША)
23, 24. Турбуленцыя (ЗША)
28, 29. З джунгляў у джунглі (ЗША)
30, 31. Рамэа і Джульета (ЗША)
Дык мы ўжо дагналі і перагналі Еўропу!

**19 жніўня**
Дайшлі да нас са словам новым
Апосталы перабудовы —
І мы ўподбежку за імі,
Галёкаем на ўзор паўлінавы.

Так кажа Сідар.

Найхутчэй перастроіліся Дзякавічы. Ім было лёгка, не мянялі нават узору.

Пры Сталіне пісалі:

Прошла зима, настало лето.
Спасибо Сталину за это.

Пасля смерці Правадыра:

Прошла зима, настало лето.
Спасибо Партии за это.

Цяпер:

Прайшла зіма, настала лета.
Дзякуй Усявышняму за гэта.
Дзякуй, дзякуй! За ўсё, за ўсё!
Як і раней.

**3 верасня**
Зноў сон з замежжа. Далёкага. Прыехаў у Амерыку... Хмарачос... Ліфт... Узнімаюся. Не ведаю, дзе сысці. Хмарачос — 60 метраў, кажа

сусед. Раптам ліфт спыняецца. Усе выходзяць. Выходжу і я. Чужы, змрочны і пусты горад. Назад. Хутчэй у ліфт! Дамоў! Але дзе аэрадром? Наверсе хмарачоса?..

Няма каго спытаць. Чытаю нейкія аб'явы, але патрэбнай мне інфармацыі няма. А як не здабуду білетаў на заўтра? Як тут пражыць, усё непрыветнае, варожае. Непатрэбна мне Амерыка! Дахаты! дахаты!

**7 верасня**

Раніцай стук у шыбу. Падыходжу да акна — птушка: вялікая, карычневая спінка, па баках сталёвыя, чорныя і белыя колеры, ля дзюбы — такія ж. Углядаемся: я ў яе, яна ў мяне. Птушка ўзляцела на дуб, а мне ўспомнілася вайна, фашызм (карычневы колер). Але перамагло хараство птушкі.

Праз нейкую гадзіну ўключаю Астанкіна. Аглядальнік гартае Новое время. Увесь нумар пра рускі фашызм.

**21 верасня**

Сідару, як і мне, у апошні час сняцца трывожныя сны. Знак часу? Іншы раз насніцца такое, што і пры дапамозе „Вялікага вавілонскага слоўніка” не выбярэшся з кашмару. Так здарылася і з Сідарам. Доўга сядзеў у гэтым сне, урэшце выслаў ліст у „Вер — не вер”.

## Сідараў сон

Мне прысніўся дзіўны сон. Быццам Белыя Вытокі занялі кітайцы. Дэсант высадзілі ці што? Не паспеў я прыйсці да памяці, як чарадзей з пляскатым тварам перанёс мяне ў „Ніву”. У прыёмнай усё нібы на сваім месцы, толькі Галінка, ветлая ніўская сакратарка хавае пасмутнелыя вочы.

— Ад чаго сум? — пытаю.

— Перахрысцілі, — кажа. — Цяпер я называюся Ра Маш-ка.

— Гучыць злавесна, але кітайцы не парушылі зместу, толькі пакрышылі прозвішча па-свойму, — суцяшаю.

Рамашка галавой качае.

— Шэф у сябе? — кірую позірк на кабінет галоўнага рэдактара.

— Няма, пайшоў на перапраграміраванне,— усміхаецца Галінка.

Па звычцы, без грукання ў адчыненыя дзверы, заходжу да сакратара.

— Здароў, Луба! — працягваю руку.

А ён не варухнецца. У зашпіленай на ўсе гузікі чорнай маоцзэдунцы, сядзіць, як бонза, заглыбіўшыся падкрэслена ў свае гранкі. І шыю не муляе табе кітайскае сукно? Ужо навучыўся адгадваць і чужыя думкі. Не адрываючыся ад папераў, зазначыў:

— Прашу не называць мяне Лубам.

Жартуеш ці што? Не, ён не жартаваў.

— І не ачысціўшыся, не падаваць мне руку, — пяпярэдзіў.

Што тут дзеецца? З друкарні прывезлі новы выпуск. Бяру ў рукі зложаную ўдвая газеціну, разгортваю і заліваюся слязьмі. Перайменавалі „Ніву”! Прыстойнае, выпеставанае дзесяцігоддзямі загалоўнае слова замянілі грубым „Ніхуа”. І падзагаловак апаганілі: „Тыднёвік маанцаў”!

Ладнае ніхуа...

І як маланкай паласнула перадоўка Бар Сунь-дуя „Радзіма, родзіна — Кітай”. Мой кумір млее ў самазабыўным экстазе:

Мао! Наш Война,
Цзэ-дуне-Прароку,
Маанскі народ
Усё ж дачакаўся,
Воля Твая плыве
Па краіне.
Слаўся, Маанія, і Мао
Слаўся!

Але на ўсё ёсць мера. Раскладушка прысвечана „нашым караням”. Вучоны Гай Дук усхваляе мангольскіх заваёўнікаў (цяпер святых велікамучанікаў). Знаходзіць ён між Бугам і Нарваю астанкі выкапнёвага сінантрапа і на падставе памераў рэштак першабытнага мозгу робіць выснову: наша гняздоўе ў славутай дынастыі Маа.

Ля тэлетайпа карэспандэнт агенцтва Сіньхуа Ла Тыш-юнь і прадстаўнік усекітайскай радыёкампаніі Ва Ўра-нюк. Заглыбленыя ў нататнікі, перадаюць у свае цэнтры падрабязнасці капітальнага адкрыцця маанскай навукі. Ашалелі яны, ці што?

Не спіць у шапку і д-р Чык Він. Ён паспяхова перасаджвае на наш літаратурны палетак паўзабыты плод „Ста кветак”. Кітайскае каліва ў нас будзе звацца „Сто Васількоў”.

Новае і ў гайнаўскім музеі. Я Цэ піша, што жрэц Май Сень-янь мяняе характар помніка. Днямі адкрыў выстаўку аб гадоўлі качак у правінцыі Цзянсу.

На Далёкі Усход накіравана і нястомная падарожніца Ча Чу-га. У першай карэспандэнцыі захапляецца непраўдападобным багаццем „Жывапісу кветак і птушак”.

Хутка перапраграміраваліся ніўцы. Толькі Швэ Дунь, як і я, разгубіўся: не ведае, у якую трапіў Рэч Паспалітую. На ўсякі выпадак высмажыў двухрадкоўе:

Знікла ў бяспамяцтве Б(я)ДА.
На новы шлях! Жыве Буда!

А сакратар маўчыць, упёр вочы ў гранкі і крэмзае свае іерогліфы.

Выходзячы з рэдакцыі, даведваюся:

— А як цяпер велічаць Лубу?

— Лу Ба, — зардзелася Рамашка.

Тут, як чорная хмара, урываюцца ў рэдакцыю маанскія хунвейбіны. Хапаюць мяне пад рукі і цягнуць у белавытоцкі „Храм неба” на маральнае ачышчэнне. Балазе пагада блізка, на месцы былой царквы св. Мікалая. Увапхнулі ў храм. Праняло холадам. У цэнтры варожая гранітная глыба. Падштурхнулі да яе.

— На калені — і кайся! — камандуюць.

А я здранцвеў і не магу вымавіць слова. У мармуровай глыбе апазнаю застылага Сакрата Яновіча. Напрарочыў! У такім менавіта выглядзе з'явіўся ён у маёй макатранскай гасцёўні. Будзе мне!

І варухнуліся каменныя губы маанскага Буды:

— Усё чысты? — секанула глыба. — Парахуемся, — зашыпела. — Я табе пакажу „Макатразмы”!

І я пашкадаваў, што запрасіў Многапуддзе ў „Гасцёўню”.

А яно разыходзіцца:

Стаў да чэрні задам,
Паплёўвае ядам...

З пагардай цытуе мае радкі.

— Дам я табе зад! — выбухае гневам. І перапоўнены пачуццём уласнай вялікасці, загадвае хунвейбінам:

— Надзець на паганца дошку ганьбы!

„Божа, навядзі яго на розум” — малюся, згінаючыся пад цяжарам ярма. А глыба не сціхае:

— Рэліктавы, збранзавелы гегельянец! — захлынаецца ад злосці, успомніўшы злашчасную фразу, якою я вітаў яго ў час сяброўскай гасціны.

Хунвейбіны натапырваюць вушы, пада мною падгінаюцца калені. Глыба варухнулася, адчужылася і выдыхнула з палёгкай прысуд:

— На мыла...

І я праваліўся ў яву.

Рэдакцыя.

— Ужо ачысціліся? — праменіцца Рамашка.

Усё перамяшалася. Аб чым яна? І схамянуўся: на маіх грудзях боўтаецца шыльдачка „Чысты". Хто яе мне павесіў? Але не знімаю адзнаку і кажу:

— Я заўсёды быў чысты.

Рамашка паблажліва ўсміхаецца і прапускае да шэфа. Мірановіч вярнуўся з Міністэрства культуры. Мала грошай далі на „Ніву". Чамусьці вінаваціць у гэтым Лукашэнку і БГКТ. Дае пачытаць эпісталу былога ніўскага карэспандэнта, цяпер актывіста Русского общества, які страшна паганіць беларускіх дзеячаў — мужиков.

— Бред сивой кобылы, — у тон прачытанага, стаўлю дыягназ. Шэф згаджаецца, але трызненне пярэваратня з перамешчанымі ў азадак мазгамі пусціць у друк.

— Гэта ж руская думка.

Дуба нармальны. Першы працягвае руку. Уручае свежы нумар „Нівы". І тут усё па-старому. Барскі ўсыпляе серыялам „Радзіма — родзіна" і не спадзяецца на Кітай. Гайдук будуе гняздоўе на белавежскіх каранях, Латышонак справаздачыць пасядзелкі, Ваўранюк сілкуе то „Ніву", то радыё, Чачуга трымаецца хаты.

Аднак вяду сябе стрымана. Моцна ўелася ў душу чорная маоцзэдунка Лу Бы.

Расслабіўся, калі ўвайшоў Чыквін і, зірнуўшы з прызнаннем на маю нагрудную шыльдачку, здаў у камп'ютэрны набор „Макатразмы". Пацешыла і вестка з Гайнаўкі: Майсеня асвяціў Беларускі музей і адкрыў выстаўку маладых мастакоў.

Добрага настрою не папсаваў нават вечна незадаволены Швэд. Плюючы на сістэмазменны час, прынёс пакаянную:

Знік у бяспамяцтве Буда.
На новы шлях, БДА!

І выклікаў злога духа. У праёме дзвярэй з'явіўся Сакрат Яновіч. Глянуў непаразумела на ніўскую эліту і жахнуўся:

— Усе чыстыя?! У, як вы мне абрыдлі!.. — цяжка выдыхнуў і, памянуўшы чорта, здаў нас на ласку чысцілішчнай інстанцыі.

— А я іду на рыбалку, — ухмыльнуўся.

І пайшоў. Мы завылі па-воўчы і стужка соннай дылогіі абарвалася.

Што б гэта значыла, Астронка?

## Адказ Сідару

Ну і напужаў ты мяне. Гэта ж які сон страшны табе прысніўся: свае ды кітайцамі сталі. Краіна чужая, свае — не свае... Ты трапіў у жахлівы лад: аднагільдзейцы памянялі свае прозвішчы і назву газеты, апрануліся ў кітайскую форму, а царкву перарабілі на пагаду. Усё зрабілі пад кітайшчыну, стоячы на „Смірна!”

У гэтай рэчаіснасці ўсё было ўжо інакш, нібы па-новаму, як і трэба, а вось жа агарнула цябе жудасць, бо загадалі табе ачысціцца.

А з чаго ты, братка, меў ачышчацца? Ці награшыў так шмат у сваім жыцці, ці людзей крыўдзіў больш за іншых, а мо ты біў жонку або свінню земляку падлажыў, ці пярэваратнем быў, ад сваіх адцураўся? Ну, гэта то ты найлепш будзеш ведаць сам. Але ці тыя кітайцы ведалі, што робяць, калі загадалі табе пакаяцца? Самі, нябось, каяцца не мусілі — яны як раней, так і цяпер найлепшымі, у авангардзе былі.

А цябе вось, бачыш, „на мыла” прызначылі.

Што датычыць другой часткі сну, калі ты паявіўся сярод тых жа людзей з шыльдачкай на шыі: „чысты”, дык гэты раздзел быццам пацвярджае папярэдні: хто кім ёсць у сапраўднасці, тым і застаўся. Змяніліся вятры — змяніліся і яны. Новая формула — паводле патрэбы. А ты ренегату не вер! Хай Бог сцеражэ цябе ад сяброў, а з ворагамі дасі сабе рады.

*Астрон*

Астрон паставіў братчыкаў да ганебнага слупа. Сцеражыся сяброў! І Сідар пачаў касавурыцца на нас. Крыўдна, а што зробіш?

## Карпуша і Мар'я Міхайлаўна

Барскі ў балавежскіх жанчын прыкмеціў вялікія цыцкі. Хто аб чым думае, тое і бачыць. Іншы візіцёр, Генрык Сянкевіч, наогул у Пушчы пухкага полу не заўважыў, затое ўвекавечыў лесуноў: высокія,

вельмі шчуплыя, амаль худыя, з незвычайна далікатным колерам твару, якога ў іншым месцы не ўбачыш. Амаль усе шатэны з вялікімі задуменнымі вачыма. Прыгожы твар, сімпатычны, натхнёны, крыху хмуры — вядома, лесуны!

Ці не з Карпа Валкавыцкага ляпіў Нобелеўскі лаўрэат помнік белавежца? Не, завітаў да нас у 1882 годзе. Але мог Карпа кланіраваць. Як бы там ні было, а накідаў дакладную копію будучага Карпушы.

І Карп ведаў сабе цану, едучы ў сваты да півачынскай Манькі. Слава аб красуні дайшла ў Белавеж пры жывым удзеле ейнага татулі. Міхалка Улезла меў шэсць дачок і ўсе выдаў у добрыя рукі. У час перадвясельнай агітацыі гаварыў адно:

— Гэта мая самая любімая дачка.

А Маня, апрача прыкмет добрай, разумнай і прывабнай дзяўчыны, яшчэ і валодала цудоўным голасам і адменна іграла на гітары. Цыганскай красы півачынка заваражыла Карпа канчаткова. Пашчэнсціла мне, думаў ён, везучы свой жывы скарб у родную хату. Манька таксама шчаслівая, едзе ж не абы-куды, а ў Белавеж. З усіх сясцёр толькі ёй сапраўды ўдалося выбіцца ў людзі.

Мужава „памесце” прыгасіла распаленую ўяву рамантычнай малодкі, але не аж так, каб уцякаць пад бацькаў дах. Узяла справу ў свае рукі і запушчаную сялянскую хату пераўтварыла ў „дваранскае” гняздо.

І праз адчыненыя вокны паплыла на ўсю Гулачку песня пра чорныя вочы. Быццам песня была пра Карпаў скарб. Ах, тыя цыганскія вочы, што вы зрабілі з Карпам! Стаў ён Карпушам. Сябе ж чараўніца наказала велічаць Мар'яй Міхайлаўнай.

Так і пачалі называць сужонства, спярша суседзі, а затым увесь Белавеж. Прозвішча, як непатрэбны прыдатак, адпала. На ўсё жыццё, Карпуша! — кожнаму ясна, хто. Тым болей — Мар'я Міхайлаўна, галоўная фігура царкоўнага хору.

Жылі згодна. Карпуша ў полі бульбу капае, Мар'я Міхайлаўна на ганку брынькае на гітары. Нарадзілі двух сыноў. Раслі хлопцы, як дубкі. Выгналіся, знайшлі месца ў футбольнай камандзе, значыць — і працу ў тартаку.

А тым часам ідылія дала трэшчыну. Мар'ю Міхайлаўну ўпадабаў аўдавелы падпанак Іван Смактуновіч.

Кліча ён Карпушу да Нэхі (рэстаран мясцовага значэння), і кажа:

— Слухай, Карпуша, прадай мне сваю жонку.

— Бяры! — без торгу згадзіўся Карпуша.

Справу тут жа апілі і Мар'я Міхайлаўна перабралася на Стачок, з драўлянай лаўкі перасела на скураную кушэтку. Цяпер стала сапраўднай паняй. І дом на ўсю Белавеж, і муж не мужык.

Карпуша не застаўся ў даўгу. На гэты раз паехаў па сяброўку жыцця на заходні бок Пушчы. Між дужкамі скажам, гэты напрамак выбіралі практычныя бабылі, якія ў жонцы найбольш цанілі цяглавую сілу. І прывёз Карпуша рабацяшчую матанку. Матанамі лесуны называюць палюхоў, тых, што за Гайнаўкай. І на старасці гадоў Карпуша адчуў смак жыцця. Выпрастаўся, прасвятлеў. Не згорбіўся і ў дзевяноста гадоў: высокі, шчуплы, амаль худы, пераржыў абедзве жонкі і горда адышоў у бясхмурны свет.

Без страху старэла і Мар'я Міхайлаўна: да канца сваіх дзён захавала жаноцкую прывабнасць і вернасць свайму хору.

Што тычыцца Івана Смактуновіча, то вызначыўся ён славутай берлінскай „аперацыяй”. У вайну немцы разбілі нашу царкву. Разбілі — хай і паладзяць, вырашылі прыхаджане і, па старой звычцы, накіравалі ў нямецкія вярхі хадакоў. Узначаліў іх Смактуновіч. У лыкавых лапцях, у белых зрэбных нагавіцах, у такой жа кашулі, падпярэзанай каляровай вяровачкай, нагадваў палешука з этнаграфічнай энцыклапедыі.

І, відаць, зрабіў належнае ўражанне на Герынгу, уласніку Пушчы, бо фельдмаршал задаволіў просьбітаў і царква адбудавалася. Праўда, грамадскі пачын хадакоў не прызнала народная ўлада і наш герой атрымаў належны тэрмін. Ды гэты эпізод таксама ўставім між дужкі: царква ачысціла Смактуновіча і ён датэрмінова вярнуўся да Мар'і Міхайлаўны, сямейнае кодла не распалася. Галоўнае наперадзе.

## Сіндром Прылажынскага

Восенню 1953 года, калі я быў ужо на апошнім курсе, выцыганілі мы ў СП СССР аўтобус, і нас, студэнтаў, пачалі падкідаць з Перадзелкіна пад сам Інстытут. Падсядала да нас і Паліна Карлаўна, жонка нейкага класіка. Аднойчы пачула яна маё прозвішча. Падышла і пытае, адкуль я, ці не сваяк Пеці Валкавыцкага. І ўдакладняе: маці настаўніца, бацька ляснічы. Здагадваюся аб кім рэч. Мар'я Міхайлаўна — настаўніца? Карпуша — ляснічы?

— Пеця пасля ранення адпачываў у нас, — працягвае Паліна Карлаўна. — Цікава, які яго лёс?

Хлопец быў спраўны. Бачу, гараць у жанчыны вочы. Мо і раман круціў з Палінкай? Інакш, навошта было яму скрываць класавае паходжанне. Да вайны падобным прыёмам карыстаўся Прылажынскі,

Крапіўніцкі кавалер. Быў „стральцом" і на дзіва прыгожым хлопцам. („Strzelcy" — ваенізаваная маладзёжная арганізацыя: My — Pierwsza Brygada, strzelecka gromada!). На „стралецкіх" зборах услужыў не адной сяброўцы голаў. І кожнай адрас Дай. А дасі — засмяюць: Kropiwnik! Хлопца смаліла беларуская крапіва. І ён перайменаваў родны кут на вуліцу Józefa Piłsudskiego. І адпаведна рангу лясной сталіцы Польшчы, прысвоіў і сабе сціплы тытул. І паплылі пісьмы do rąk własnych Wielmożnego Pana Leśniczego na ulicą Józefa Piłsudskiego. Даў форсу!

Хіхікалі белавежскія паштары дастаўляючы пошту на прыбздзюшную задрыпанку. Смяяліся з летуценніка Крапіўнік і Застаў, ды і сам Прылажынскі не скрываў падвоху. Каб не вайна, як піць даць, даслужыўся б „стралец" і да звання „выўратоўца" — за абразу памяці Komendanta.

Немцы, хоць і шанавалі Пілсудскага, але „камендантцкую вуліцу" спалілі, а крапіўнічан вывезлі ў Беласток. Пасля вайны беззямельнай бядоце не было да чаго вяртацца. Недзе пад Беластокам асеў і Прылажынскі.

Значыць, і „Лятух" захварэў на „сіндром Прылажынскага"! Моцна ўстрамілася панскасць у камсамольца. Былі разам на лесаўпарадкавальных курсах. Я паехаў на Свіцязь, ён — у армію. Што ж, пацешу Паліну Карлаўну:

— Жывы. У Гродне.

Цяпер на Бандзюзе, дзе стаяў Крапіўнік, узнік скансэн і праваслаўны цэнтр. Усё тут новае, напоўненае духоўнасцю, а за вуглом цікуе „сіндром Прылажынскага".

У застольныя гады БГКТ падхмелены міністэрскі палкоўнік хваліўся кроўнымі сувязямі: жонка з Белавежы. Ці часам не сваякі? Яшчэ якія! Дачка „ляснічага" з блізкага куста. Адукаваная палкоўнічыха нават роднаму мужу не выдала свайго нізкага паходжання. Засакрэцілася.

Якія ж тады белавежцы? Натхнёныя мройнікі, як і прыкмеціў вялікі польскі рамантык. Праўда, мараць безнадзейна, прыземлена. Яшчэ не дайшла да мяне чутка, каб нейкі лесунок, трапіўшы ў сталіцу, хваліўся бацькам — уласнікам Пушчы.

А чаму б і не? Як марыць, дык без цугляў! Асабліва ў час паўсюднай прыватызацыі. Не дазваляе пачуццё ўласнай няпоўнавартаснасці? Вераб'і ў паўлінавым пер'і?

## Калакуста

Падаляны, як Стачок і Застаў, жывуць аўтаномным жыццём. У падалянцаў адрозная гісторыя, іншыя героі, звычаі, асаблівасці мовы, свой солтыс.

Адкуль прыйшлі? Праліць святло можа Калакуста — абрад, які яшчэ жыве ва ўспамінах падалянскіх старажылак. На Тройцу дзяўчаты выбіралі за Калакусту вясковую красуню. Адзявалі яе ў зялёны строй з кляновых і ліпавых галінак, што было не пазнаць ці то дзяўчына, ці куст, і вадзілі Калакусту з песнямі па вёсцы.

Між дужкамі: калакуста — каля куста. Белавежская „кала” — каля.

Надзея Руско падспеўвае:

Калакуста, калакуста;
Сачавіца, расці густа!

Ой, вясна, вясна!
Што ты нам прынясла?
Дзяўчаткам па вяночку,
Хлопчыкам па кіёчку.

Дык арэал абраду Куста, як сведчаць беларускія даследчыкі, абмяжоўваецца Піншчынай, суседнімі з ёй раёнамі Украіны і часткай былога Слонімскага павета. Мабыць, з гэтага абшару і прыйшлі заснавальнікі Падалян: Байко, Вашкевіч, Казак, Ліцкевіч, Падлашчык, Пекач і Руско.

І пасяліліся за Нікаравай забалаццю. Мелі свае спосабы на жыццё. Каўтун адбівалі на камені — не абрэзвалі, каб баба не аслепла. А калі наступала сухое лета, выручаў стары метад: у працягу адной ночы трэба было напрасці і выткаць ручнік, і да ўсходу сонца абысці з ім усё поле.

## Падалянскія мянушкі

Мянушка — другое імя лесуноў. Як правіла, раскрывае носьбіта. Чаму б і нам не прыадкрыць падалянцаў. Тым больш, што Алена Анішэўская падкінула цэлы мяшок дэшыфраванай канспірацыі. Алена — з падалянскіх Казакоў, па-тутэйшаму Лёлька. Збіральніца хуткаплыннага. Умее схапіць прыкметы часу. Прыхільніца нашага брацтва.

Пакарыстаемся сяброўскай дапамогай.

„Кудзеля” — такую мянушку насіў селянін, які надта любіў жаночую працу. Памагаў жонцы апрацоўваць лён. Нават за кросны сядаў. „Кудзеляй” або „ Кудзелькай” звалі яго ўсё жыццё. Нашчадкаў не меў. Памерла і мянушка.

„Злоцік” усё змяншаў: „мая кароўка”, „загончык зямелькі”, „мае вы залаценькія”. Вось і зарабіў „Злоціка”. Жонка — „Злоціха”, дзеці — „Злоцікавы”.

„Надуты” — вельмі ганарлівы, з цяжкім характарам.

„Калючы” — востры язык, усіх „уколе”.

„Блізнюк” — з блізнят. Жонка — „Блізнючыха”, дочкі і сыны — „Блізнюковы”.

„Казіброд” — быццам ад нейкага здарэння ў бродзе ракі. Мянушка перайшла на ўсіх нашчадкаў.

„Томскі” — у бежанстве быў у Томску і вельмі гэтым ганарыўся. Жыве ўжо трэцяе пакаленне „Томскіх”.

„Валыняк” — падобная справа.

„Зусел” — цікавінка. У 1922 годзе ў маладога гаспадара пасяліўся афіцэр з войска Балаховіча. Называўся Зуслоў (Суслоў?). З Зуслова (Суслова) выйшаў „Зусел”. Неўзабаве ў клуні гаспадара кватарант застрэліўся. Мянушка перайшла на гаспадара.

„Пшаніца” — першы пачаў сеяць пшаніцу. Мянушку носяць і ўнукі.

У спісак даўгавечных трэба ўключыць „Шэўчыкаў” і „Войтавых”. Зусім загінулі „Цэбрыкі”, „Клепачы”, „Кадушкі”, „Чучальнікі” і, перш за ўсё, „Маскалі” і „Маскалёнкі”. „Маскалямі” называлі вярнуўшыхся на бацькаўшчыну старых салдат.

Барыс прыгадвае Пекача. 25 год праслужыў на Далёкім Усходзе. Дамоў вяртаўся пяшком. Ішоў тры гады. Ажаніўся, калі яму было пад пяцьдзесят.

## На падземнай рацэ

Падаляны пладавітыя, разрасліся, расчлянiліся на „старыя” і „новыя”. Затым атрымалі і нумарныя знакі: I і II. Выбіраючы месца пад жытло, першыя пасяленцы не ведалі, што паставілі свае хаты на падземнай рацэ. Пакуль чэрпалі ваду ў Нараўцы, скрытая стыхія маўчала. Але пачалі капаць першы калодзеж — і яна выбухнула з магутнай сілай, ледзь капачы ўцяклі з долу.

— Нячыста вада! — крычалі людзі.

А яна залівала панадворкі і агароды. Узнікла паніка.

Прыехаў Калакольцаў, кіраўнік Пушчы — белавежскі бог, цар і воінскі начальнік. Набраў у біклагу „шалёнай" вады, глытнуў, пасмакаваў і аб'явіў:

— Вода чистая! — і дадаў: — Можете пользоваться.

Параіў таксама выкапаць роў, каб вада сцякала ў Нараўку. І людзі ўтаймавалі вырваўшагася на волю падземнага звера.

Сёння падалянцы карыстаюцца водаправодам. Стары калодзеж пайшоў у адстаўку. Стаіць забыты і апанураны. А вада ў ім вышэй узроўню зямлі. Цяжка глядзець на гэту самоту.

### Па Пружанскай дарозе

Старыя Падаляны захавалі і доўгія прысядзібныя, упапярок травяністай вулічнай паласы, лаўкі. З іх добра праглядаецца вёска і скрыжаванне дарог. Той нясецца з Застава, гэты са Стачка, а сей прэ на Падаляны II або ў лес. За цара сюдэма бегаў у павятовыя Пружаны Святы Філіпка. Хада ў паштовага кур'ера была фенаменальная. Калі нехта хацеў яго падвезці, светлавалосы Філіпка толькі махаў фурману рукою:

— Хутчэй буду пяшком...

Вялікай дабраты быў чалавек. Таму і назвалі яго святым.

Да чыгункі, Пружанская дарога іграла ролю асноўнага злучніка Белавежа з вонкавым светам. Нашы продкі настаўлялі вушы, перш за ўсё, у гэты бок. Па Пружанскай дарозе рухаўся не толькі Святы Філіпка. На абладаваных гаршкамі, соллю і крупамі фурах каціліся па ёй у Белавеж шарашоўскія жыдкі. Уедуць між будынкі і крычаць:

— Бабы, гаршкі! Бабы, гаршкі!

Або:

— Бабы, анучы! Бабы, анучы!

Значыць, вы нам старыя анучы, мы вам — новыя гаршкі.

З усходнім бокам, як вы ўжо ведаеце, існавала інтымная вязь, і стачкаўлянскі гарманіст Юрко ў мілай аколіцы быў званым госцем. Ён і прынёс вестку, што за Падалянамі на Воўчым багне начуе чорт.

На гэты раз Юрко гуляў у Роўбіцку. Нагуляўшыся, павесіў гармонь на плячо і падаўся дахаты. Роўбіцк за Белым лесам, шмат дарогі, змарыўся, пакуль дайшоў да Высокай гары. Думае, прысяду на сухім, адпачну. І здрамнуў. Прачнуўся — ноч. Працірае вочы, ажно з зарасніку высоўваецца элегантная пара: мужчына і жанчына. Яны быццам каравулілі яго. Завуць у госці, просяць пайграць.

Юрко адмаўляецца: маўляў, стомлены, позняя пара. Але пачуўшы, што добра заплацяць, згадзіўся іграць. І пайшоў за панствам.

Ідуць лесам, кіруюць у бок Воўчага багна. Утапіць хочуць мяне ў балоце, падумаў Юрко. Не паспеў высветліць абставін, як сярод дрэў паказаўся панскі двор. Бліскучым святлом ззяў пышны палац. Сцены абцякаюць золатам. Пад сценамі расстаўлены сталы, за імі госці: многа іх, усе шыкоўна апрануты. Уверсе каляровыя лямпачкі. Казка!

Сеў Юрко на пяньку пасярод паноў і пачаў іграць. Госці завіравалі ў танцы. Юрко надзівіцца не можа, як паны плаўна танцуюць. Раптам прыкмячае, танцоры падыходзяць да палацавых сцен, мацаюць іх пальцамі і прыкладаюць гэтыя пальцы да вачэй. Пачакайце, і я зраблю так, падумаў Юрко, і ў перапынку падышоў да сцяны. Убачыў мазь, падобную на жывіцу, якою аблеплены быў палац. Памазаў гэтым вочы і пачаў іграць. Што гэта? Бачыць, танцуюць чэрці! Спалохаўся. Іграе — не іграе. А чэрці пытаюць:

— Чаму ты пачаў фальшывіць?

— Змучаны, хачу дахаты, — адказвае Юрко.

— Пайграй яшчэ крыху, — угаворваюць чэрці. Паддаецца, іграе. Ажыўляецца: зніклі чэрці, зноў

танцуюць паны. Хіба я, сапраўды, перамучаны. Падышоў Юрко яшчэ раз да сцяны. На гэты раз пашмараваў залатой маззю толькі адно вока. У той жа момант з'явіўся гаспадар. Юрко атарапеў: пашмараваным вокам бачыць чорта, а непашмараваным — пана.

Пара адсюль уцякаць, падумаў, і папрасіў плату. Гаспадар выклаў на стол грошы. Юрко заплюшчыў непашмараванае вока і пацягнуўся да грошай. І зноў разгубіўся: гэта ж шышкі, а не грошы!

— Ну, такой платы я не хачу! — закрычаў. Гаспадар прыкмеціў, якім вокам музыка ўбачыў

падман і вылупіў яму гэтае вока.

Калі Юрко расказаў сваю прыгоду белавежцам, ніхто яму не паверыў.

— Вяртаўся п'яны, у лесе напароўся на сук, выкалоў вока, і яму сорамна прызнацца, — тлумачылі людзі.

З часам і Юрко паверыў у такі варыянт.

Аднак на Воўчым багне начуюць чэрці. Сядзім з Барысам ва ўрочышчы Дубіны на паваленых дубах пры старым тракце. Барыс расказвае аб паграбах, раскіданых навокал, у якіх падалянцы перахоўвалі бульбу. Ідзе Бармута з ягайлаўскай леснічоўкі. Запрашаем на дубы. Не хоча сядаць.

— Дзіўна вадут сябэ ваны, — кажа. — Усё парамашчаюцца, як бы ім было не ўсё роўна, дзе ляжаці.

Месца, сапраўды, няўтульнае. Рукой падаць — Воўчае багна, а ў катлаване раскапанай „дубінскай" вышыні брацкая магіла з часоў

нямецкай акупацыі: 486 непражытых жыццяў. Пануры след нячыстай сілы.

Успомніўся 1941 год. І я вяртаўся з вогненнага наваградскага катла абтопаным Святым Філіпкам шляхам. Дубіны не прынялі яшчэ злачынства захопнікаў, а ўвайшоўшы на гэты ўзгорак, пачуў у грудзях дрыготкае шчымленне. Не пакідала яно мяне і на падалянскім скрыжаванні, таму не прыкмеціў ні вёскі, ні людзей. А разявакі, мабыць, сядзелі на лавачцы і шкадавалі:

— Выйшаў „Ванька” з лесу. Ідзе здавацца немцам.

Быў я ў скураных ботах і шэрым галіфэ — чым не савецкі лётчык? З падалянцамі незнаёмы, не высвятляў у іх сваёй сітуацыі. Асведаміўся ў Аляксандра Валкавыцкага, застаўлянца, які пабудаваўся ў Каўшку, пры Падалянскай дарозе.

## Падаляны — шырокая гуліца

Упершыню трапіў я на Падаляны дзесяцігадовым хлапчуком, калі памагаў бацьку перавозіць хату. Уражвала тутэйшая глуш, урослыя ў зямлю хаціны. Здавалася, ніхто ў іх не жыве, стаяць пустыя — бяры, разбірай і вязі, што мы і робім.

Але вёска жыла. Ціхімі адвячоркамі даляталі з яе на Застаў дзіўныя песні. У нас, на Шашы, песенная традыцыя ўжо знікла. А, мабыць, яе тут і не было? Шаша спявала толькі ў час вясельнага застолля.

Жылі побач, а ўсё задзіралі насы, быццам мы лепшыя, і насміхаліся з суседзяў:

Падаляны, Падаляны —
Шырокая гуліца.
Параз тыя Падаляны
Параскочыт курыца!

А самі не з вусамі. Наша „гуліца” мала чым адрознівалася ад падалянскай, хіба што большымі равамі. А чым горшае іхняе „шчоканне” ад нашага „шчокання”? Праўда, яны хадзілі ў зрэбным, а мы ўжо выбіліся з кужалю. Ну і бароліся падалянцы інакш.

— Давай, паборамса!

— А як?

— Лабамі.

Урэшце зніклі падзелы. Падаляны атрымалі статус раўнапраўных белавежскіх вуліц, а ў нечым і высунуліся наперад. Напрыклад, у пабудове дарог — поўная асфальтызацыя.

Немалы ўдзел падалянцаў і ў пракладцы Сонцастрады, як мы з Барысам назвалі дарогу праз багну ў Пагарэльцы. Буднікі байкатавалі пачын, хоць дарога прынесла ім найбольш карысці, а падалянцы выйшлі на пабудову. Гарачай завадатаркай дарожнага пачыну была Барысава маці, тады сакратар партыйнай арганізацыі. Веруючая, як і большасць белавежскіх парпістаў, давала прыклад сацыялістычнай працы. Было нармальна. Але апаратчык, які апекаваў пярвічную арганізацыю, атрымаў сігнал: Надзея Руско рэгулярна наведвае царкву. Выходзіць, двурушнасць. Едзе руплівец на пачын і павучае ўдарніцу: маўляў, працуеш выдатна, і за гэта хвала табе, але вось, даведваюся — ходзіш у царкву. Непрыстойна партыйнаму важаку...

Пакрыўдзіў апякун паню Надзю недарэчным дакорам: яна ж свайго раздваення ад нікога не скрывала. Адказала з горыччу:

— Ніякага няма тут двурушша: я душою за царкву, а сэрцам за партыю!

І паставіла адубелага ад дыямата апаратчыка перад адступніцкай дылемай: што вышэй — душа ці сэрца?

Нягледзячы на ідэйныя завіраванні, маем дарогу, сонечную асфальтавую стужку ўздоўж балоцістай поймы Нараўкі — з відам на дрымотную сцяну Нацыянальнага парку з парэчкавым падлескам.

Да будніцкага поля цягнуцца бацькоўскія рэскі. І аб іх верш.

**Пад лесам**

Сцелісты лесе, добрага рання!
Прымі з дарогі ў прытулак скрытны.
Маўчыш. І толькі на кліч вяртання
Азвецца пойма драчавым скрыпам.

Упоўдзень зашухкае клін асаковы,
Косы ўваб'ём над паніклай травою,
Ты нас асвежыш парэчкавым сокам,
Густою засенню — лісцяў страхою.

З'явіцца ноч, над табою застыне,
Чэмерам стомным водар пранікне —
Сальюцца ў мроях блуднага сына
Сцены Каносы з пошчакам Нікі.

Сляды касца цяпер пад заказнікам.

## Герцэнаў звон

Пятро займеў ксеракопію „белавежскіх” артыкулаў слыннага Колокола. І азваўся Герцэнаў звон. „Дрымучая справа” ўскалыхнула нас. Колькі знаёмых герояў! Якія жывучыя! І непаражальныя! Сілачы, рассоўваючыя часовыя межы. А можа, развіваемся назад?

**Пераказ.**

Вырубка карабельных дрэў у Белавежскай пушчы — адна з самых жудасных спраў цяперашняга каравання. Пушча складаецца з 112 тыс. дзесяцін суцэльнага лесу, яшчэ нядаўна свежага, густога і дзіўнага па сваіх эканамічных якасцях. Гэта быў у заходняй Расіі адзіны ўзор лясоў амаль першабытных. Наш флот меў у ёй самы багаты запас мачтаў на караблі ўсіх рангаў і наогул велізарны запас караблебудаўнічага матэрыялу. Таму пушча заўсёды была заказнікам, і ў саракавых гадах міністэрства дзяржаўнай маёмасці адмовіла нават флоту ў загатоўцы ў ёй карабельных матэрыялаў. І гэтай пушчы ўжо няма. Яна перайшла ў кішэні двух яўрэяў, у выглядзе чатырох ці пяці мільёнаў срэбрам, і ў кішэні рускіх чыноўнікаў, пачынаючы ад Гамалея і да розных дробных казявак. З'ездзіце ў Белавежскую пушчу і вам бадай пакажуць, каб абдурыць вас (як абдурвалі і гасудара на паляванні ў 1859 годзе), пышныя, разложыстыя дрэвы, пільна захаваныя дзеля ашуканства. Ды ўсё гэта трухлявыя старэчы, прыгажуны і больш нічога, ад якіх няма ніякай карысці. Рэшта, што складала сілу, значэнне, вартасць пушчы, у кішэнях жыдоў.

Пачалося з таго, што калі ўстанавіўся корпус ляснічых, навука заўважыла, што ў Белавежскай пушчы лес асмельваецца вырастаць шкодным чынам сам праз сябе, зусім не па правілах навукі. Мясцовае кіраўніцтва не магло далей устрымацца ад спакуслівых выгад; яно адразу выстаралася, з мэтай выканання плана навукі, высачэйшы дазвол на вырубку перастойных дрэў. Можна сабе ўявіць, як тут узяліся за перастойныя дрэвы. У 1849 годзе яўрэй Заблудоўскі атрымаў па кантракту, па мізэрнай таксе, права на вырубку. Найлепшы карабельны лес пайшоў за мяжу.

Ды хутка другі яўрэй, прускі лесапрамысловец Зімундт, замест таго, каб далей купляць рускі лес ад Заблудоўскага, у 1854 годзе непасрэдна звярнуўся ў лясны дэпартамент і пад фірмай нейкага Бугенгагена, нягледзячы на ваенны час, калі карабельны лес значыць столькі ж, колькі пушкі, бомбы і порах, заключыў з гэтым дэпартаментам

кантракт на вырубку ў Белавежскай пушчы 60 тысяч дрэў, на суму 60 тысяч рублёў срэбрам. Вядома, пасля такой здзелкі ён зараз жа ўзяўся за працу.

У Данцыгу белавежскі лес цаніўся высока, цэлыя транспарты дрэў звычайнага нават памеру прадаваліся па 70 талераў за штуку, а мачты па 200 і нават па 400 талераў. Значыць, справа не ў 60 тысячах талераў, а ў мільёнах. Заблудоўскі жахнуўся ад штучкі былога супольніка, гродзенская палата дзяржаўнай маёмасці ледзь не самлела — яна дагэтуль вяла свае махінацыі па Белавежскай пушчы пад цішком і жыла ў дастатку. Ды яна плакала і рвала на сабе валасы нядоўга; новы спекулянт суцешыў дзяржаўную палату — панёс страту адзін Заблудоўскі.

Раптам у 1855 годзе граф (затым з размякчаным мозгам князь) Арлоў атрымлівае з-за мяжы данос аб вырубцы з Белавежскай пушчы карабельных дрэў, аб незаконнасці кантракта і аб цэлай хмары злоўжыванняў. Данос перададзены міністру Кісялёву. Той пасылае ляснічага разведаць справу на месцы. Вядома, ляснічы ніякіх злоўжыванняў не знаходзіць і ўсхваляе нават у газетах ісцінанавуковае кіраўніцтва пушчы.

Аднак гродзенскі губернатар Ховен (бадай адзіны сумленны чалавек у гэтай гісторыі) настойліва патрабуе ад міністра правесці сапраўднае даследаванне.

Назначылі следчую камісію (1856 г.). Вельмі салідную: палкоўнік Прасолаў, ляснічы Вайнюкоў, чыноўнік ад генерал-губернатара Тарkasaў і Гацкевіч (уласна Гацук, з аднадворцаў), усе штаб-афіцэры; урэшце, для агляду дрэў прыбыў спознены чыноўнік Марскога ведамства Пагоскі; губернскі ляснічы са сваім штатам таксама пасяліўся ў Белавеж ы.

Уся гэта камісія размясцілася ў доме лесапрамыслоўца, раскошна ўладжаным у самым цэнтры пушчы, на поўным і шчодрым утрыманні яго. Як з зямлі вырас гэты дом, з дыванамі, люстрамі, буфетамі і партрэтамі такіх асоб, прыяцеляў гаспадара, што ў першыя хвіліны шмат хто не адважваўся расшпіліцца перад імі. Гаспадар забаўляў нясмелых прастакоў расказамі аб сваёй інтымнасці з імі. Тут у падтрымку прыйшло і ўласнаручнае пісьмо прынца прускага, таксама ягонага сябрука. Яно і ашаламіла ўсю кампанію. У доме лесапрамыслоўца ад раніцы да вечара камісія балявала.

А між тым лес спешна сплаўляўся за мяжу — акалічнасць, на якую найбольш спадзявалася камісія і дэпартаменты (лясны і караблебудаўнічы), аплачаныя Зімундтам.

Аднак міністэрства пачало націскаць і камісія, па неабходнасці развітаўшыся з гасцінным гаспадаром, пайшла ў лес даследаваць пні (амаль усе былі пафарбаваны пад старыя дрэвы), потым яна прывяла на допыт і прысягу сялян, папярэдне напоеных колькі трэба, і — натуральна — не знайшла абсалютна ніякіх злоўжыванняў. Данос ілжывы — заключыла. (Раней Зімундт паклікаў да сябе беднага шляхціча, які таксама на яго даносіў і сказаў: "Вось вам 1500 рублёў срэбрам. Лепш вазьміце іх і аб'явіце, што зрабілі на мяне паклёп са злосці. Вы і так будзеце ў Сібіры, камісія нічога не знойдзе. У вас 11 дзяцей і жонка, грошы спатрэбяцца. А мне клопатаў менш". Няшчасны згадзіўся і пайшоў у Сібір).

Большая частка камісіі лічыла справу закончанай і ўжо раз'ехалася, калі раптам чыноўнік марскога міністэрства атрымаў новыя інструкцыі. Карабельны дэпартамент загадваў перагледзець увесь сплаўны лес. Пагоскі з Таркасавым адправіліся ў царства польскае. Вайнюкоў тут жа зразумеў небяспеку і ў жаху папёр у Вільню, а адтуль у Пецярбург.

Між тым, пры аглядзе сплаўленага лесу пад Варшавай аказаліся адменныя карабельныя дрэвы і мачты. Сплаўляўшыя лес сяляне, падбадзёраныя адсутнасцю камісіі, пачалі прыходзіць са скаргамі на ўсё, што з імі тварылася ў час гэтых зладзейскіх сплаваў: пабоі, калецтва, агідны харч, гвалтаванне жанчын чыноўнікамі і агентамі. На рацэ амаль кожны дзень праносіліся трупы. Многім плытагонам не хапала грошай, каб вярнуцца дахаты. Справа пачала прымаць крымінальны характар. Здавалася, урэшце ўсё раскрыецца, спыніцца жах і разбой. У гэту хвіліну карабельны дэпартамент паведаміў па тэлеграфу, што, маўляў, зло адкрываецца. Другая дэпеша, у той жа дзень, загадвала Пагоскаму спыніць справу і ад'ехаць. Справа і спынілася. Гэта было ў сярэдзіне лета 1856 года.

Усё прамаўляла за канчатковым рашэннем, калі кіраўніком міністэрства дзяржаўнай маёмасці стаў Мураўёў. Ад гэтага чалавека чакалі нечага асаблівага. Барон Ховен рупліва вярнуў спыненую справу, Мураўёў хутка даведаўся пра ўсе дэталі — і назначыў новую следчую камісію, якую ўзначаліў генерал Бульмерынг. Нястрыманасць і яўнае хабарніцтва гэтага бязглуздага генерала прымусіла нават Мураўёва прагнаць яго. На месца прагнанага назначыў палкоўніка Длатоўскага.

Вось менавіта ў гэты час бура Мураўёўскага правасуддзя пачала сціхаць. Просьбы ўплывовых асоб, стачка дэпартаментаў, карабельнага і ляснога, пранырлівасць Зімундта зрабілі тое, што ўсе абвінавачаныя атрымалі чыны, ордэны і падзяку, данясенні неспакойных чыноўнікаў былі адхілены, а чыноўнікі выгнаны. Як вянец справы —

Длатоўскаму дадзен сімвал „карысці, гонару і славы” — Уладзімір на шыю.

Між тым па захадах Ховена справа ўсё-такі ішла, яна ўнесена была ў пецярбургскі сенат і нават пагражала няслушным рашэннем. Ды тут памог разбойніцкай кампаніі сам Мураўёў: у 1859 годзе, ён выстараўся ў сенаце скасавання рашэння і закончыў справу тым, што выклапатаў у цара кампенсацыю страт Зімундту і адпусціў яму ў Белавежскай пушчы 10000 дрэў бясплатна, гэта значыць, што выклапатаў яўрэю вялікую ўзнагароду за вынішчэнне цудоўнай пушчы, і што ў сто разоў горш, аддачу неабмежаванага права і спосабаў дакончваць гэтае лесазнішчэнне.

У дадатак да ўсяго, летам 1860 г., у час пабыўкі гасудара ў Белавежы, таварыш міністра-вешальніка прадставіў Зімундта да ордэна, які ён і павесіў на сябе.

*(„Колокол”, № 108, 1.10.1861)*

У далейшых нумарах газеты друкуецца копія кантракта, да якога „руку прыклалі”: К. Ф. Бугенгаген і дырэктар ляснога дэпартамента генерал-маёр і кавалер Нораў.

(Бугенгаген не прыняў падданства Расіі, не быў у гільдыі, не мог заключаць абавязацельства з казною. Кантракт незаконны.)

З працягу „Дрымучай справы” вызірае і чарговы Валкавіцкі, відаць, невыпадкова. Даведваемся: У 1857 годзе, у лясным дэпартаменце міністэрства дзяржаўнай маёмасці, праводзілася справа (№ 21), на 378 лістах „аб камандзіраванні чыноўніка Валкавіцкага ў Тыкоцін і Серацк для прыняцця і сплаву ў С.-Пецярбург 19 мачтавых дрэў, адабраных ад чужаземца Бугенгагена з высечанага ім у Белавежскай пушчы лесу”.

Аб'ём справы падказвае, што чыноўнік быў „неспакойны” і, магчыма, каранямі звязаны з Пушчай (таму і паслалі). Ці спаткаў яго лёс ананімных „неспакойных” службоўцаў з „Дрымучай справы”?

## У Дырэкцыйным парку

У лясным тэхнікуме літаратурны турнір і Тамарына выстаўка. Барыс пакідае ў мяне ровар — школа ў Дырэкцыйным парку, недалёка — ідзем пешкі. Пасля вайны лясная дырэкцыя адрадзілася ў Беластоку, там і па сёння, а парк усё „дырэкцыйны”. Не паддаюцца часу і старыя ўпраўскія дамы, пабудаваныя сто гадоў таму, равеснікі парку.

Здаецца, лаўлю пах даваеннай чырвонай фарбы, якую клаў пэндзлем на выдраўленыя драцянай шчоткай дахі царскіх старажылаў. На процілеглай алеі, выстраеныя ў шэраг, вартуюць час. У вайну

калабаравалі. Адна „шэрагоўка” прытуліла жандармерыю. Сярэдняя? Гасцяваў у ёй толькі раз, магу памыліцца. І трапіў у гасціну выпадкова, па забыўчывасці. Працаваў у лесапільні. Нацягаешся бярвення за дзень і свету не бачыш. Хутчэй на ровар, і дахаты. З цёмнай заслонай на вачах націскаю на педалі. Ажно чую:

— Halt!

Саскокваю з ровара. У вачах пасвятлела: перада мною стаіць жандар. Таксама з роварам. Стаім на тратуары ў поўным неўразуменні. Я здзіўляюся, а ён тым больш. Вачыма пытаю:

— Was ist los?

— Was ist los?! — крычыць жандар і паказвае выцягнутым ад злосці тварам на тратуар.

Я паціскаю плячыма:

— Nicht verstehen.

І жандар гоніць мяне праз усю Белавеж у сваё логава. Тут і растлумачыў: ехаў я тратуарам. А тратутар толькі для жандараў і паліцыі.

Немец занатаваў мае каардынаты і адпусціў. Ці на развітанне пачаставаў кулаком па шыі, не помню — цешыўся, што не сеў у падвал.

А прыём у рэзідэнцыі прыдуркаватага камісара запомніў добра. Груваскае збудаванне ў цэнтры парку за свой век мяняла гаспадароў і прызначэнне. Узнікшы, як і ўся паркавая сядзіба, па царскаму веленню, служыла ўправе Пушчы. Другая Рэч Паспалітая павысіла ранг, упіхнуўшы ва „ўпраўскія” сцены лясную дырэкцыю цэлай акругі. Кёнігсбергскі гаўляйтэр, далучыўшы Беласточчыну да Усходняй Прусіі, надаў аб'екту палітычны статус: пасяліў у ім свой амтскамісарыят. Цяпер будынак служыць навуцы {Instytut Badawczy Leśnictwa w Warszawie — Zakład Lasów Naturalnych w Białowieży).

Ад гэтых маўклівых сцен і пачалася мая ўсходнепруская біяграфія.

20 чэрвеня 1943 г. гайнаўскі der Leiter des Arbeitsamts на падставе распараджэння Шэфа Цывільнае Управы Беластоцкай Акругі з дня 15 красавіка 1943 г. заклікаў мяне да з'яўлення

am Dienstag, der 29 Juni 1943, Uhr $11^{00}$

bei Amtskommissariat Bialowies

дзеля распачацця службы працы. Абавязваў ён таксама прынесці з сабою рабочую вопратку, усялякія асабістыя дакументы і прадукты на 4 дні. І папярэджваў: нез'яўленне на заклік будзе сурова пакарана.

Апошняга мог і не пісаць. „Служба” і „кара” ўжо два гады стаялі побач.

Усе „прызыўнікі” з'явіліся.

А Белавежскі „амтс” быў вялікі, сягаў аж па Слабодку над Нарвай, зборышча атрымалася саліднае, і мы, у час камісаравага прыёму, таўкліся як уюны ў кломлі. І даслоўна нагадвалі ўюноў: голенькія, непрывыклыя да цырыманіялу, закрывалі рукамі сарамлівыя месцы і збянтэжана мітусіліся перад гаспадаром і яго світай.

Нікога не забракавалі. Потым, ужо асвоеных з сорамам, вывелі нас праз парадныя дзверы, пастроілі перад будынкам, і па адным выпускалі на „аздараўленчую дарожку” — да ўзгорка, парослага кустамі і назад.

Бяжым, а з боку балахаўня: задаволеныя рылы камісаравых халуёў. А ў палове дыстанцыі „Сліскі” палкай паскарае бег.

Было мне дваццаць год.

Цяпер, дзе раслі кусты, паблісквае яснымі вокнамі новы будынак ляснога тэхнікума. Пад школьны пляц пайшоў і элітарны корт, зайздросны аб'ект і стымул майго сацыяльнага і нацыянальнага ўсведамлення. Так, так, мая свядомасць даспявала на чырвоным дырэкцыйным даху. Ні следу па жандарскіх могілках. Шкада, усё ж — помнік.

У школу ўвайшоў, як у святыню — даўно не адчуваў такога настрою. Пытаемся, дзе мерапрыемства. Аказваецца, у старым будынку, у інтэрнаце. Пайшлі на другі бок алеі. Тамара з Сярожам ужо там. Сядаем побач. Вялікая зала запаўняецца аматарамі паэтычнага слова. Наперадзе, за сталом, усаджваецца конкурсная камісія. Збоку, уздоўж сцяны, расстаўлены Тамарыны палотны — дзіўнае перапляценне лесу з праваслаўнымі святымі.

Пачынаецца турнір. Па чарзе выступаюць маладыя паэты ў ляснoй форме. З'ехалі з усяе Польшчы. Вершы гучаць, тонам пераклікаюцца з Тамарынымі карцінамі. Ці часам маладыя людзі не памыліліся з выбарам прафесіі? Але ці ж дрэнна, калі ў лесніка душа паэта.

Апладысменты. Варухнуліся святыя ў манаскіх расах, уцякаюць з карцін. За імі з сукатым калом бяжыць „Спіскі”. У дзвярах, рассунуўшы на ўсю шырыню цыбатыя ногі, ашчэрыўся прыдуркаваты камісар... Плясь-плясь! — плешчам у далоні.

Ад нашай хаткі да Дырэкцыйнага парку дзесяць мінут хады, і Вера часта канькае:

— Хадзем у парк, у ім так добра, ён такі харошы... Мо і харошы, а мне ў ім душна.

## На Цэнтуры

Цэнтура — самае высокае месца ў Белавежы. Тут усё велічнае, акацыі, панарама, неба. І дыхаецца інакш, чым у даліне — лёгка, на поўныя грудзі. А паляна, як на талерцы. Чароўная гара. Барыс расказвае:

— Мая прабабуля, Тэкля Пісарэвіч, пад Разарватам жыта жала. Каля палудня стамілася.

— Сяду пад ляшкаю і адпачну, — кажа да ўнучкі Вольгі.

Прысела, глянула на ўсход і ўскрыкнула:

— Глядзі, Волечка, белыя дамы!

— Што вы, бабулька, гаворыце, — запярэчыла ўнучка. — Німа там нічога, толькі поле і лес.

— Не, бачу белыя дамы! — пераконвае бабуля.

І памерла пад ляшкай.

Перад смерцю заглянула ў наступныя дні. Прыйшлі немцы, вырубалі на гары лес. У 1924 годзе атабарылася на галышцы англійская фірма Century, якая і пабудавала „белыя дамы", у іх закватаравалася. Дакладна ва ўказаным старой Тэкляй месцы.

Прышэльцы сквапнічалі, наламалі дроў у Пушчы, ды не аб іх казка, доўга не гаспадарылі. Пакінулі па сабе новыя вырубы, „белыя дамы" і назву. Прабачце, знатакі, што пішу Цэнтура, а не Сэнтры. Пішу так, як назва бытуе ў Белавежы.

Пасёлак разбудоўваўся, патрэбны быў жвір. А пад бокам гара жвірыстая! Раскапалі, знявечылі.

Прайшлі гады, Цэнтура ўрасла ў краявід. Глыбокі катлаван па жвіроўні парос падлескам і густым сасняком. Быццам апусціўся малады лес у казачную прорву. І мы ахвотна бавім час на адкрытым беразе гэтай жывапіснай чашы, калі ў ёй купаецца паўднёваве сонца.

Сідар, наш летуценнік і фантазёр, як Барысава прабабуля, захопленымі вачыма накіроўвае нашу ўвагу на процілеглую сцяну:

— Чуеце спеў?

І як пазбаўленым слыху, удакладняе:

— Там, ля валуна... Якая акустыка! — не надзівіцца. — А дэкор! — ахае. — І як утульна гледачам! — уваходзіць у другое вымярэнне і будуе амфітэатр.

Іншы раз у зманлівую чашу ўсяляюцца дэманы. З зялёнага прадоння даносяцца фанфарныя маршы, на сонечныя прагаліны выпаўзаюць статуі венцаносных містыфікатараў і адыёзных праметэяў, звіхнутых вешчуноў і апантаных Герастратаў, гегемонных Карлаў і пампезных блазнаў, уладных ветрагонаў і белавежскіх каінаў.

Або святы Губерт склікае паляўнічую знаць на справаздачу тысячагоддзя. Дастанецца „мосцям”, „высочаствам” і „кукурузным сейбітам” — намарнавалі ў Пушчы звера. Ці толькі змесцяцца ў панараме? Майма надзею, змесцяцца. Рэальнасць — у фантастыцы.

Займае дух не так ад Сідаравых мрояў, як ад вышыні, з якой назіраем цуд кучаравага адраджэння. Толькі ўсходні абрыў жаўцее. На стромкі бераг выйшлі гонкія сосны. Красуюцца, какетнічаюць. Хутка пачнуць падаць долу. Сумны лёс ім наканаваны. У верхніх адкладах паўночнай сцяны роўная перарывістая лінія з чорных кропак, быццам прастрачыў гару буйнакаліберны кулямёт — ластаўчыныя гнёзды.

Барыс паддаецца настрою, чытае свой новы верш:

Акно ў раніцу,
жар красак, уяўленняў,
жывыя плоскасці,
аж па край зрэнак;
кветкі, ручай мёду,
шацёр бурштынавы —
нішто не ўмірае.
Час у саркафагу
прасторы.

Сідар падсумоўвае:

Барыс Руско — паэт як трэба,
Журботны сын зямлі і неба.

Ідзем праміком на ўсход. Сярод соснаў і елак — вішні і барадаўчатая брызгліна (адгукаецца лесаўпарадкавальная практыка). За папярэчным трыбам вялікі курган. І як толькі не маглі яго прыкмеціць даследчыкі! Калі мы з Барысам адкрылі волата, не давалі нам веры. Месца грыбное, не раз тут збіралі маслякі.

Цяпер на трыбе стаіць апазнавальны слупок. Курган навідавоку. Як маешся, стары?

Куды ісці, улева — да вяковых дубоў, ці ўправа — у запаведнік „Высокае Багна”?

Не мяняем напрамку. Рывок — і новае ўзвышша, лагоднае, светлае. За ім, у нейкім трывожным чаканні, празрыстая даліна. Акварэльны пейзаж. За ім — граніца. На паўднёвым схіле знаёмыя незнаёмцы — сіратлівая лінейка курганоў. Адарваліся ад важака?

Меншыя ростам, разам з заморкамі, прыціснуліся да зямлі, ледзь дыхаюць.

Калі былі мы тут упершыню, гэтыя маўкліўцы і нацэлілі нас на помнікавы цяпер аб'ект.

## Эпіцэнтр зямлі

На семінары „Белавежы” Сакрат Яновіч загнаў мне ў голаў ладнага вухналя. Сказаў:

— Пішы прасцей, а то я яшчэ прачытваю, а ўжо мой сын не можа падабраць ключа.

Я шыфрую! А мне здавалася, што пішу адкрытым тэкстам. І я ўспомніў эпілог „Віроў”. Вызіраю з іншага вымярэння: ці чытае мяне мой унук? — цікаўлюся. Цяпер думаю: а калі і навядзе свой камп'ютэр на мае радкі, ці зразумее, што дзед сеяў? Адны загадкі і рэбусы. Дзіўныя парывы і згрызоты, парпісты, гэпісты, беларусападобная мімікрыя...

Балючае пытанне.

Глядзеў у БТ (Беларускае тэлебачанне) дакументальны фільм „Беларускі Іерусалім”. Старэнькая бабулька паказвае сталічнаму глобтротэру Мір (мястэчка на Наваградчыне). Успамінае даваенне — далёкае госцю, такое блізкае ёй. Расказвае пра вялікую яўрэйскую абшчыну, якая тут жыла. Бабульчын твар, прыкметна назначаны жыццём, захаваў адзнакі дзявочасці. Пэўна, была слаўнай красуняй. Увайшоўшы ў тэму, ажыўляецца:

— У іх была і свая школа...

— Ішыбот? — перапытвае глобтротэр, дэманструючы свае веды. Бабулька не ўдакладняе, у яе важнейшая дэталь. Працягвае:

— Дык у гэтай школе вучыліся маладыя яўрэі з розных краін...

Хвіліну вагаецца, урэшце махае рукой: было — сплыло, і, зірнуўшы пытальна ў нашы вочы, выяўляе дзявочую тайну:

— Сорамна сёння гаварыць, але адзін з іх закахаўся ў мяне.

— Адкуль ён быў? — загарэўся глобтротэр.

— З Берліна, — уздыхае бабуля.

— Вось і жылі б цяпер у Берліне! — з непрыхаваным дакорам і яўнай зайздрасцю гаворыць глобтротэр.

Пазайздросціў яўрэйскаму шчасцю. Як той алкаш — акупацыйнаму пеклу:

— Шкада, што Гітлер не перамог Сталіна, папілі б цяпер піва!

Яму ўжо той півавар як півавар, і вайна была не вайна, а паядынак двух гладыятараў.

Бабулька разгадала каверзу і адказала:

— А мне і тут добра, я сваёй Беларусі не прамяняю.

Піўны патрыятызм усплыў і ў „псіхалагічнай” праграме. Імпульсіўны шкаляр з бэнэфаўскім гневам, заяўляе:

— Як я магу быць патрыётам Беларусі, калі ўрад нічога мне не даў!

— Вот как?! — здзіўляеца вядучая, але, схамянуўшыся, не адмаўляе права на собскую думку.

Псіхолаг выказвае правільную пазіцыю:

— Мой патрыятызм — у любові да роднай зямлі і ў тым, што я ёй ахвярую.

— Гэта праходзілі нашы бацькі, — уступае ў спрэчку аднадумец блуднага рыначніка. — Усё іншым, а сабе што?

Пытанне, пастаўленае рубам, так і застрагла ў тэарэтычнай твані. Для сябе, значыць — для мяне, асабіста, без абстрактнай афарбоўкі. І па патрэбнасцях! Тады і пагаворым аб любові да радзімы, і мо адплацім ёй па магчымасці. А не, дык на вуліцу: — Жыве піва! А то і махнём у Еўропу: — Жыве Беларусь!

Паўлікі Марозавы сталі пад новыя сцягі.

Ці І ў майго ўнука пераможа рыначны погляд на любоў да роднай зямлі? Ці зразумее дзеда? Цепліцца надзея, што зразумее. Нядаўна пісаў сачыненне на тэму „Мая малая айчына”. Можна было выбраць любое месца, нават свой клас. Эрнік выбраў Белавеж. Хоць нарадзіўся ў Беластоку і ў Пушчу заглядае наскокамі, хоць жыве школай. Стараста, якая, згодна чыну, тэмай сачынення абрала школьны гурт, напісала аб Эрніку: — Каб не ён, не было б класа...

Значыць, унуку, як і дзеду, Белавеж — эпіцэнтр зямлі.

## Дух Пушчы набыў правы

Наша Кашпіроўшчына робіць фурор, дачакала сваёй часіны. Глухую лясную дарожку вытапталі ногі і машыны турыстаў, і ў старажытнае свяцілішча паплылі патокі паломнікаў. Але шлях яшчэ не азначаны і, здараецца, сёй-той, ідучы без праваднікa, згубіць напрамак. Мы з Барысам радасна вітаем такіх вандроўнікаў у лесе. І яны цешацца сустрэчы з тубыльцамі. Гавораць аб выключнасці святога круга. У адрозненне ад белавежцаў, вераць у аздараўленчую моц, скрытую пад валунамі.

Мы, вядома, натапырваем вушы: прыемна слухаць, як пашыраюцца віткі запушчанай намі легенды. Хоць адкрылі мы каменны круг выпадкова, высновы зрабілі правільныя.

Каменныя кругі спадарожнічалі чалавеку ад заранку гісторыі. Яны адганялі злых духаў. Сімвалізавалі сонца. Святыні, прысвечаныя касмічным багам, а перш за ўсё сонцу, былі акруглыя. Кругам сядалі нашы прашчуры вакол святога агню, у выглядзе круга будавалі не толькі свае святыні, але і паселішчы.

Каменныя кругі займалі абшырны арэал. Сцёр іх з паверхні зямлі ненасытны гомасапун. У Польшчы, знявечаныя рэшткі гэтых помнікаў, засталіся толькі пад Астралэнкай, Картузамі і Хойніцамі. Датуюцца II-III стагоддзямі новай эры. Відаць, і наш круг не старэйшы. Захаваўся дзякуючы Пушчы. Хоць і яго пашарпалі час і людзі, надалей ачышчае людскія душы і целы.

Нашу легенду падхапілі леснікі. Абваколілі каменны круг драўляным мастком, паставілі назіральную трыбуну. На адкрыццё новага духоўнага гнездзішча запрасілі чыноўных гасцей. Была святочная ўзнёсласць. Сяргей выступіў з палымянай прамовай. Гаварыў аб Духу Пушчы, аб яго вечным блуканні, аб нябачных і бязважкіх флюідах, якімі нас абсыпае. Доктара падтрымалі і іншыя выступоўцы. Падзею аздобіла „Чарамшына”.

— Не было толькі свянцонай вады і бацюшкі, — аплятаючы смажаную на кастры каўбаску, падсумаваў рытуал Сідар.

— Нязручна яму тут быць, — заступіўся за свяшчэнніка Пятро, кавалер ордэна св. Магдаліны. — Гэта ж язычніцкі храм!

— А мы з язычніцтва і не выйшлі, — гнуў сваё Сідар. — Возьмем супольнасць небажыхароў. Усё пашыраецца. Галіновыя багі перадалі эстафетную палачку галіновым святым і з'явіліся новыя заступнікі, адказныя за ўраджай, вайну, стыхію, каханне і гэдэ. І кожны, як і раней, герой. Усё можа.

— Цяпер адзін Заканадаўца, — унёс у навуковы дыспут сваю драбніцу Барыс.

— Дык і ў язычнікаў быў галоўны распарадчык! — не ўступаў Сідар, абражаны на бацюшку, што той не акрапіў каменны круг.

Суддзёй у прынцыповай спрэчцы мог быць Сяргей, але ён сядзеў сярод эліты і, відаць, развіваў эфірную тэорыю флюідаў, бо прытым узмахваў рукамі, і вырываць яго з містычнага экстазу братчыкі не пажадалі. Цырымоннае пытанне, пастаўленае Сідарам, засталося нявырашаным. Ды і ці варта тачыць ім душу, калі штокольвечы змяніць ужо няўзмогу.

Як бы там ні было, а Дух Пушчы набыў правамоцтва і шыкоўную рэзідэнцыю.

Шчаслівага панавання!

* * *

Пад Пакрову з беларускага боку, недзе ад Нікара, паплылі на захад жураўліныя ключы. Яны выцягваліся дугою, рваліся, то зноў злучаліся ў шыкоўны строй.

Курлы-курлы! — ні то развітваліся з намі, ні то цешыліся сабою ў ясным паднябессі.

А адна стая бясшумна вынырнула з паўночнай, нарваўскай сцяны. Праплыла над маім дубам на поўдзень, супакоеная, да захаплення зладжаная. Узяла ўласцівы напрамак?

Гэта мне сігнал: збірайся на пакінутае намі месца.

* * *

Як даўні сон
растварыліся словы —
у вырай
з жураўлямі адплылі?
У аблоках застылых
завязнуць, бяздомныя,
ці вернуцца
ў подыху
новай вясны?
— Пачуцці...
— Што з імі?
— Прытулку шукаюць
на сцішаных беллю
прасеках жыцця.
— А вера гарачая?
— Адплыла, адмаячыла,
далячынь толькі цепліцца...
— Вернецца, вернецца.
Каго я чакаю —
на завароце
інее бяроза,
чарнее крыж.
І на душы
туга нямая —
з яе не выбрацца,
не ўцячы.

# Рэха

### Лесавік

Вольга Руско ўвайшла ў нашу сябрыну нечакана. Завочна знаёмая яшчэ са студэнцкіх гадоў. Калі я час ад часу заглядаў да бацькоў, чуў і пра яе: „Воленька, Воленька...” Сябравалі з Рускамі брат і сястра. Аднойчы Воленька завіравала ў „Ніве” — ускочыла ў фотааб'ектыў нашага карэспандэнта на навагоднім балю варшаўскіх беларусаў. Сёлета яна, сталічная русістка, вялікая паклонніца рускай класікі, трапіўшы ў арбіту сілавога поля белавежскіх дубоў, адчула цягу і да пяра.

Завіруй, Воленька.

**Апавяданне Вольгі Руско-Шуркоўскай, прачытанае на майскай пашыранай сесіі пад святымі дубамі**

Белавежская гісторыя нашага роду пачынаецца у 1796 годзе, калі на левым незанятым беразе ракі ўзнікла вёска Падаляны. Тады і асеў тут на шаснаццаці гектарах мой прапрапрадзед Павел Руско. Ніякіх вестак пра сябе не пакінуў, апрача адной — паміраючы, перадаў гаспадарку сыну Антону.

Антон і нарадзіў Якуба, бацьку майго дзедкі, таксама Антона. Сівенькі дзядуля ў доўгай ільняной кашулі, падпярэзанай канаплянай вяроўкай, клікаў малога, садавіў яго на калені і мовіў: — Я Антон і ты Антонейка, то пагаворым сабе. Не помню, калі я пачула гэты сямейны пераказ, але даўно ўзварухнуў мае пачуцці дзядуля з карціны Сурыкава „Стары ў агародзе”. Натруджаныя рукі, асмажаны сонцам дабрадушны твар. Пэўна, такімі былі мае продкі. Захоўваю „Старога” як самую дарагую рэліквію.

Дзяцінства Антонейкі нічым не адрознівалася ад долі большасці дзяцей тае пары. Яшчэ дагэтуль наш малалетак ледзь вырасце з калыскі, а ўжо абкладзены абавязкамі.

Дзедка з усходам сонца пасвіў свіней. Аднойчы, сарваны са сну, таропка націснуў на вушы шапку і памкнуўся за статкам на выган. Там была ўжо старэйшая за яго пастушка. Уселіся над ручайком, яна і кажа:

— Нешта ад тваёй галавы нехарошым цягне.

І з цікавасцю зняла з Антонейкі галаўны ўбор. Які сорам! Валоссе хлопчыка зляпілі чалавечыя адыходы. Пракуды двухгадовай сястрычкі. Проста ноччу ўлезла яна на падушку братоў. У Якуба было шасцёра

нашчадкаў, трох хлопчыкаў і тры дзяўчынкі. Усе спалі разам на падлозе, на саломе, прыкрытай ільняным радном. Падушак хапала, паблізу рака і процьма пазначаных фарбай гусак.

Кемлівая пастушка і вымыла ў прытоку ракі Антонейкавы кучары. Прыгода моцна ўелася ў амбіцыю дзіцяці, да старасці гадоў дзедка не мог забыць „пахучага” пастушынага рандэву.

Школьнай навукі не ўдалося яму спазнаць з-за бацькі. Той дазваляў вучыцца толькі ад лістапада, пасля заканчэння палявых работ. Навучэнцы далёка ўжо прасунуліся наперад і гэты факт аказаўся для дзедкі фатальным. Настаўнік, выявіўшы ў класе новага наведніка, заявіў:

— Не буду я з табою займацца асобна, ідзі дахаты!

З кароткага школьнага жыцця, апрача крыўднага прыгавору настаўніка, запамятаў дзедка і забаўную сцэнку.

Вучань Ільюша, ківаючы галавою на партрэт царыцы, шэпча суседу Пілюшы:

— Глянь, якая царыца хароша.

Пілюша глянуў на царыцу і, доўга не думаючы, выпаліў:

— Як вана табе хароша, то пацалуй яе ў пізду.

Абражаны Ільюша падняў руку і кажа:

— Гаспадзін учыцель, я сказаў Пілюшы: „Якая хароша царыца”. А вон мне атвеціў: „Як вана табе хароша, то пацалуй яе ў пізду.”

— Дурак! — крыкнуў настаўнік і паставіў абодвух хлопцаў у вугал. Ці Пілюша панёс больш суровае пакаранне, дзедка не расказваў.

А мой будучы кумір, з нічым адпраўлены са школы, ад наймалодшых гадоў цяжка працаваў у полі. Школу замяніў яму лес. Кожную свабодную хвіліну праводзіў у лесе. У лясной стыхіі адчуваў сябе добра ўдзень і ўначы. Па грыбы, ягады, маліны і журавіны, як да ўласнай кладоўкі, хадзіў у толькі яму вядомыя мясціны. Дасканала вывучыў павадкі звяроў і птушак. Гэтыя якасці прыкмеціў у дзедкі сусед, закаранелы браканьер Байко. Ён і падвучыў дзедку свайму рамяству, і ўцягнуў яго ў малапрэстыжны занятак.

Неўзабаве Антон перасягнуў настаўніка. Метка страляў, быў спраўны, моцны, ну і інтэлігентны. Стаў няўлоўным браканьерам і нямала напсаваў нерваў лоўчаму. Аднойчы, раз'юшаны лоўчы, прыйшоў да Антона і кажа:

— Як убачу цябе ў лесе са стрэльбай, то стрэлю табе ў лоб!

— Гэта яшчэ невядома, хто каго першы ўбачыць, — асадзіў лоўчага Антон.

У тыя часы Белавежская пушча была царскай дачай. Праз кожныя тры гады адбываліся наезды его величества на паляванне.

Прадвеснікам з'яўлялася прыбыццё аховы імператара — данскіх і кубанскіх казакоў, а таксама чаркесаў. Вайсковыя часці стаялі па ўсёй Белавежы. У 1906 годзе ў клуні дзедавага брата Цімоха Руско кватаравалі данскія казакі. Дзеду вельмі спадабаліся іхнія стрэльбы, і ён цвёрда вырашыў здабыць такую зброю. Ноччу падкраўся да Цімохавай клуні і займеў упадабанае ружжо. Схаваў яго ў суседскай страсе. Схаваў добра, бо на другі дзень казакі ператраслі ўсю вёску, а пакражы не знайшлі.

У чарговы прыезд цара падалянцы дамовіліся ўсёпадданейша прасіць у Яго Імператарскай Вялікасці дазволу пасвіць быдла ў лесе. Напісалі калектыўнае пасланне і пасланнікам абралі Антона. Не так проста было прабрацца прад высочайшее аблічча. Ад вернападданых адгароджваў цара трайны казачы заслон. І ўсё ж, улучыўшы зручны момант, калі цар выходзіў з царквы, дзед пранік праз жывую загарадзь і, упаўшы перад царом на калені, палажыў на галаву зварот. Цар загадаў узяць пісьмо. І задаволіў просьбу. А казакі да канца палявання шукалі дзеда, які на гэты час перасяліўся ў лес.

Дзед няраз выручаў вяскоўцаў. Гадамі абяспечваў мясам сямейныя ўрачыстасці, часта бываў вясельным генералам і любіў пад хмяльком зацягнуць застольную:

Ой, сваце, сваце,
Добра гарэлка.
Будземо піці
Да панідзелка.

А з панідзелка,
То і ў аўторак
Вып'емо, сваце,
Шчэ румок сорак.

Антон-юніёр, прыгажуністы кавалер, не ганяўся за кожнай спадніцай, а на Цімохавым вяселлі закахаўся ў Макрэню Сахарчук, сястру маладухі. І ў гэтым была ўся драма. Бацька абранкі ўпёрся:

— Не дам другой дачкі ў адзін дом!

І не даў. Выдаў яе за багатага і вынаходлівага „Лобжа”. Адкуль такая мянушка? Расказваючы пра свае адкрыцці, вынаходнік рабіў і выснову:

— Трэба мець лобік!

„Лобік” стварыў жонцы добрыя ўмовы. Прыставіў нават служанку. І Макрэня не крыўдавала на мужа, нарадзіла яму пяцёра дзяцей.

Але выжыла толькі двое. Макрэня і сама была слабога здароўя, скардзілася на болі ў грудзях. Памерла на 35-м годзе жыцця. Дзедка зненавідзіў „Лобіка”, лічыў яго прычынай Макрэнінай смерці. І плынь гадоў не загоіла раны душы.

У 1889 годзе дзедка ажаніўся з суседкай, чацвёртай дачкой белавежскага войта, Васіля Вашкевіча, Марынай, маёй бабуляй. Яна, як і дзедка, мела сваю вялікую любоў. Закахалася, з узаемнасцю, у другога суседа, Базылюка. Любіла ўспамінаць яго і лыкавыя лапці, якія сплёў ёй каханы. Упоперак шчасцю стала казённая павіннасць, Базылюка ўзялі ў салдаты.

Бабуля выйшла за дзедку, як сама казала, ад страху. Сустрэліся на музыках, сказаў што прыйдзе ў сваты. Ну і прыйшоў. Быў добрым мужам і дбайным гаспадаром. Пабудаваў дом, клуню, канюшню і розныя прыбудовы. Чацвяртуха зямлі, потым трацяк, шмат пашы, значыць і быдла. Зімою вазачыў, жылі заможна.

Бабуля нарадзіла дзевяцера здаровых дзяцей, працавала ў полі, прала і ткала: кужаль на пасцель і бялізну, зрэб'е белае і сіняе на кафтаны, нагавіцы, ручнікі і радна. Ткала таксама мяшкі і палавікі.

Пестуном дзедкі быў сынок Раманка. Нядоўга. Ва ўзросце двух гадоў захварэў шкарлятынай і памёр. Сцялося бацькава сэрца, не заціскаў у ім болю, доўга не мог знайсці сабе месца, усё ўспамінаў любімца. А смерць не пакідала хату. Пасля некалькіх гадоў памерлі чарговыя два хлопчыкі. Застаўся толькі адзін сын, мой татка Амельян. Аб дочках дзедка не клапаціўся, усе прыгожыя, павыходзілі замуж і пакінулі бацькоўскі дом.

Ішлі гады. Пасля вайны дзедка развітаўся з браканьерствам, але лес надалей лічыў сваім самым надзейным сябрам. Здавалася, і з бабуляй жыў душа ў душу. І раптам над спакойным домам павісла мяцежная бура. Пасеяла яе бабуліна сяброўка Матрона, шасцідзесяцігадовая ўдава. Пачала яна чараваць дзедку. Разадзетая, усё часцей заглядала да нас, нібы да Макрэні. Тады дзедка бег да люстэрка, прычэсваўся і ўпіваўся вачыма ў прывабную ўдавіцу. А яна часу дарма не губляла, распальвала ў старым маладыя страсці, і паслядоўна ішла да абранай мэты: заняць Макрэнінае месца.

Усчаліся сваркі. Тут на сцэну ўвайшоў мой татка. Быў кракусам, на сцяне вісеў шыкоўны мундзір, кракуска і шабля. І татка сказаў:

— Калі Матрона пераступіць наш парог, прывітаю яе шабляй.

Дзедка нічога не адказаў, толькі доўга сядзеў у кухні з апушчанай галавою. Так закончылася спозненае каханне. І добра, бо на сівой галаве былі важныя абавязкі: калі ўсталявалася польская ўлада, дзедку выбралі солтысам. Быў ім дваццаць гадоў. І не падвёў

падалянцаў. Упарадкаваў вёску, патрапіў выбіць кампенсацыю за шкоды, якую чынілі дзікія звяры, не меў і падаткавых праблем.

Дзедка быў кампаннікам. Часам запрашаў у госці гмінных ураднікаў і каменданта паліцыі. Тады ставіў гатунковую гарэлку. Выпіваў два-тры кілішкі, і канец. Калі ўгаворвалі піць больш, павышаў голас і катэгарычна заяўляў:

— Я ўжэ сказаў, шчо не, то не!

На гэтым і канчаліся ўгаворы.

Як я ўжо згадвала, дзедка не хадзіў у школу, не ўмеў ні пісаць, ні чытаць. Не бяда, знайшоў пісьменных памочнікаў. Спачатку ролю сакратара выконваў у яго Іван Казак, пасля — бабулін братан Пецька Вашкевіч. Часцяком да солтыса прыходзілі розныя службовыя пісьмы, прызначаныя вяскоўцам. Тады дзедка ішоў да сваіх памочнікаў, тыя чыталі прозвішчы адрасатаў, а ён раскладаў паміж пальцамі абедзвюх рук канверты. Такім чынам даручаў карэспандэнцыю, і не здарылася, каб хоць раз памыліўся.

Дзедка не быў салодкі, умеў пастаяць за сябе, але і нікога не скрыўдзіў. Кожнаму бадзягу знаходзіў куток на начлег. Нягледзячы на гады, хадзіў лёгка і спраўна. Нешта ў гэтай выпраўцы было ад улады, упэўнена ступаў па зямлі.

Дачакаўся дзедка ладнай чародкі ўнукаў. Не ведаю, колькі пачуццяў прызначаў кожнаму, магу толькі сказаць, што вельмі любіў майго брата Барыса. Шасцігадовага хлапчука браў у доўгія лясныя паходы, знаёміў са сваімі мясцінамі, якія ў кожнага лесуна іншыя. Адпачываць любіў у „Паграбах”, дзе падалянцы перахоўвалі бульбу. Слядоў па бульбяных ямах дагэтуль у лесе нямала. Уладкаваўшыся зручней на нахіле, пакуль не заснуў, адкрываў унуку лясныя тайны. Любіў расказваць, і расказваў прыгожа. А калі Барыс пайшоў у школу, займеў і палітычнага субяседніка.

— Ну, Барыс, як там твае кітайцы? — пытаўся.

— Ой, б'ют, дзедушка, вашых японцаў, — адказваў Барыс.

А як дзед вастрыў касу! Гэты занятак выконваў надзвычай старанна. Відаць было, укладваў у яго частку сваёй душы. З павагай нацягваў на нос акуляры і сядаў ля хаты на пяньку. Другі, крыху большы пянёк, ставіў між калень і кляпаў знятую з касяка касу. Аднойчы выпала з акуляраў адно шкельца. Дзед быццам і не прыкмеціў згубы. Потым пабілася і другое шкельца. Пагадзіўся і з гэтай стратай — і яшчэ колькі гадоў кляпаў касу ў акулярах без шкельцаў.

Здаралася, псоціла я дзедку. Аднак ніколі ён не гневаўся. Раз толькі прысвоіў мне малапахвальную мянушку. Відаць, заслужана. У восеньскі падвячорак вярнуўся дзедка з лесу. Моцна празяб, дык

залез на печ пагрэцца. А я ўляцела ў хату і, убачыўшы дзедавы лапці, што выставалі з печы, пачала спяваць:

Антон казу вядзе,
Каза яму няўлад ідзе;
То за ногі, то за рогі,
Каб бліжэй да дарогі.

Слухаю — ціша, паўтараю песню — ціша, за трэцім разам дзедка, здушваючы смех, крыкнуў:

— Я табе зараз пакажу, прайдохо, ты!

Любіла я таксама ўлазіць пад стол і мяўкаць, бы кацяня. Дзедка тады частаваў мяне нейкім ласункам і гаварыў:

— Ну, вылазь, прайдошка...

Уяўляла я сябе і велікасвецкай дамай. А ў дзедкі былі дзве тхарыныя скуркі. Дык я тайком зрабіла з гэтых скурак коўрык і карысталася ім, калі нікога не было ў хаце. А тут дзедка прывёў купца. Скуркі я парэзала і яны страцілі цану. Але і на гэты раз абышлося без пакарання.

У 1938 годзе за салтысаванне дзедка атрымаў узнагароду. Гэткі бел-чырвоны значок з надпісам Rzeczpospolita Polska. Вельмі ганарыўся адзнакай. А маці, убачыўшы мізэрную бляшку, скрывілася:

— Такі гузік за дваццаць гадоў выслугі.

Дзедка сеў і задумаўся. Але значок схаваў у куфэрак, у якім перахоўваліся дакументы і грошы.

З грашыма было па-рознаму. Накапляліся, абясцэньваліся, прападалі. Найбольшую страту панёс дзедка ў 1939 годзе. Перад самай вайной меў на ашчаднай кніжцы сем тысяч злотых. На тыя часы — вялікая сума. Усё прапала. Удар зламаў старога, крадком паплакваў. Узгадваў пражытае, чакаў вяртання цара, кпіў з крамлёўскага горца:

— Які гэта цар, шчо хаваецца пад лодкай.

У маі 1941 года захварэў. Суткі грэўся на печы, затым перанеслі яго на ложак. Прыйшла Вольга Несцераўна, мясцовая фельчарка. Выслухала хворага, зрабіла ўкол. Дзедка заснуў. Раніцай злез з ложка, прыклыпаў да акна, сумным зрокам акінуў адзін статак, другі, трэці. Глянуў на агарод: усё ўзышло хораша. У полі прадбачваўся таксама добры ўраджай. Спакойна лёг у ложак і заснуў навек.

* * *

Вольга скончыла.

— Чалавек — сусвет, — уздыхнуў Барыс. — Як ты далёка, дзед?! Адматаць бы той касмічны клубок і пачуць тваю прысутнасць.

— А ўспомні апошнюю размову з бацькам, — звяла павекі Вера:

— Барыс, зараў поле?

— Зараў.

— А каня напаіў?

— Напаіў.

— То добра...

* * *

— Вязь!— ачнуўся Сідар.

— Белая! — адгукнулася рэха.

## Кур'ёзная прафесія

Сачыць за сабою цяжкая справа. Таму я, напісаўшы „Віры”, яшчэ цёпленькі рукапіс занёс Яніне Чэрнякевіч, нашай прыветлівай „Зорцы”, і папрасіў:

— Зірніце зоркім вокам на мой летапіс.

Здзівіўся, калі потым пачуў ад яе:

— Вы так мала напісалі аб сабе.

А мне здавалася, што ў кожным маім сказе хітраядна ўсміхаецца самаўпэўненае „Я”. Як рэха далёкіх гадоў, са зрашэчанай памяці адазваўся грымлівы покрык наравістай Лідзіі Бялецкай:

— Не думайте, что вы самый умный!..

— Хто, я?! — гукаю ў гэпісцкую далеч.

— Так, вы! — адказвае прыціхлае рэха.

І як тут, дагаджаючы і тым, і гэтым, не забыць аб сабе. „Самоумие” праследавала мяне ад парога журналісцкай кар'еры. Пасля заканчэння літінстытута пачаў я працаваць у „Беластоцкай газеце”. З ходу залічылі мяне ў прэстыжны аддзел культуры, але ступень прысвоілі „парогавую”, як і выпускнікам польскіх вузаў — redaktor działu (ніжэй былі: młodszy redaktor działu i aplikant). Тут і пачала ганяцца за мною дзіўная нявідка.

Кадравічка прынесла анкету. А там графа “вывучаная прафесія” Якая ж яна ў мяне, гэтая прафесія? У маім дыпломе напісана: рашэннем Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі ад 24 чэрвеня 1954 г. прысвоена мне кваліфікацыя литературного работника. Прысвоіць прысвоілі, а не растлумачылі, што гэта за штука. Не асвоілі новае паняцце? Да вайны было ясна — інстытут, як і іншыя вузы, выпускаў майстроў, „пісьменнікаў”. А мы, відаць, чаляднікі. Дык што, уставім у

графу — czeladnik? Скажуць: кпіны. Перакласці дасло̆уна? Засмяюць. Pracownik literackil Ну і прафесія! Параіўся ў кіраўніка аддзела: што рабіць? Збігнеў Навацкі адмахнуўся, бы ад назойлівага авадня:

— Napisz: „pisarz”.

Памутнела ў вачах. Успомнілася вяртанне з Чырвонай Арміі. На вайсковай камісіі спыталі, якая ў мяне ваенная кваліфікацыя. А што гэта такое? — у сваю чаргу спытаў я. Інтэрв'юер растлумачыў: Вось я, напрыклад, pisarz. Я ледзь не кінуўся незнаёмцу на шыю, але ўтаймаваў нахлынуўшыя пачуці і бясстрасным голасам сціпла зазначыў: І я таксама pisarz. А грудзі распірала радасць: на камісію ўвайшоў звычайным радавым, а выйшаў з яе ваенным спецыялістам...

„Pisarz, pisarz, pisarz!” — зашумела на вуліцы. Зірнуў у акно — вабная фея.

— Чаго марудзіш, пішы, здзяйсняйся! — штурхае.

А, хай будзе „pisarz”. І я з бессаромнай лёгкасцю ўладкаваў гучнае слова ў злашчасную графу. Адгукнецца яно праз гады. Праўда, знікне фея, з'явяцца нявідкі.

На адным з пастраенняў ідэалагічнага фронту камісар Мікульскі лаяў „Ніву” за прысабечванне Тадэвуша Касцюшкі. Затым, дакараючы мяне калючым зрокам, пераскочыў на маральныя прынцыпы, непрыстойную трансмісійнаму пасу партыі пыхлівасць.

— Некаторыя ганарыстыя пэцкалі ўжо ўзвялі сябе ў пісьменнікі! — пеніўся.

Аж Уладзімір Паўлючук, які сядзеў побач, не стрываў:

— Чаго ён так глядзіць на вас? — пытае.

І мне гэта няўцям, але я сучу нагамі ад злосці за наскок на рэдакцыю. Колькі лухты намалоў! — не магу разабрацца ў кіпені грамавержца. На храна нам здаўся твой Касцюшка!

— Трэба даць адказ, — гавару.

Паўлючук згаджаецца, але, убачыўшы што я ў гарачцы, кажа:

— Дазвольце мне выступіць.

Хоць і выступіў ён разважна, зградзіўшы нахабства ганіцеля адточаным словам „інсінуацыя”, прыхільнасці франтавікоў не здабыў. Ім спадабаўся наш палякаедны апетыт.

А ганарыстыя пэцкалі? Каго гэта ён узяў на прыцэл? Ат, тузануў кагосьці прафілактычна. Красамоўніцкі перакос дырэктыўнага апаратчыка не прыняў я на свой рахунак. Пра трэфную графу з персанальнай анкеты даўно забыў. Тады і потым ніколі не называў сябе пісьменнікам. Змоўчваў і пра інстытут, які мне прысвоіў кур'ёзную прафесію. Выручалі паслужлівыя нявідкі.

Прыехаў з Масквы камерсант кніжнага гандлю, такі калялітаратурны міні-Бэндэр. Склікаў прэсканферэнцыю. Сядзім, захалусныя пэцкалі, за багата застаўленым сталом, слухаем анекдоты залётнага гохштаплера, жуем ягоную закусь, запіваем малдаўскім віном, а Ада Чачуга, няйначай, па штуршку каварнай нявідкі, вазьмі ды ляпні:

— А наш галоўны закончыў літінстытут!

— Ага! — ехідна рагатнула нявідка, думаючы, што загнала задаваку ў тупік. І выставіла мяне на смех. Герой падзеі, нават не зірнуўшы ў мой бок, грэбліва заўважыў:

— Так? Дык што ён тут (чытай: в этой дыре) робіць?

Давялося чырванець. А чаго мне гарэць ад сораму? Здабываў я літаратурную адукацыю ў знакамітых прафесараў. Вучыўся ў выдатных майстроў слова. Пяць год, праведзеных у літінстытуце, лічу самымі шчаслівымі гадамі ў сваім жыцці. І з усім гэтым нашуся, як нейкі злачынец. Засакрэціўся. Вінаваты не інстытут, а дурная даваенная слава аб ім: фабрыка пісьменнікаў.

Ваюю з фальшам. Ніякая фабрыка! Прасейвалі ў вуз праз густое творчае рэшата. Кожны ўжо нешта пісаў, сяк-так друкаваўся. Дарма! Людзі, бы тыя франтавікі Мікульскага, любяць фальш. На гэтай нашай слабасці і сваволнічаюць усюдыісныя нявідкі. Гэтыя прыдуркі асабліва аблюбавалі друк.

У „размове” з Тэрэсай Занеўскай (A dusza jest па Wschodzie) сказаў я: „Moja Alma Mater należała do trudnych uczelni. Dostawał się do niej co dziesiąty, niektórzy odpadali po pierwszej sesji: pełny program filologii uniwersyteckiej plus wykłady z logiki, filozofii, historii nowszechnej, historii sztuki”. Нявідкі выкінулі філалогію, замянілі яе філасофіяй. Гісторыя мастацтва таксама выдалася прадметам цьмяным. Замест яго ўставілі „філасофію” мастацтва. Недаверлівая нявідка скараціла і мой рэдактарскі стаж. Здаўся задоўгі? Ляпсусы перакачавалі і ў беларускі „Czasopis”. А я маўчу.

Сойм Рэчы Паспалітай выдаў інфарматар Mniejszości narodowe w Polsce (1995). Маю біяграфічную даведку нявідка-ўсёзнайка падправіла: Absolwent rusycystyki w Instytucie Literackim im. Gorkiego w Moskwie. І захіхікала зноскай: паводле анкеты. Хлусня, у анкеце я не пісаў, што закончыў русістыку. Гэта абсурд. Не было там такога напрамку, таксама як і англістыкі, раманістыкі, германістыкі і г.д. Не, нявідка лепш ведае. Яна ўсё можа. Вось кальнула ўжо незаслужаным званнем і з выдання Беларускага гістарычнага таварыства. І тут мне не вераць. А я маўчу.

Паўбяды з пракудамі нявідак. Горш, калі падобныя ягадкі знойдзе нейкі знаёмец з далёкага замежжа. Скажа, звіхнуўся стары. Бо

людзі любяць ляпсусы. Ці не таму іх распаўсюджвае і Фазіль Іскандэр, мой аднакурснік і, як я даведаўся з Астанкіна, выдатны рускі пісьменнік. Хто-хто, а ён павінен час ад часу заглянуць у свой дыплом. Дзе там! Слухаю і вушам сваім не веру. Расказвае Фазіль пра свае маладыя парывы і заяўляе, што выйшаў з літінстытута са званнем інжынера чалавечых душ. І каму паверыць? Вядома, яму. Таму я і маўчу.

Маўчу, хоць даўно разгадаў рэбус. Памаглі журналісты з Гродна. Аказваецца, рэдакцыі ў іх дзеляцца на кіраўніцтва і літаратурных работнікаў, няма, як у нас, гільдзейскай градацыі. Вось у чым фокус!

Ужо тэпаў я да фінішу, як цэхавая бюракратыя запатрабавала ад мяне дыплом, якім дагэтуль ніхто не цікавіўся. Трэба было зрабіць копію, і я, ускрылены дэшыфроўкай дыпломнай кваліфікацыі, вырашыў выручыць Міхася Хмялеўскага, прысяжнога перакладчыка, і падрыхтаваў яму гатовы тэкст перакладу, у якім, замест неўразумелага „літаратурнага работніка" ззяла гордае слова „журналіст". Міхась зверыў пераклад з арыгіналам і ззяючае слова з непрыхаванай насалодай выкрасліў. У мой натхнёны радок уставіў абрыдлую кальку: pracownik literacki. Вось так! Нарэшце і ён мяне паправіў. І я маўчаў. У яго ж важная пячаць.

І так, стартаваў я ў прафесію майстрам, а канчаў забег чалядніком. Развіваюся назад. Майстрам, як мне гэтага ні хочацца, ужо ніколі не буду. Але асноўнае адкрыццё наперадзе. Пачаўся партыйны землятрус, і гарадскі камітэт раздаваў персанальныя папкі. Прынеслі і маю. А ў ёй — ах, вы мае нявідкі! — характарыстыкі мае. Кожны парторг пакінуў сваю ацэнку. Найбольш уразіў першы, яшчэ з „Беластоцкай газеты". Паводле яго быў я непаслухмянай, зазнайлівай, з завышанымі амбіцыямі асобінай, якую трэба моцна трымаць у руках. Ну і ну! Што ж я такога там напракудзіў, каму залез за скуру, каго не слухаўся? Заглянула ў маю анкету нявідка? Пісаў у п'яным выглядзе? Відаць, так яно і было. Бо, працверазеўшы, дапісаў: Lubiany w kolektywie. Іншыя парторгі выказваліся расплыўчата, як усвой час незабыўны пан Дронь: Nic złego, nic dobrego.

Сумнае чытво. Ачмурэў. Крок наперад, два крокі назад. Як у таго класіка, толькі без аргвывадаў. Ну і добра. Наслоеная шэрань, што ўнеслі нябачныя мастакі, надае загадкавы сэнс аўтапартрэту, які маляваў я праз усё жыццё.

Кур'ёзная ў мяне не толькі прафесія, але і кар'ера.

— Адкрыць архівы бяспекі! — крычаць апантана правыя ашаломы. Падтаквае ім і левы прэзідэнт. А я маўчу. Магчыма, недзе там у цёмных падвалах ашчэрыліся даносы і на мяне. Хоць і цікава,

але не хачу іх чытаць, каб яшчэ больш не азмрочыцца. Хай іх чытаюць пацукі.

Хопіць пра цвіль, вернемся на Цвярскі бульвар 2, у Дом Герцэна, пад ясны ветразь на быстрацечнай плыні часу.

У студэнцкае жыццё ўвайшоў я з песняй. Не чакалі ад мяне такога? Тым лепш. Ужо на першым капусніку, як стары завадатар, выступіў у дуэце з пяцікурсніцай Інай Гоф. Спяваючы гарэзныя частушкі, мы прабавалі і танцаваць. Праўда, віравала Іна. Я, як карусельная мачта, толькі падтрымліваў тэмпераментную танцорку за ейны, выцягнуты над віхрастай галавой, указальны пальчык правай рукі. Нумар атрымаўся. Сан-Саныч, прафесар Аляксандр Аляксандравіч Рэфармацкі, наш кумір, нават пахваліў мяне за беззаганную дыкцыю. Можна сказаць, першы залік з мовазнаўства здаў я з песняй.

Студэнцкая песня пра „калідорны інстытут” дагэтуль весяліць маю памяць. Мы вучыліся, жылі і пісалі не выходзячы з родавага гнязда стваральніка „Колокола”. Камерныя аўдыторыі (на сорак асоб, якраз для курса) злучаў адзіны калідор. Жылі ў падвале, другі паверх займаў літфонд. У перапынках наш калідор гудзеў пчаліным роем. Тут нараджаліся каверзы і шчаслівыя ідэі. Несумненна, „Адкрыты ліст Саюзу Савецкіх Пісьменнікаў” (так называлася наша песня) складалі мы пад дыктоўку флюідаў Герцэна. Складалі гуртам, але адточвалі Іван Ганабін і Косця Ваншэнкін, прызнаныя інстытуцкія песеннікі.

На собраньях, заседаньях
Попрекают там и тут:
Коридорный, коридорный,
Коридорный институт.
Это слушать нам обидно.
Сколько зим и сколько лет!
Изменения не видно
И намёка даже нет.
Сколько разных поколений
Становилось на колени
И просило вас несмело
Дать редакторское дело.
Позабыли, очевидно.
Сколько зим и сколько лет!
И не слышно и не видно
И намёка даже нет.
И кому была охота
Делать в пятницу субботу?

Вот теперь наоборот —
Нет ни пятниц, ни суббот.
Это даже не солидно:
Кто прозаик, кто поэт?
И не слышно, и не видно,
И намёка даже нет.
Мы на первом курсе были,
Нам директора сулили.
Проучились мы все пять
Нет директора опять.
Как же ССП не стыдно?
Сколько зим и сколько лет!
И не слышно, и не видно,
И намёка даже нет.
Разрешили вы задачу,
Развезли всех по местам.
У Тренёва взяли дачу,
А литфонд и ныне там.
И когда он будет выгнан?
Сколько зим и сколько лет!
і г.д.

Жылі дружнай сям'ёй. Спрыяла камернасць інстытута. Вонкава нічым ён не розніўся ад старой прыдворнай школы. А ўнутрана? Выкладчыкам напрыклад, нагадваў царскасельскі ліцэй пушкінскай пары, і яны любілі называць нас ліцэістамі І не скажу, каб гістарычная аналогія нам не падзерлася. Толькі ці апраўдаем надзеі?

Сямейнасць мацавалі і творчыя семінары. Фармаваліся яны не па набытых ведах, а па творчых схільнасцях. Першакурснік карыстаўся правамі пяцікурснікаў. Вядома, былі свае аўтарытэты. Але вызначаў іх не студэнцкі стаж.

Па падказцы Федзі Сухава, які адчуў у мяне родную душу, пайшоў я разам з ім да Яшына. Аднак яшынскага семінара было мне мала і я, як толькі дазваляў расклад заняткаў, пачаў заглядаць і да іншых майстроў. Трапіў і да Паўстоўскага. Ачараваны Канстанцінам Георгіевічам і атмасферай, якая тут панавала, уключыўся ў працу празаічнага семінара. Не пакідаў і Яшына. На другі год кафедра творчасці вырашыла пачынаць усе семінары ў адзін час. Скончылася творчае „валацужніцтва", трэба было выбіраць: проза ці паэзія. Перамагла паэзія. Цяпер, дацёрты рэдактарскім ярмом, выбраў бы прозу, менш муляла б. Экскурс між дужкамі.

Пасябраваўшы з перадзелкінцамі, я перабраўся ў загарадны інтэрнат, на дачу Транёва.

Перадзелкіна жыло сакавітым жыццём. Жывапісная мясціна стварала цудоўныя ўмовы для ўзлёту душы і аднаўлення цела. Колькі тут вершаў напісана, колькі мячоў забіта ў вароты мясцовых „чмыроў" (наша каманда „Крылы паэтаў" была самай моцнай сярод творчых вузаў Масквы), з якіх абрываў мы не спускаліся (хто на лыжах, а хто на хвастцу), якія канцэрты мы тут давалі! Я знаходзіўся ў цэнтры падзей, быў намеснікам старшыні студсавета, верхаводзіў у многіх спаборніцтвах і гульнях. Такім і ўвайшоў у паэму Сашкі Гевелінга Всё в твоём сердце (1958). Дарчы надпіс: Дорогому другу Егору Волковыцкому, моему любимому человеку. Цікавіла: выступаю пад мянушкай Мазавецкі а мой дзядзька завецца Тадэушам. Вядома, пра будучага польскага прэм'ера аўтар нічога не ведаў І аксама, як і я. Супадзенне ў прасторы. Крылатым перадзелкінскім рэхам гукаў і Міша Шаўчэнка Зборнік вершаў „Спасибо тебе за цветы" (1964):

**Друг**

Я жил года два — не больше—
В одном общежитьи с ним,
Рабочим парнем из Польши,
Хорошим другом моим.

Он был футболистом чудесным,
Рассказчиком славным был.
Но, помню, особенно песни,
Русские песни любил.

Бывало, я после лекций
Садился за клубный рояль.
И песня рвалась из сердца,
Звала в полевую даль.

Туда, где шумит пшеница
И края ей не видать,
Где любо остановиться,
Любимую подождать...

Он пел с белостокским акцентом
И очень душевно подчас.

По вечерам студенты
Охотно слушали нас.

И часто шутили лукаво:
Два Лемешева поют!..
Один — теперь в Варшаве,
Закончил он институт.

Мы встретимся с ним, я знаю,
Но как-то недавнего жаль.
Я друга всегда вспоминаю,
Открыв институтский рояль.

Он был футболистом чудесным,
Рассказчиком славным был.
Но, помню, особенно песни,
Русские песни любил.

І ў 1967 годзе мы сустрэліся ў Маскве. Разам з памянёнай кніжыцай, падарыў ён мне і жменю перадзелкінскіх жалудоў. Падарыў жывы ўспамін. Падмаскоўныя дубкі растуць у Белавежы. Расце і ў маім сэрцы жаль аб незваротным.

Адшумела Перадзелкіна: дубы, сосны, казачны бярозавы гай. Ужо знікаюць з маіх сноў. Але часам вецер ад усходу прынясе ў Белавеж далёкую пагалоску:

Наташка Лаўрэнцьева, не скаштаваўшы як след „кур'ёзнай" прафесіі, пры выкананні рэдакцыйнага задання разбілася на матацыкле, Міша Шаўчэнка стаў аргсекам Саюза рускіх пісьменнікаў, Зоя Крахмальнікава падалася ў рэлігію, увайшла ў саіздат стала "сідэнткай" (дасідэнты, сідэнты, адсідэнты), Фазіль Іскандэр у „Мемарыяле", Сяргей Арлоў памёр, Барыс Нікольскі ўзначаліў „Неву" Геза Домакаш у рэвалюцыйным камітэце, які звергнуў Чаўшэску. Пераменны ўсходні вецер, мала вестак прыносіць. Мільганулі на тэлеэкране Субоцін Жухавіцкі. А рэшта з магутнай „саракоўкі" ні гу-гу. Дзе вы цяпер, мае аднакурснікі?

Аднойчы засек на Астанкіне дзіўна-знаёмага старэчу. Бэсціць Эрэнбург. Дык гэта ж Фёдар Сухаў, паэт кукующей России. Мой аднагодак. Як ён стары! — жахнуўся я. Няўжо і я такі? „Почвенник" усміхнуўся, і я пачуў:

Полно хмуриться, друг мой, полно,
Лучше сядем да посидим,

Да стаканы свои наполним
Вдохновением молодым.

Ах, Федзя, Федзя!

## Парасон

Паміж дрымотным Белавежжам і задумлівым яцвяжскім прыазер'ем распасціралася Белавытоцкае княства. Хоць віхор падзей адправіў радавітых вяльможаў на звалку гісторыі, жыццё ў ім ішло па ранейшых законах. Правіў велікамэтна князь, а вядучай кастай, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, была Парпія, прыкарытная, чыноўніцкацівунская рацць паклоннікаў Краснага Сонейка. Князі былі, як і раней — і добрыя, і злыя. Адных і другіх сюд-туд змывалі прылівы перманентнага аднаўлення — і край уваходзіў на новы віток спробаў і памылак. Тады і здзяйсняліся запаветныя мары продкаў.

Сябравіцкі энклаў не адставаў ад поступу Белавыточчыны. Ішоў поруч і ў час чарговага аднаўленчага прыліву, калі на безыменнай вышыні паміж Пячкурамі і Бачкарамі славуты дойлід Майсеня пабудаваў пячкура-бачкарскую краму.

Неўзабаве, дзякуючы чарам дбайнай і прабіўной гаспадыні, крама ператварылася ў сапраўдны сезам мясцовага значэння, і не толькі.

Рос дабрабыт сябравітаў, расла і слава казачнага сховішча прадуктаў разняволенай працы. Нават Скорабагатыя з Белых Вытокаў у сябравіцкай кладоўцы папаўнялі свае ўзрастаючыя запатрабаванні. А які моцны дух уступаў на сезамавай горцы ў падваротных глушыцеляў піва! Гэта для іх беленькі столік, адмысловыя зэдлікі і — аж дух займае — бел-чырвона-паласаты купал агромністага парасона. Пад ім, у куфлі ірдзістага „Гетмана” (самасвежага, самагатунковага) нават асавелым застольнікам выразна вырысоўваліся абрысы будучага Светлагорска, які зраўняе вёску з горадам. Жыві і помні словы Вялікага Стырнавога: „Кожны па сваіх магчымасцях, кожнаму па ягоных патрэбах”.

А патрэбы, як вы ўжо ведаеце, раслі. Таму шчаслівыя сябравіты з ахвотай плацілі даніну Бахусу, які набліжаў іх да прамяністага прывіду, што ўставаў над энклавам, і беспаваротным крокам ішлі ў іншае вымярэнне.

Аднак...

Героі прагнуць буры. І яна, як і належыць стыхіі, наляцела нечакана. Каварны заходні вецер вырваў з абагуленай уласнасці

блазенскі парасон і перанёс яго ў прысядзібны агародчык ахоўніцы сезама. Злачынная роля, адведзеная перабежчыку налётным прыблудам, узбударажыла зоркага следапыта і ён апратэставаў ветрагоннае рашэнне ў „Дабравесні- ку", хронiцы сябравітаў, што людзьмі пачалі звацца.

І выпусціў з бутэлькі злога духа. Гераіня спачатку ўдарыла ў наша выродлівае сумленне, прыслала дакорлівы ліст: маўляў, палюбіла, дурная, вас ад першага погляду, верыла вам, а вы мне так аддзячылі.

Пакутліва стала на душы ад слёзнага прызнання вернай паклонніцы, ды не развеяўся яшчэ сум па горкай страце, як прыйшло і дзёрзкае патрабаванне выдаць асведаміцеля, з'явіцца на вочную стаўку і выказаць у сваёй „паганцы" пакаянне.

Вырашылі мы пачакаць, хай гераіня астыне ад гарачкі, мо тады гляне на нас ранейшымі вачыма. Мы ж ёй не жадалі зла, хацелі толькі вярнуць грамадскі парасон на старое месца.

Муж крамніцы, дзесяцкі прыкарытнай ячэйкі, падышоў да пытання з палітычнага боку. Парасон — дымная заслона. Распазнаў вас, сабачыя сыны. Хочаце знішчыць ячэйку! Nopasaran!

І новы герой, азораны высокай ідэяй, падаўся ў Ярылаўку, у Гмінны камітэт. Запахла паленай серай. Выкупаныя ў чысцілішчным чане, загаўкалі мы па-сабачы.

— У дыверсанцкі катух, пярэкрутаў! — загадаў чысцілішчны цівун.

Круцяць храністы нетутэйшымі зрэнкамі і думкі іх made in CIA.

А за занавешанымі вокнамі парпісцкай базы свінцовымі слоўцамі застукала пішучая машынка. Затым грозна грымнула сотнікава пячаць, зашыпела гнеўным канцылярытам службовая паперына і выпушчана праз ведзьмакомін на волю, паплыла над княжымі лясамі ў пасад, і апусцілася на спадчынны стол князя.

Уздагон панесліся і штампаваныя копіі. Адна з іх прыстолілася і ў „Дабравесніку”.

Шэдэўр прыкарытнай фантазіі! — захапляўся я, у каторы раз разглядаючы бляклую пісульку. „Сябравіцкая хроніка пераўтварылася ў філіял Вольнай Еўропы”, — пісаў сотнік.

Апрача небяспечнай метамарфозы, выкрываў ён і затоены напрамак „Дабравесніка”: атака на Парпію з мэтай знішчэння вясковай ячэйкі.

Як жа сотнік не ведаў мяне! Я, які не мог адолець самага кволага звяна СЭ (сябравіцкага энклава), пасля сотнікавага давартасцявання, адчуў сябе волатам. Прачнулася ў мяне затоенае жаданне падужацца з ГПСЭ, і вырвацца з учэпістых абдымкаў тырана.

Не лезьце, праведнікі, у мае шалёныя думкі. Такі быў час. Звіхнуўся ж не толькі дзесяцкі, але і сотнік. Кожны жыў у сваім ачмурэнні.

Ды пакуль я асвоіў наступальную тактыку, затарахцеў з'едліва службовы тэлефон. Ён і выцягнуў мяне з вызваленчых сноў і вярнуў у прававерны рад. Званіў Падбельскі з манкурцкага племя Sieru- пу, князёў падручны па одапісцах.

— Чаму не адказваеце на скаргу з Ярылаўкі? — дакарае з націскам на пятае слова.

— Скарга?! — здзіўляюся. — Каму адказваць? І чаму гэта павінен рабіць я? Сотнік пісаў вам.

— Не прыкідвайцеся наівам, — чую. — Пішыце тлумачальную запіску.

Прысаромлены, няўцямна варушу недаразвітымі звілінамі свайго шэрага рэчыва. Няўжо і на княс- кім двары паверылі распаленым помстай пітэкантрапам? — пацею. Т, здурнеўшы, стаўлю адчайнае пытанне:

— А што мне пісаць, што не агент ЦРУ?

— Гэта ўжо ваша справа, — суха адказвае Падбельскі і шматзначна спыняе размову.

Атрымаўшы маўклівы дазвол на самавыяўленне, я лёгка склаў самакрытыку. Прызнаўся ў злачынстве здрады, пакаяўся і, як гэта рабілі старыя бальшавікі, папрасіў суровага пакарання. А каб было больш цярпіма адбываць кару, заявіў, што ў ЦРУ завербаваў мяне сотнік з Ярылаўкі. Маліў: адчапіцеся толькі ад „Дабравесніка", вы ж усе магістры, а то і дактары, у белых каўнерыках, пад гальштукамі, павінны ведаць: выдае яго багаты дзядзька, які корміць і вас.

Чакаў грымот, а бура прайшла бокам. „Круглы стол" падвёў рысу пад бесперапынным бурапен- нем. І так, неасмалены, трапіў я ў тупік новага лабірынта. Даганяючы ўчарашні дзень, гукаю:

— Дзе ваша пільнае вока, таварышы па Парпіі, цельпукі дырэктыўныя! Уляпілі б хоць страгача за скажэнне белавытоцкай рэчаіснасці, запаліўся б цяпер і для мяне агеньчык у канцы тунеля. А то рупныя фліртуны, што ялейна ў раты вам заглядалі, салаўямі заліваліся, сёння, акірачыўшы аблезлую кабылу гісторыі, ёрзаюць „барыкаднымі" азадкамі, дзеляць энклаў на прысмаленых і падфарбаваных і, асlеплыя ад нянавісці, пераможна крычаць „ура".

А я, які быў, такі і астаўся — чысты, як сляза.

Аднак не дагнаць мінулага. А ў новым прадонні непрыемнасці. Куды ні глянь, усюды пэцканцы з прыпудранымі мазгамі. І кожны сваю пляму, як сцяг нясе. А я чысты. І мне, як таму Марку, цяжка

блукаць сярод паласатай чэлядзі і фарысеяў з пакрышанага варажнечай энклава. Дзеля якога ражна вы яго пакрышылі?

На брукованцы ў чысцільню набрыў я на ярылаўскага сотніка. Пасміхаўся ў смалістыя вусы і пакручваў пальцам ля калматай скроні.

Зноў пойдзе выконваць баявую задачу? (хі-хі!). Усё паўтараецца?

Упэўненых у сябе
І чорт не саб'е.

Так кажа Сідар.

Дзіўны аднак быў той парасон. То самахоць прызямляўся на падворышчах вірлівых сезамовічаў, то пераўтвараўся ў парашут заакіянскіх дэсантнікаў і вісеў злавесна над спакойным энклавам сябравітаў.

А гераіня? Што з ёю? Пасля часовага пярэпалаху, з душэўнай пакуты звіла на пасадскім алімпе надзейнае гняздзечка і стала важнай птушкай. Але гэта ўжо іншая казка.

*Храніст*

## Споведзь старога рэдактара

### I

Я з даваення спавядаў касмапалітычную ідэю Не тую, што „маскіруе агрэсіўны буржуазны нацыяналізм (БСЭ), а вынесеную з польскай школы: касмапаліт — грамадзянін свету.

Глядзеў я на зямлю, як на маленькі касмічны караблік, замаленькі, каб яго перакройваць штучнымі межамі, абгароджваць нацыянальнымі катухамі дзе усе чужое вярэдзіць ноздры, а сваё тхло не смярдзіць. Шукаў выйсця з міжнацыянальнай варажнечы, якую назіраў і ненавідзіў. Касмапалітычны падыход парадкаваў мой душэўны разлад Было тут месца для роду і племені, але панавала згода, добрасуседства, гармонія.

І сеў за рэдактарскі стол з падобнымі ідылічнымі марамі. Было мне 32 гады. Як і належыць казачнаму сюжэту, упоравень з мройнай мэтай, усталі і залыпалі нахабнымі вачыма адвечныя спадарожнікі летуценнікаў — шэрыя будні.

Паплылі ў рэдакцыю пісьмы. Пасля прытоку чытацкай радасці (вітаем! вітаем!), з'явілася і каламуць (хто выдумаў гэту беларускую мову?!). А Вера Леўчук прывозіць з майго Белавежа апакаліпсічную вестку: з запаведнага цэнтра знік беларускі этнас. Зубры — так,

засталіся, а беларусаў — ніводнага. Гэтак асвяціў журналістку начальнік мясцовай пошты.

Дзіўныя дзівы тварыліся ў царскім будынку з чырвонай цэглы, у якім дагэтуль месціцца белавежская пошта. Чырваняк пабудавалі для егераў. Пасля першай вайны пасяліліся ў ім: паліцыя, суд і пошта. У апошнюю вайну арудавала тут гестапа. Не зважаючы на чорную пляму, будынак упадабала і народная міліцыя.

З яго змрочнымі калідорамі ўпершыню пазнаёміўся я ў 1947 годзе. Вярнуўшыся з войска, не меў за што зачапіць рук. Сунуўся сюды-туды, нідзе не прымаюць. Раптам Юрка Гляд, сакратар гміны, прапануе працу ў сябе. Неўзабаве атрымаў я і назначэнне на адміністрацыйнага рэферэнта. Адзначу падзею ў суботу на танцах, а ў панядзелак на працу.

І завіравала. У разгар танцаў выводзяць мяне з тлумнай залы кіно („трэба пагаварыць”) і вядуць, ашаломленага на пастарунак. На другім паверсе, над поштай, бар'ер; за ім стол, на стале наган, за сталом Кіроша, мядзведзіна — парторг белавежскі. Мы да цябэ даўно прыглядаемса. Нагуляўса. Уступай у партыю. Дамо працу, пашлём вучыцца. Я ўжо дастаў працу. Дзе? У гміне. Ну і добра, будзеш Гляду на рукі глядзець. Тады пасылайце вучыцца.

Так, і дня не паруліўшы ў гміне, з выстаўленым Кірошам пасведчаннем, што з'яўляюся jojalnym obywatelem, еду ў павятовую інстанцыю па накіраванне на вучобу. Засмучае Кірошава заключэнне: мог жа напісаць „актыўны”. Ды які з мяне актывіст? Хіба ў вясельнай справе: над колькімі галовамі трымаў вянец, сам у вянчальнае сіло не ўблытаўся. А „jojo”? Была перад вайною такая папулярная забаўка-вяртушка.

Jojalłiość аказалася дастатковым аргументам на пропуск у новае жыццё. Было мне дваццаць чатыры гады. Варшава. Уздым. Не паспеў нацешыцца ўсмешкай лёсу, як страціў стыпендыю: сын багацея. Праявілі класавую чуйнасць землячкі — ЗВМаўцы. Пакуль прыйшла з гміны даведка аб „маёнтку” бацькоў, пакаштаваў жабрацкага хлеба.

Вернутая стыпендыя ўсяліла веру ў справядлівасць, а „Маніфест Камуністычнай партыі” натхніў на подзвіг. Стаў я выдатнікам вучобы і грамадскай дзейнасці. Затым прыйшла і вестка, што прынялі ў партыю. Праз гады даведаюся: я — з Вальтэравага прызыву. Шкада, позна даведаўся: уцёр бы насы слінявым паклёпнікам.

У Маскву ехаў па ахвоце. Хоць і штурхала туды крыўда ад беспадстаўнага абвінавачання. Уцякаў ад пільнасці землякоў.

А калі вярнуўся з маскоўскага выраю — чаму не хаваўся ад іх? Ад сябе не ўцячэш. Слухаўся сэрца. У пагоні за сваімі „Раённымі

буднямі” трапіў у апаратную твань. Ратавальным берагам была „Ніва”. А Альфрэда Раманоўская, пані ад беластоцкай культуры, недаўмявала: „За што?!” (За якую правіну пагналі з прэстыжнай пасады?).

II

Зараз пра наш рух пішуць магістэрскія працы. Маладыя аўтары, часта прыхільнікі чорна-белага мыслення, прыходзяць за матэрыялам і да мяне. Найбольш здзіўляе іх феномен нараджэння „Нівы”. Начытаўшыся сучасных публікацый пра недалёкае мінулае, ім, строгім выкрывальнікам змрочнай явы, цяжка зразумець, што ў той час можна было стварыць нешта самабытнае. Ахвотна бачаць” яны за нашымі гарбамі нейкія чужыя сілы, або палкоўнікаў вядомай службы, што грукаюць кулаком у стол рэдактара:

— Так мае быць!..

Вымушаны я іх расчароўваць. Аблічча „Нівы”, яе накірунак і месца пад сонцам выбіраў сам, без таемных падказчыкаў і дырэктыўных стражнікаў. Так было і на працягу ўсіх маіх 32-х гадоў рэдактарскай працы. Дык мы хацелі быць не толькі самабытнымі, але і незалежнымі, хай і рэгламентаванымі. Праўда, часам за гэту фанабэрыю мылілі нам шыю („Ніва” адрываецца!), але, калі я прытрымліваў язык, прыходзіла і бацькоўская ласка, і мы зноў, намацваючы сваю дарогу, дружна цягнулі застольную песню пра вятры, што ў нетрах бушавалі.

Важна было не ўпарціцца. А мне якраз гэтай якасці не хапала. Замнога спадзяваўся на сябе. Сёння, узбагачаны заднім розумам, зразумеў сваю памылку. Урэшце дацяміў.

III

Звернутыя да сённяшняга, хуткаплыннага, бачылі мы і пагрозныя вятры, і некранутыя нетры. Усё, што адбывалася навокал, бралі блізка да сэрца. І добрае, і дрэннае.

Неадназначна ўспрымалі нас людзі. Апрача прыхільнасці, сустракалі і грэблівасць. Многія беларусы пад уплывам паланізацыі страцілі нацыянальную свядомасць, або прыкінуліся палякамі і наша груканне ў іх душы выклікала ў адных стоеную злосць, у другіх — непрыхаваную нянавісць Неўзабаве адкрылі мы, што самымі зацятымі беларусафобамі з'яўляюцца пярэваратні. Яны і раздувалі хлуслівыя чуткі. А то мы гняздо сталіцаў а то далучэнцы - і толькі чакаем зручнага моманту да перакройкі межаў.

Рваліся старыя сувязі. Нядаўнія паплечнікі зларадна усміхаліся:

— Спасуеш...

Адліжныя змагары з неразмарожаным нутром Не разумелі, што і мы не ад мачахі, што і нам патрэбен глыток свежага павеву. Ды не, толькі адтэрміноўвалі наш драматычны зыход.

Я, як мог, адганяў ад сябе чорныя думкі і пільную увагу кіраваў на чытача. Выдумоўваў розныя конкурсы, наладжваў цесныя кантакты з поштай і „ гухам . Журналісты таксама ў кожны выезд сустракаліся з паштарамі, здабывалі іх для нашай справы. Адным словам, аб банкруцтве не думалі. Павялічвалі тыраж, ламалі задворкавыя бар'еры недаверу у чужых і бадзёрылі сваіх. Так было із артыкулам „Што з намі будзе", які з'явіўся на старонках „Нівы бурлівай восенню 56. Артыкул, супакойваючы чытачоў, узбударажыў ненашаў з „Беластоцкай газеты" і яны высмажылі злосны адказ — A co ma byc? Развважны рэдактар не пусціў яго У друк. Праз гады эпізод адгукнуўся ва ўспамінах аднаго з удзельнікаў гарачай рэдакцыйнай дыскусіі, якую выклікаў наш артыкул. Дасталася на ёй „Ніве". Колькі вазні, а дастаткова было пазваніць і спытаць, у чым справа. А справы і не было. Мы якраз адказвалі на хвалюючае людзей пытанне. У загаловак не ставілі пытальніка, які з гарачкі ўбачылі нашы ганіцелі. Сказаў аб гэтым мемуарысту. Здзівіў.

Сапраўды, што хочацца ўбачыць, тое і бачыцца.

IV

Глядзець сваімі вачыма! Гэта не так проста, як можа каму выдацца. Я гэтаму вучуся ўсё жыццё. А ці навучыўся? Бяздушным на вонкавыя ўплывы ніколі не быў. І нешта пазычанае, пэўна, адлюстроўваецца і ў маім позірку. Усяго не пераварыш. Каб толькі чужы налёт не зацьміў убачанае. Ты ж хочаш памагчы чытачу разабрацца ў рэчаіснасці, у якой жыве. А ён ахвотна верыць у неверагоднае і скептычна ставіцца да дакумента. Паверыць у факт — вялікая перамога.

Ці ўдалося нам перацягнуць на свой бок недаверлівых? Пастаянны рост тыражу даваў станоўчы адказ. У нашу карысць сведчыў і прыліў карэспандэнцкіх допісаў і чытацкіх пісем. Удалося і ўтрымаць устойлівую раўнавагу матэрыялаў аб добрым і дрэнным. Хоць і вывучалі жыццё метадам „проб і памылак", глядзелі на людзей не толькі вачыма, але і душою. Мы шчыра верылі ў аднаўленне. І хай у гэтым перакананні шмат было наіву, сыграла яно станоўчую ролю ў развіцці тыднёвіка.

У змаганні за чытача трымаліся крыніц, наносілі на карту мясціны, якія ўжо асвоілі, так і пашыралі сваю асноўную базу — вясковую Беласточчыну. Затым пачалі рэйдаваць па краіне, асабліва вабілі нас заходнія землі, дзе жыло шмат беларусаў, увагу прыцягвала

і сталіца. Усюды чакалі нас цікавыя адкрыцці і знаходкі. У „Ніве" з'явілася цэлая галерэя красамоўных партрэтаў землякоў, якая аспрэчвала пануючы ў нас стэрэатып, быццам беларусаў усюды праследуе зацюканае паходжанне. Пры нагодзе, у польскіх архівах знайшлі шмат беларусікі. На гэты бок нашай дзейнасці асаблівую ўвагу звярнулі беларускія даследчыкі. У сваіх працах яны часта спасылаліся на нас, а затым і самі наладзілі ў Польшчы плённыя пошукі.

А мы пашыралі тэматыку, стваралі новыя рубрыкі, „старонкі", „палеткі", „агародчыкі", „званіцы". Асаблівае месца заняла „Зорка", як дапаможнік у навучанні дзяцей роднай мове, і літаратурная старонка, як творчая майстэрня „белавежцаў".

Пашыраўся і аўтарскі круг. У пагоні за новымі прозвішчамі пайшоў я нават на трук, расчляніўся. З'явіўся Лясун, Асініч, Зубрыцкі, Ювэ і шэраг іншых таямнічых аўтараў. Палюбіў гульню. Хто гэты „новы"? Сам хачу даведацца. Так засакрэціў небаракаў, што не плаціў ім ганарараў. Працавалі для ідэі. Дзе там! Сталічны авангард узняў шум. Выкачвае нашы грошы сваім фаварытам! І я наступіў на горла ўласнай песні.

Часта трапляў у дзіўныя сітуацыі. Паехаў з саліднымі дзядзькамі ў Мінск. Прынялі нас паводле першага разраду. Чаму ж утойваць факт перад чытачамі. Мы — гэта вы! Будуць задаволены. Акурат! Цэлая старонка здымкаў, і ўсюды — ён. (Ніна Мушынская). Што ж мне было рабіць, уцякаць з кампаніі? І ўцякаў: убачу нацэлены фотааб'ектыў — і ў ногі. Прызнаў рацыю заслужанай дзяячцы, калі Хмара пачаў прысылаць сваю газету: у кожным нумары фота рэдактара, абавязкова — то ў сям'і, то на нейкім прыёме. Глядзеў на рэдактарскую самарэкламу і пасміхаўся.

Нашы стырновічы Хмары не чыталі, але ўпадабаны мелі цюцелька ў цюцельку: як ні круці, а партрэт дай, і без бародавак, і з залатымі думкамі, народжанымі ля стырна. Толькі злітуйцеся, золата нараджайце самі. Го! Дык я патрачу цэлы дзень. А я што, крутануў пяром — і залатая думка?

Мне ўсё даецца лёгка. І раптам, пасля бурлівага з'езда БГКТ, пашыўся ў цяльпукі.

— Не выйшла? (Тая ж дзеячка. З іроніяй).

— Што не выйшла?

— Не ўдалося стаць старшынёю! (З металам у голасе).

Каханенькая, толькі гэтага мне не хапала.

Не на ўсіх напрамках і пашырыўся. З-за палітычных завалаў непраходнымі аказаліся шляхі ў беларускае далёкае замежжа, як яно зараз завецца, і ў тутэйшую царкву. Па-сапраўднаму на гэтыя

тэрыторыі ўвайшлі мы толькі ў васьмідзесятыя гады, калі ўжо нагляду было не да нас.

V

Мы герояў сваіх не дзялілі на „нашых” і „вашых”, не вялі і ўзроставай класіфікацыі. Кіраваліся здаровым сэнсам і напрамкам, які абралі. Краіну, у якой нарадзіліся і жылі, лічылі сваёй айчынай і лаяльна ёй служылі, хоць нацыянальнае пытанне не давала нам спакою. Таму як нечаканую пагрозу ўспрынялі „вырашэнне” гэтага пытання палітычнымі вярхамі. Польшча — адзінанацыянальны маналіт. А што з намі? Становішча кіруючых органаў развязвала рукі мясцовым культуртрэгерам, і яны рабілі адпаведныя высновы: калі ў Польшчы адны палякі, то трэба згортваць беларускую непатрэбшчыну.

І руплівцы апячаталі нас грыфам „Тайна”. Жывем у Польшчы — і не жывём. Колькі засталося магікан? Ніякіх лікаў. Забаронена. З'явіўся другі том БСЭ: у ПНР жыве каля 200 тысяч беларусаў. Зашыкалі стражнікі маналітнай чысціні: хто выдаў тайну?

Чаго баяліся? Інтэрнацыяналізму? Пад руплівцаў запраграмавана і навука. Сацыёлагі: беларускі этнас? Магма — цеста, мазь. Этнографы: беларускі музей? Нельга — экспанаты агульнапольскага арэалу. Пагаджаюцца на прыметнік „рэгіянальны”.

А руплівцы галёкаюць. „Беларуская кветка”? Няма нацыянальных кветак. „Беларускі Гарадок”? Дзе жывяце — у БССР ці ў Польшчы? Урэшце забараняюць у рэдакцыі гаварыць па-беларуску. „Ніва” ў Польшчы, — тлумачаць. Якая ж тады гэта Народная Польшча? З экскурсіяй БГКТ у Мінску. На сустрэчы ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Надуты і, відаць, важны чын у зашпіленым пад шыю фрэнчы (увайшоў у час „пытанняў і адказаў”, не прадставіўся) павучае ў тон беластоцкіх настаўнікаў: прыехалі з Польшчы, дык і размаўляйце па-польску, не калечце прекрасной беларускай мовы. Маўляў, бярыце прыклад з мяне, я не калечу, гавару па-руску.

Чаму ж ты нам не прапануеш курсаў прекрасной мовы?

Натхнілі.

А ў Беластоку новы штуршок: пераўтварай „Ніву” ў двухтыднёвік. Штурхача знесла з гарызонту Геркава прышэсце. Новыя культуртрэгеры б'юць у лоб: касуем „Ніву” і на яе месцы ствараем польскамоўнае выданне.

Хапіла вытрымкі — нам, каб не ўступіць, і розуму — другому боку, каб адмовіцца ад злавеснага намеру. Затое моцны ўдар быў

нанесены беларускай мове ў школах. Тут выканаўчым аказаўся загад міністра.

Хоць і не выкурылі нас з наседжанага гнязда, былі мы старонімі птушкамі. І гэта ад самога пачатку, бо ўвесь час жылі з грашовай пятлёй на шыі. Больш дасціпныя чыны раілі сілкавацца энтузіязмам. А ён з гадамі вычэрпваўся і сёй-той шукаў нармальнасці ў іншым, выгаднейшым прыстанішчы.

„Ніва", як і ўсе выданні прэсавага канцэрна ПАРП — Рабочага выдавецкага кааператыва (RSW) — была пад партыйным наглядам, але мы не працавалі па кіўку зверху. Мяне кідала ў жар, калі нехта прабаваў умешвацца ў рэдакцыйныя справыведаў: я ў іх разбіраюся лепш, чым хто б ні быў звонку. А штуршкоў атрымаў нямала, асабліва У час мачарызму ці сумнавядомага беластоцкага шабашу ведзьмаў.

Паварушыў памяць, і ўвайшоў у цяжкі сон. Як я цярпеў толькі год такую жуду? Суперселектыўная пані, мая памяць. Былі ж, пэўна, у гэтым прывідным жыцці і ясныя хвіліны. Чаму яны выпалі з памяці? У яе розныя сіты? І прыходзіць спозненая рэфлексія: і я ж таксама не анёл, і мяне цярпелі — не толькі апаратная чэлядзь, з якою я мала лічыўся, але і начальства, якое я прызнаваў, ды якога не заўсёды слухаў.

Чаму ж я ўсё-ткі перажыў усіх уладных кіраўнікоў і прайшоў праз усе крутыя завароты? Не знаходзілі на маё месца лепшага пакутніка? Было і такое: у час чарговага хрыбетнага выпрабавання прапанавалі мне спакайнейшую і лепш платную пасаду. Калі я адмовіўся, пачуў: — Ну так, а хто на тваё месца? Развязвайце рэбус як хочаце, але тое, што я трапіў у лік даўгавечных рэдактараў (здабыў нават тытул „жалезнага"), не мая заслуга. Іншая справа — вернасць „Ніве", проста па-за ёй не бачыў сябе. Значыць, не хапала фантазіі.

## VI

Нацыянальнае пытанне няраз усплывала на нашых форумах. Часта падмянялася яно „ленінскай палітыкай", асабліва калі трэба каго агарошыць. Вось і мяне аднойчы пастрыглі пад антыленінца. Гэта не каштавала вялікіх захадаў. Нягледзячы на маскоўскую школу, у ленінізме, як і ў марксізме, мала я разбіраўся. Па-за „Маніфестам" ніякай тэарэтычнай працы не адолеў. На „Капітале" палёг ужо на другой старонцы, тое ж было і з іншымі асновамі.

Давай гартаць карыфея. А ў яго ўсё глабальнае і я ў гэтай масе — непрыкметная пылінка. Як яны ўбачылі яе і пазналі, што чужая? Брэшуць, самі Леніна не чыталі.

З доследаў зрабіў цыкл. Выйшла дуля ў кішэні. Нашы леніназнаўцы неўразумела хмыкалі: навошта друкуе?

Закамуфляжыў. Іншая рэч верш „Новае”:

У старога свету ўсё ў палоне мы,
Новае — не з музыкай парад:
Скрытымі мяцежнымі калонамі
Цягне нас мінулае назад.
Ведамі рубежнымі ахутаны,
Гойсаем з прывалу на прывал;
Заадно, змагаючыся з культамі,
На парожні рвемся п'едэстал.
Ганім век, які пражыць нам выпала,
І ў нябесных прыдарожных снах
Меданоснымі зямнымі ліпамі
Садзім неабжыты Млечны Шлях.

Здаўна цікавіла мяне ідалапаклонства, у гэтым і культ Сталіна. Назіраў я і прышэсце бога, калі ён памятнай снежаньскай ноччу 1949 года аб'явіўся народу на маскоўскім небе. Бачыў і праўдзівыя слёзы ў вачах сябра, калі бога не стала, і шчырае здзіўленне: чаму я не плачу.

Ад сталінскага чаду выратавала мяне смешная акалічнасць. У час акупацыі трапіла ў мае рукі рускамоўная газетка з пскоўскім адрасам. Быў у ёй малюнак: сядзіць Вусаты Вяршыцель у траве і абгрызае вялікую галёначную косць. Пад малюнкам вершаванае тлумачэнне:

Сидит Сталин на лугу
И ест конскую ногу.
Фу, какая гадина,
Советская говядина.

Далёкі ананімны папярэднік Кашпіроўскага адцяў ад мяне атрутны дым з трубкі каўказскага чараўніка назаўсёды. І я пачаў глядзець на Сталіна вачыма карыкатурыста. Так было і ў тую ноч на Краснай плошчы, калі я разам з аднакурснікамі любаваўся выявай, што ў праменях пражэктараў ззяла высока над крамлёўскімі зоркамі. Так было і на святочных шэсцях, калі я са шчыльнай калоны не ўпускаў моманту зірнуць на Правадыра. Старэў Бацька, часам мой зрок толькі коўзаўся па ягонай, абернутай да народа, сівой патыліцы: у такой позе адпачываў на Маўзалеі. Так было і ў магільні, калі мы, польскія студэнты, перад ад'ездам на радзіму, наведалі Маўзалей.

Спосаб праверыў і на іншых вяршыцелях. Дзейнічае. Дастаткова паставіць звышістоту ў смешнай позе.

Ад заранку вякоў ідал спадарожнічаў роду чалавечаму, не сканаў і пасля свяшчэннадзейства Мікіты Сяргеевіча. Атрымаўся камедыйны сюжэт: „Кукурузнік”, скідаючы з пастамента вусатага ідала, сам карабкаўся на апарожненае месца. Гэтай з'яве і прысвяціў я свой верш. Відаць, намякаў празрыста, бо „Новае” з „Нівы” перакачавала ў „ЛІМ”.

VII

У мой час „Ніву” чыталі ў трынаццаці краінах свету. Трынаццаць — шчаслівая для мяне лічба, бо нарадзіўся я пад гэтым знакам. Ён знімаў і галавакружэнне ад міжкантынентальнага вандравання — трапіць у чатырнаццаты край, як ні стараўся, не ўдалося. Тым не менш, цешылі нас маршруты „Нівы”, а калі Пасэнт з „Палітыкі” выявіў „Ніву” нават у бібліятэцы Гарварда, было чым і паганарыцца.

Аднак найбольш цікавіў мяне беларускі бок. Як „Ніва” пераадольвала ўсходнюю мяжу? Па рознаму. Здараліся гады, што трапляла ў Беларусь і 500 экземпляраў. Нямала, улічыўшы наш сярэдні тыраж (8 500). Былі прылівы і адлівы. Усё залежала ад скразнякоў і бэсэсэраўскіх ахоўнікаў братэрскай чысціні. Адным не падабаліся мы за гістарычны ўхіл, другім — за сельскагаспадарчы напрамак (гурткі), трэцім — ха-ха! — за падабенства да недабітых бебурнацаў.

Беларускія пісьменнікі хвалілі нас за заходнебеларускую традыцыю, журналісты — за жывое слова, але трывалых зносін устанавіць не змаглі Відаць, праз тых самых варатароў.

Марыў я аб сваім прадстаўніку ў Мінску. Мара няхітрая, здавалася б, рэальная: мы ж усходнюю палітыку вялі ў белых пальчатках, канцэнтраваліся на дасягненнях, не рылі сваім лычом суседскага агарода. А мара не здзейснілася.

Злую ролю згуляў недавер.

VIII

Грэшны, ашукоўваў. Ды не па сваёй волі. І толькі тых, хто прымушаў да грахоўнага ўчынку. Хоць жылі мы пад наглядам, але не пад няўсыпным, як гэта сцвярджаюць новаспечаныя выкрывальнікі Якая ж гэта зона, калі назіраўцы рук не прымяняюць. Як і дойдзе да чаго, дык толькі ківаюць указальным пальцам уверх.

Такі ківок і вывеў мяне на Бюро друку ЦК ПАРП. Выказаў набалелае, а франтаваты цэкіст углядаецца, усё роўна ўбачыў прыхадня з іншасвету, і кажа:

— Гэта не наша справа, мы вамі не займаемся. Вось як, нават галіновых вяршыцеляў не маем. Дык вяршылі намі чэкісцкія

дылетанты з нацкамісіі, але яны займаліся нашай свядомасцю, наша быццё іх не цікавіла. Да яго абыякава ставілася і такая ж камісія ВК ПАРП. Тут у некаторых засядацеляў праяўляўся і кіраўнічы сверб. На шчасце надзялілі камісію невялікімі паўнамоцтвамі.

Найбольш даймала апаратная прапаганда, патрабавала дэталёвых планаў працы. Гэтыя планы наганялі жах на ўсю рэдакцыю. Мяне ціснулі, і я ціснуў. Ды ніўскія шчалкапёры адмахваліся ад планавання, ведалі, у партыйным органе плануе кіраўніцтва рэдакцыі, і чакалі ад мяне падобнай актыўнасці. У бок суседзяў ківаў і кіраўнік партпрапаганды. Убачыўшы маё планіровачнае ўбоства, раіў павучыцца ў майстроў.

З пераймannем суседскага вопыту, прыйшло і азарэнне: мой клопат знімае вытворчы цыкл — адначасова робім тры нумары, з запасам якраз на месяц. Вось і чарговы план. І які! Разгорнуты, дакладны і — галоўнае — на сто працэнтаў ажыццявімы.

Варта аддаць належнае суседзям. Калі мы апынуліся пад адным дахам, наладзіліся паміж намі і добрасуседскія адносіны. Жылі ў сяброўстве і ўзаемадапамозе.

Пахвалы за планіровачны зрух я не атрымаў. Але абышлося і без папрокаў. Відаць, ніхто маіх планаў не чытаў. Не ведаю нават, ці ў поле зроку партпрапаганды трапіла наша маштабнасць. Такая плата за ашуканства.

Каюся.

IX

Скачок з недаразвітага сацыялізму ў непрадбачаную стадыю грамадскага развіцця падзяліў нас. Нават гадаванцы, якіх за вушы цягнуў у літаратуру, сюд-туд сноўдаюць свінцовымі кухталямі: выкідаў з нашых вершаў перлы, чыніў здзек над талентам!

Начыталіся, сталі мэтрамі. Можна і садануць старога. Скончыўся час канструктыўнай крытыкі.

Ведаю: агрэсія — сімптом новага часу. А калі закон жыцця?! (Не гавару — выжывання). Няўжо вернемся ў спарахнелыя катухі? Урэшце стаў я „беларусам свету”, аб чым і марыў.

І ўсё ж, хоць і абяскрыленае, цепліцца ў душы дзівацкае памкненне да згоды і гармоніі.

* * *

У зоркавай зроены гонцы,
Скаваны інертным вітком,
Мы ўсе спадарожнікі Сонца,

Трасёмся адным чаўнаком.
Парыпвае капсула хілая
На разваротах крутых.
— Куды трасяцеся, мілыя?
— А сам ты трасешся куды?

* * *

Скончыліся пытанні. Каму адказваць? Каму рабіць каментарый? Дзівачыш! Не мазоль нам вачэй. Твая бяда, чыясьці радасць...

...дасць, дасць! — адгукнулася Рэха. Разумныя дружаць, дурныя — сварацца... варацца... арацца... аццa-ца...

© OCR: Камунікат.org, 2015
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2015
© PDF: Камунікат.org, 2015

## Змест


Цуд
Дарога ў Еўропу
Лясное брацтва
Каменны круг
Ноеў каўчэг
Курганы
Сустрэча з князем
Крыштапова
Пушча
Рэпетыцыя і тэатр
Па старым запавеце
Родавае гняздо
Вяшчун
Як Тур забіў Ваўка
Вязучы цёзка
Нашчадак
Княства
Блудная гара
Могілкі
Чорныя дзятлы
Першая споведзь
Казкі
Калыска
Цёмнае нашэсце
Pan Droń
Pani Rusiniakowa
Пачаткі свядомасці
Землятрус
Геаметрыя і падполле Байцы
Рэйкавая вайна
З архіва
Широка страна моя родная
Звычайныя балахоўцы
Краты, пацукі, тхары
Стебень, гребень, рукоятка
Давай, давай!
Прыдурак
Восень, зіма, вясна1
Генерал і „фаршут”
На шлюзе
Займаемся этымалогіяй
Якога князя ўшанавалі?
З чаго смяяліся застаўлянцы
Ну, пачакай, Жоржык!
Шапка Манамаха
Баршчына
Цераспалосіца
Сідараў сон
Адказ Сідару
Карпуша і Мар'я Міхайлаўна
Сіндром Прылажынскага
Калакуста
Падалянскія мянушкі
На падземнай рацэ
Па Пружанскай дарозе
Падаляны — шырокая гуліца
Герцэнаў звон
У Дырэкцыйным парку
На Цэнтуры
Эпіцэнтр зямлі
Дух Пушчы набыў правы
Рэха
Лесавік
Кур'ёзная прафесія
Парасон
Споведзь старога рэдактара
Фотахроніка